Ба 170 053

Ба 170 053

СКРЫПАН

СУСТРЭЧЫ

ДВЬ·ЛІМ

65

Ба 170 053

Я. СКРЫГАН

СУСТРЭЧЫ

Ба, 170 053
154
39116
Бел. аддзел 1994 г.
№ 359263
19 31/X 35 р.

ДЗЯРЖАЎНАЕ ВЫДАВЕЦТВА БЕЛАРУСІ
МЕНСК ЛіМ 1935

Дзяржаўная бібліятэка БССР імя У. І. Леніна

10. 12. 2009

ПАКІНЕМ СПАДЧЫНУ МЫ ДЛЯ ПАТОМКАЎ,
ІНАКШУЮ АД ТЭЙ,
ШТО ЎЗЯЛІ МЫ АД ПРОДКАЎ НА АБЛОМКАХ
ГІСТОРЫІ СВАЕЙ.

ЯНКА КУПАЛА

Бібліотека

Гордасць

На вакзальнай плошчы, у трамваі, поблізу мяне сеў чалавек. На сябе ён звярнуў увагу тым, што выдаваў у сабе новага ў Менску чалавека: Ён агледзеў вагон, нешта заўважыў пра здымкі чэлюскінцаў і самаздаволена ўсміхнуўся. Пасля пачаў узірацца на вуліцу. Штораз ён усё больш пільней углядаўся ў яе, паварочваючыся то ў адно, то ў другое акно.

— Царква. Значыць, мы едзем па Захараўскай вуліцы.

— Па Совецкай,—паправіў сусед, флегматычны дзядуля.

— І не царква, а клуб. Чыгуначны клуб,—растлумачыла дзяўчынка, прабіваючыся наперад.

— Клуб?—перапытаў чалавек, і не паспеў яшчэ чагосьці сказаць, як забыўся, бо насустрач імчалася вуліца, адкрываючы новыя відовішчы для незнаёмага чалавека.

— А гэта? Што за будыніна? Як харкаўскі Дом прамысловасці.

— Дом урада,—горда адказала дзяўчынка, стоячы ўжо на пляцоўцы.

Чалавек яшчэ з большаю цікавасцю пачаў аглядаць яго.

Паплыла шырокая асфальтовая плошча Леніна. Наўкруга яе падымаліся лёгкія, узнёслыя сцены з выступамі, з балконамі, з безлічам акон. На вышыні ўсіх яго дзесяці паверхаў пуката вырысоўваўся іспалінскі герб Рэспублікі. Пасярод плошчы высіўся бронзавы Ленін, гаворачы з трыбуны прамову чырвонаармейцам перад адпраўкаю на белапольскі фронт. У нагах яго гарэлі жывыя кветкі. Глянцаваўся і пабліскваў чорны граніт пастамента. Трамвай імчаўся. Плыў дом, паварочваючыся сваімі тонкімі краямі. І калі схаваліся апошнія яго стромыя ўзлёты, чалавек азірнуўся на другі бок вуліцы. Краем толькі ўспелі астацца ў яго зроку контуры універсітэцкага гарадка, разграфлёныя пляцоўкі газонаў і рады тонканогіх, маладых яшчэ дрэваў. Лініі дзівотлівых перасячэнняў алей спляталіся, як павуцінне. У абрысах празрыстых крон настойвалася сінь будучага парку.

Па вуліцы ішлі пешаходы. Пераклікаючыся сігналамі, скрыжоўваліся і абганялі адна адну машыны, нячутна слізгаючы па брусчатцы. На скрыжаваннях вуліц трамвай працяжна звінеў і, праскочыўшы натаўпы, зноў імчаўся пабольшаным ходам. Чалавек прыглядаўся да людзей, да будын-

каў, хапаючыся за кожную драбніцу, якая пападалася яму на вочы. Ён губляўся. Здавалася, ён баяўся, каб нічога не прапусціць.

— Я мала чаго пазнаю,—загаварыў ён усхвалёвана.—Я не быў тут з чатырнаццатага года, калі мабілізавалі на імперыялістычную вайну. Што-ж гэта зноў такое, з аднаго бадай шкла? Інстытут, мабыць?

Я з цікаўствам глядзеў на чалавека. Мне падумалася: якая, мабыць, гэта хвалюючая рэч— вярнуцца на радзіму, убачыць яе зусім новаю і толькі па якіх-небудзь рэштках пазнаваць яе.

— Чырвоны касцёл. Гэта я памятаю. А ў гэтым будынку была гасцініца „Бельгія".

Дзяўчынкі ўжо не было, а сусед яго не выказваў вялікае ахвоты задавольваць чужога цікаўства. Ён мармытнуў нешта сабе пад нос і пачаў працірацъ пенсне. Другія таксама адказвалі выпадкова, скупа, і мяне пачынала хваляваць тое, што чалавек астаецца ў няведанні.—Чаму яны так мала гавораць яму?—думалася мне.—Чаму не ганарацца? От ён-жа і не ведае, што няма ў нас чырвонага касцёла, а ёсць Польскі дзяржаўны тэатр. Што гэты новы будынак у завулку не інстытут, а фабрыка-кухня. Што гасцініцы „Бельгіі" няма—ён памыліўся. „Бельгія" прапала. На гэтым месцы ён бачыў Дом урада і шырока парасціланыя дываны кветак. Нельга-ж, каб ён гэтага не ведаў!

У трамваі рабілася цесна. На Комсамольскай вуліцы сышоў дзядуля і я перасеў на яго месца.

Чалавек сядзеў супроць мяне. Я толькі цяпер добра ўбачыў яго твар. Твар быў немалады, абвеяны вятрамі ўсіх рэспублік Саюза і гадамі вялікага ў іх жыцця, а вочы былі зусім юнацкія— чыстыя, гаручыя, з нейкаю празрыстаю глыбінёю. Ён пільна ўглядаўся на будынак, праз дзверы якога рушліва праходзілі цэлыя натаўпы і шырозныя вітрыны якога гарэлі безлічам розных рэчаў і фарб.

— Гум,—гаварыў я, калі скрануўся трамвай і выводжу чалавека з задумення.

Мы разгаварыліся. Трамвай ішоў, пазвоньваючы на перакрыжаваннях, на кожным прыпынку мяняючы сваіх пасажыраў. Я даўно прамінуў свой прыпынак. Я гаварыў з чалавекам, каторы хадзіў цяпер слядамі дзяцінства. Бываюць харошыя сны, каторых шкадуеш, што яны не асталіся рэальнасцю. Чалавек бачыў сон, каторы быў рэальны. Дзяцінства рабілася сном. Ён бачыў горад, каторага не было ў яго памяці. Я дапаўняў гэтую памяць гісторыяй яго стварэння. Гэтая гісторыя праходзіла бойкамі, Кастрычніцкім пераваротам, карцёжнаю гульнёю ў юбілейным доміку і п'яным гандлем Беларуссю міністраў БНР, белапольскай акупацыяй, булак-балахоўскімі бандамі, разбурэннем, падпаламі, падпольнай работай большэвікоў, аднаўленнем і—новым гіганцкім тварэннем. І чалавек пачынаў пазнаваць тое, што бачыў—як сваю біяграфію, бо гэта быў шлях і яго дваццацігоддзя. Міналіся прыпынкі, кварталы, паркі. На вулі-

цах дыміўся свежы асфальт і клаліся шахматныя ўзоры брусчаткі. Брукар любоўна прыганяў камень да каменя і падняўся з кален, каб прапусціць наш трамвай. За скверам высілася рыштаванне дома Чырвонай арміі. У перспектывах вуліц над дахамі падымаліся надбудовы. Лакіраванымі бакамі пабліскваліі легкавыя аўтамабілі, паварочваючы па Карла-Марксавай вуліцы к будынку ЦК. У скверы ападала пажоўклае кляновае лісце і яно пахла празрыстымі пахамі восені.

— Мой брат на восем гадоў маладзей за мяне,— загаварыў чалавек.—Ён цяпер у Калхідзе, у геалагічнай экспедыцыі Акадэміі навук. Нас было двое. Ён быў пакінуты сам на сябе, калі мяне забралі на вайну. Быў беспрытульнікам, злодзеем, хуліганам. Ён не быў тут таксама з дзяцінства. Ён напісаў мне ліст, просячы, каб я расказаў, што тут робіцца. Мы жылі на Ляхаўцы. У такой вось малюсенькай, згорбленай хатцы. Я хачу паглядзець яе.

На Ляхаўцы мы ішлі новым горадам. Чалавек зноў хваляваўся. Тут недзе быў кавалак яго жыцця, аддзеленага дваццацігоддзем. Мабыць заўсёды хвалюецца чалавек, калі яго кранаюцца пахі дзяцінства? Але мы бачылі горад заводаў, галерэі шклом крытых цэхаў і кварталы рабочых пасёлкаў. Мы бачылі карпусы новых фабрык, каторых не мог называць нават я; хадзілі вуліцамі, на якіх я сам быў упершыню. Мы шукалі старое хацінкі на Ляхаўцы, але не знайшлі гэтае вуліцы, і стары ра-

бочы паказаў нам месца, на якім стаяў механічны цэх Варашылаўца.

— Вось тут. Я таксама жыў у ёй у дзевятнаццатым годзе. А цяпер тут працую. А жыву ў Комунараўскім гарадку.

— Я напішу яму, што знайшоў нашу хацінку,— тушачы ў голасе хваляванне, сказаў чалавек.— Я напішу, каб ён прыехаў паглядзець яе сам.

Тады я зрабіўся дакучлівым. Я захацеў паказаць яму ўвесь горад, каб тут нічога не асталося яму невядомым.

Мы пачалі тады мяняць маршрут за маршрутам, раён за раёнам, выязджаючы на самыя далёкія ўскраіны. Я паказаў яму тэхнікумы, клінікі, інтэрнаты, паркі. Я паказаў стадыёны, гасцініцы, клубы. Я паказаў фабрыкі, камбінаты, панарамы ператвораных кварталаў і пляцоўкі свежых фундаментаў. Мы бачылі, як падымаліся сцены Комвуза, Акадэміі навук, Дома друку, спецыялістаў, і самі дарысоўвалі іх праекцыю. Мы чулі гудкі заводаў усяе сталіцы, калі работу займала другая змена. Трамваі поўніліся людзьмі. Вуліцы гулі і кіпелі чалавечымі натаўпамі. На шчытах рэклам гарэлі транспаранты тэатральных сезонаў. Я паказваў афішы Тэатра оперы і балета, з гонарам пералічваючы лік яго пастановак. Я гаварыў пра кіно, кансерваторыю і пра будучы будынак Вялікага дзяржаўнага тэатра, які падымецца вышэй над усімі будынкамі Менска. Ён будзе стаяць—стройны, узнёслы—на высокай плошчы Парыжскай комуны—гордасць нашай ста-

ліцы. Унізе плешчацца і паблісквае Свіслач. Паўз бераг дыміцца зялёны, разложысты парк і, перасекшы Совецкую вуліцу, зліваецца з паркам „Профінтэрн“. Па гранітным узбярэжжы рушаць аўтамабілі, і натаўпы маладзежу па каменных ступеньках спускаюцца на водную станцыю. Па рэчцы слізгаюць байдаркі, маторныя лодкі. Гонкі. Катанне. Спаборніцтва воднага спорту, звонкі смех і іскрыста белыя зубы на смуглым, загарэлым да бронзы, твары дзяўчыны. Недзе за паваротамі рэчкі чуцён сігнал парахода. Ён праходзіць, успеньваючы ваду—грузны, затомлены—несучы ў сабе дыханне Вялікага Дняпра...

Мы стаімо на плошчы Парыжскай комуны. Яна высіцца пад намі, як купал. Адсюль нам відаць контуры горада. Горад праходзіць зубчастымі лініямі ў перспектыве. Над ім сцелецца тонкая, празрыстая сінь і абрысы далёкіх дамоў зліваюцца ў сіні паветраным гарызонтам.

— Я напішу яму,—гаворыць чалавек, усё яшчэ носячы ў сабе хваляванне.—Я раскажу.

Ён пацісну́ў з удзячнасцю мне руку. Я таксама падзякаваў.

— За што-ж?—запытаўся ён.

Я ўсміхнуўся. Хіба мог я сказаць, што я стаў патрыётам, што я быў горды самаю большаю гордасцю—правам паказваць усё гэта, як сваю радасць.

Менск.
Лістапад, 1934.

Каця Лапянкова

I

Ён прыгнуўся каля яе—разам з ёю— над апокамі, над ланцэткамі—над чорнаю фармовачнаю зямлёю. Ён блізка прысеў каля яе, і гэта здаецца лірыкаю. У іх мабыць нейкая цёплая інтымная гаворка—дружба. І яму мабыць нялоўка за сваю гэту няўчасную дружбу. Узяўшы ад Каці ланцэтку, ён водзіць ёю па зямлі.

— Не цяжка?

— Не. Гэта як мне былі далі буйныя дэталі, дык тады цяжкавата было. Зафармуеш, бывала, а апоку ледзьве павернеш. А гэта—нічога.

— А з бракам як?

— А з бракам горш,—Каця гаворыць не перарываючы работы. Яна бярэ ў Белазерскага ланцэтку і згладжвае крайкі злежанае зямлі, адкуль толькі што выняла мадэлі.—З бракам горш. Я ўжо была дайшла да таго, што ні давала бадай што нічога, а гэта—зноў падымаецца.

— Дык чаму-ж гэта?

— А гэта таму, што ў мяне цяпер вучні. Вось бачыш?—яна паказвае на шар апокаў, што канцамі ўпіраюцца ў сцену,—гэта работа прымацованых да мяне вучняў. Ну, у іх і брак пападаецца. А раз гэта вучні мае—то і брак ідзе на мяне.

Белазерскі натрошкі маўчыць. Ён глядзіць перш на Кацю, адале апускае вочы і, нешта пра сябе думаючы, сунімаецца на Каціных руках. Рукі доўга абхарошваюць земляную мадэль і толькі тады, калі канчаюць яны сваю работу, Белазерскі перарывае думку.

— А як з Мурашоваю?—гаворыць ён зноў і пальцы шукаюць, каб чым-небудзь заняцца.

— І тут няважна. Я яе выклікала на сорак адну апоку. Ну і зрабіла-б сама лёгка. От глядзі: да двух гадзін я зафармавала трыццаць шэсць апокаў, а на больш—не хапае рам. І гэтыя па ўсяму цэху збірала.—Дастаючы памачок, Каця прыгнулася так, што ледзь не націснула на апоку. Асцярожна падымаючыся, каб не зачапіць фармоўкі, яна знячэўку пахіснулася на Белазерскага. Белазерскі падтрымаў малюсенькім дотыкам, і можа ад гэтага ёй захацелася паправіць хустку, прыбраўшы са шчакі невялічкую плойку валасоў. Натрошкі Белазерскаму відзён быў яе профіль—тонкі, сур'ёзны—і тою-ж сур'ёзнасцю астаўся знячэўку кінуты ад нялоўкасці погляд. Але яна зноў нагнулася над работаю і зноў загаварыла так, як-бы не пе-

рарывала гаворкі.—Ад гэтага сёння і ўмовы не выканаю. Але от я перайшла на іншыя дэталі: не там, дык тут, а вазьму. Толькі нядобра, што даводзіцца так раскідацца...

Белазерскі яшчэ доўга астаецца нагнутым каля Каці. Гэта здаецца лірыкаю. Але гэта—самая простая чалавечая чуласць і цяплынь. Каця—лепшая ўдарніца па фармоўцы ў ліцейным. І не зайздрасць, не кпіны абкружаюць Кацю. Яе абкружае чалавечая чуласць. Вось ён, Белазерскі, сакратар партячэйкі, угледзеў у канторцы ў Аграната, што ў Кацінай графе падымаецца брак. І нават у часе работы не сцярпеў, каб не прыйсці і не даведацца, што ў гэтым прычынаю. Можа што перашкаджае, можа памагчы трэба?

— ... Апокі?

— Ну пэўна. Здавалася-б,—дробязь. А дзе от іх возьмеш? Бегай па ўсяму цэху, шукай. І няма. А тады і спаборніцтва як след не ўлічыш... Давялося перайсці на іншыя дэталі.

— Дзівачка. То ты-ж бы прышла дый сказала. Памаглі-б. Ато што-ж, аднаму, бывае, і не асіліш няўпраўкі. Тое самае і з вучнямі. Чый брак, таму трэба і запісваць. Кожны за сваё павінен адказваць. Ато што-ж—абязлічка? От бачыш! А ты і не скажаш... Дзівачка...

Каці добра адчуваць такую харошую беражлівасць. Ад гэтага хочацца нешта сказаць, але словы не выходзяць і, ад нялоўкасці, мелькам зірнуўшы на Белазерскага, яна папраўляе на шчаках

хустку, як-бы там зноў выпалі няпрошаныя плойкі валасоў. Нагнуўшыся зноў, яна ўжо не бачыць, як устаючы, Белазерскі сабраў увесь параскіданы ёю ў рабоце інструмент і паклаў каля яе напашэве.

II

На біржы далі пісульку. На заводзе з пісулькаю паслалі ў цэх, сказаўшы да каго звярнуцца. У канторцы Каця застала нейкіх людзей. Людзі талкавалі, спрачаліся, пальцамі паказваючы ў спісаны аркуш паперы. Каця запомніла, што гаварылі пра чыгун і пра лічбы. І яшчэ запомніла: непадатліва спрачаўся невялікі, з шырокім тварам чалавек, гаворачы цяжка, як не ўмеючы і то насоўваючы, то назад адкідаючы шапку. Пасля яна дазналася, што гэта быў начальнік цэха. Калі вышлі мужчыны, Агранат заўважыў яе.

— А ты-ж чаго хочаш, дачушка?

Каця паказала пісульку.

Прачытаўшы, Агранат зірнуў на Кацю і адтаго, што ён рыўком адкінуў назад шапку, Каці запомнілася белая незагарэлая паласа ілба.

— Ну, і малайчына... Нідзе не працавала да гэтага?—запытаўся Агранат, гаворачы па-свойску, так, як-бы ён даўно ведаў Кацю.

— У Брылеўскім калгасе.

— Не—на вытворчасці?

— Я працавала ў пральні... бялізну мыла,—па-

правілася Каця і, не ведаючы, ці так адказала, зашчыпала пальцамі стол.

— А так, на заводзе—не?

— Не.

— Ну, нічога, навучымся. Хадзем-жа, я цябе і завяду,—і ён зноў неяк па-свойску ўзяў за плячо.

Цэх Каці здаўся страшным. Фармоўка. Ніколі не бачыла. На ўсю залу—чорная пухкая зямля. Па зямлі шныпарацца людзі, поўзаюць, набіваюць ёю нейкія формы. І можа ад зямлі—і цэх, і формы, і людзі здаліся чорнымі. І над усім—маўклівая глухая работа. Мелькам яна заўважыла, як, нізка прыгнуўшыся над формаю, нейкі чалавек абхарошваў земляную дэталь. Якая вялікая патрэбна асцярога ды ўвага! Яна ніколі не навучыцца такой тонкай рабоце. Можа адмовіцца ды пайсці дахаты?

— Мы вас прымацуем да харошага хлопца... Навучыць, нічога,—як-бы дагадваючыся пра Каціну думку, гаворыць Агранат.

— Малеў!—абзывае ён яшчэ здалёк.—Вось табе памочніца. Навучай і не давай нудзіцца.

Каця таксама нагінаецца і глядзіць за Малеваю работаю. У чыгуннай раме шчыльна набіта зямля. Малеў здымае з рамы цяжкую накрыўку і ў зямлі відно, як ляжаць металёвыя мадэлі. Каця не ведае, навошта і як гэта робіцца. Адкуль тут пачатак? Але Малеў таксама як-бы разгадвае Каціны думкі, і тлумачыць:

— Гэта робіцца так... Цяпер трэба асцярожна павымаць мадэлі, і ў зямлі паастаюцца формы.

Уся гэта рама з зямлёю—апока. Наверх накладзецца такая самая апока з формамі, але так, каб кожная палавіна формы супала. З боку вось—вушкі. Наклаўшы, трэба моцна заклінаваць вушкі, чокамі—зачыкаваць. Клінаваць асцярожна, каб не здрыганулася зямля. Зверху вось робіцца дзірка—літнік. Яна пападае ў пустое месца—у формы, і праз яе заліваецьмецца чыгун. Чыгун у сярэдзіне апокі разліецца па формах, застыне, а калі яе пасля разняць, дык на месцы формаў будзе вось такая-ж дэталь, як гэтая мадэль.

Чутачку пабіваючы, Малеў асцярожна вінтом дастае мадэль з зямлі. Адну, другую... і ў роўнай раме апокі астаюцца формы. Пасля беражкі ён папраўляе маленькімі жалезнымі лапатачкамі. І там, дзе беражкі парушылі сваю шчыльнасць—змочвае вадою.

— От так вымаючы, бывае, што зямля дзе-небудзь падымецца або распіхнецца. Тады яе трэба паправіць вось гэтаю ланцэткаю ці кручком. А каб зямля была тужэй, дык яна змочваецца памачком,—тады яна не так абсыпаецца.

— А навошта парашок?—пытаецца Каця, гледзячы, як увесь верх апокі пасыпаны белым мучнаватым пылам.

— Гэта лікаподзі. Парашок такі—праўда. Ад яго тужэцьме зямля і калі накласці верхнюю форму, дык зямля верхняе апокі не прыставацьме да ніжняе. А яшчэ і тое, што калі будзе заліваецца чыгун, дык лікаподзі выгарацьме, даючы магчымасць выходзіць чыгуннай пары.

Каці здалося, што яна ніколі не асіліць гэтага. Вырабіць з зямлі дэталь такою, каб у яе пасля заліваць чыгун? Гладзіць, абрэзваць, баючыся, каб не скранулася з месца ніводная драбніца? Ведаць, што для чаго? Не, у яе ніколі не зложацца рукі, каб так смела, як воскам, валодаць зямлёю, адрэзваючы і прыкладаючы яе скібкамі.

Але праз пару дзён падыходзіць брыгадзір, Пераплётчык. Ён нагінаецца і глядзіць, як нясмела ходзяць Каціны рукі. Яны баяцца, каб не разбурылася ад неасцярожнага дотыку зямля. І інструменты неяк не слухаюцца: выпадаюць, чапляюцца за кожны замятак. Яна ніяк не можа добра абрэзаць лішняга бугарка, што, як накепства, аціснуўся ў форму. Пераплётчык памагае і кажа, што вельмі добра. За такі невялікі час і такая складнасць. Дзе-ж складнасць, калі яна, катора пара, як марудзіць над адною дэталлю. Але ўсё-ж падымаецца ахвота. Каця раптам верыць Пераплётчыку, што можа яна і папраўдзе сама сябе занадта гудзіць? Пераплётчык пайшоў, і ў Каці смялей захадзіла ланцэтка. Не, праўда—яна-такі моцна трымаецца, гэта зямля!.. А яшчэ праз дзень Каця спяшалася, ледзь не бегла дахаты,—ёй далі самастойную работу і за дзень яна зрабіла шаснаццаць апокаў. Хацелася хутчэй расказаць дома, што яна ўжо сапраўдная фармоўшчыца. І якою доўгаю зрабілася тады вуліца Сцеклова—ніяк не дабегчы дахаты.

III

Аднойчы ў Каці разбалелася галава. З дому яшчэ, ідучы на работу, яна была цяжкаю і шумела, як жорна. У гэты дзень не спорылася работа. Рукі хадзілі вяла, ападалі і, здавалася, як ніколі, не слухаўся інструмент. На перапынку Каця не выйшла, як заўсёды, з дзяўчатамі на двор. Асталася ў цэху каля свае апокі. Не хацелася, каб бачылі яе непатрэбнае вяласці.

Суседка па рабоце, Мурашова, заўважыла і падышла.

— Замарылася, мабыць?

— Не, так проста, нездаровіцца.

— Дзіва што. Бо дурная.

— Чаму?

— Так робячы, як ты, і ногі выцягнеш.

— А, не—гэта не ад работы. Проста так сабе.

— Так, ды не так. Што, я не бачу? Я гляджу за табою: вельмі-ж ты ўжо прыткая. Бярэш, як агнём гарыш. А так доўга не пацягнеш. Ужо от „нездаровіцца", а што-ж, калі гады колькі так?

— Ай, кінь ты,—Каця зашпіліла рукаў і, як-бы не пра гэта думаючы, пагладзіла лоб.

— Дурная. Быдта я яе ад чаго адгаворваю. Я толькі кажу, што няма куды гнацца. Век вялік—напрацуешся яшчэ. А мне проста шкода, што ты не шануеш сябе.

— Як-жа гэта шанаваць? Працую як усе, і толькі. І не думай, што я цягну над сілу.

Дзяржаўная бібліятэка БССР імя У. І. Леніна

Каця зноў пагладзіла лоб. Мурашова паглядзела на яе і ўпершыню заўважыла: каля губ у яе закруглілася танюсенькая маршчынка.

— Узяла-б бюлетэнь.

— Ды я не хворая, кінь ты.

Суседка памаўчала. На локаць прылегла і завадзіла пальцам па доле. Адале загаварыла, ужо далонню згладжваючы ямкі.

— Усёроўна ў нас аднакія дэталі: давай разам рабіцьмам—і табе і мне лягчэй будзе.

— Давай,—згадзілася Каця.

З гэтага дня Мурашова завязала дружбу. На рабоце неўзаметку расказвала пра сябе. На перапынках далёка заводзіла ў сад і, качаючыся ў траве, выцягвалася на сонцы поўнымі грудзьмі.

— Хлопцы любяць цябе?—і, не чакаючы адказу, сама гаварыла.—Мяне—любяць. А ведаеш, Каця, ты ўсё—адна... Давай увечары паедзем на Мельнікаў луг. Любата! Пакупаемся. На лодцы паездзім... Будуць хлопцы—далёка ў лес зойдзем, знаеш?—туды на той край. Трава якая—схавацца можна. Глушэча... Давай!

І разам з дружбаю Каця заўважыла, што ў яе пачаў падымацца брак. Яна не можа даўмецца, адкуль-жа бярэцца гэты брак, калі з кожным днём яна ўсё больш лоўчыцца? Пераплётчык пытаецца, чаму гэта, але хіба-ж яна ведае?

— Сама не ведаю. Здаецца, раблю так, як і заўсёды. Нават яшчэ больш прыглядаюся і от... не ведаю...

Нават брыдка перад іншымі стала ў брыгадзе. Нават дахаты прыходзіла моўчкі і было нядобра, калі распытвалі, чаго прысмірэла.

А Бабічаў наважыў арганізаваць жаночую брыгаду. Узяў Кацю. Суседкаю стала Ладыгіна. З новаю дэталлю асвойталася хутка. Ладыгіна не дакучала дружбаю і ўся брыгада ўзялася за работу дружна, так, каб не адстаць ад мужчын. Бабічаў падыйдзе, пагаворыць, запытаецца:

— Ну як?

— Не паддаёмся.

— Гэта добра, але за бракам трэба глядзець. Па брыгадзе яшчэ дзевяць процантаў. Гэта многа. Хаця-б да двух зменшыць, каб даць нават на процант і менш таго, што палагаецца.

Падышоўшы да Каці, Бабічаў прысядае і, ведаючы, што Каця засаромяецца, гаворыць так, каб не чулі другія.

— А ты малайчына. У цябе ўжо толькі адзін процант.

— А чаму-ж з Мураш... —хоча запытацца Каця, але абрываецца, і па нахмураным ілбе відно, што нешта ўспамінае. Так, ёй-жа расказалі. Яна і сама пра гэта была дагадвалася.

— Нічога ...

Паводле нормы ТНБ, на дзень трэба даць дваццаць восем апокаў. У кожнай апоцы чатыры дэталі. Сто дванаццаць шасцёрак. Каця даўно перакрочыла норму. Брак дайшоў да нуля. Цяпер

Каця ўжо дазналася, што тады Мурашова запісвала свой брак на яе, і—выклікала Мурашову на сорак адну апоку.

IV

Уночы ішоў дождж, але яшчэ зрання паказвала на добрую пагоду і цяпер дапякае сонца. Ад гэтага асталася здаровая свежасць. Пыл змыўся, прыбіўся, і заводскі двор выглядае як-бы большым, чысцейшым, прыбраным. Наводшыбе, вымытым зяленівам, здаецца, нават памаладзеў сад. Ад саду, ад зяленіва нясе свежасцю, пахам, падмяняючы прывычную металёвую сінь і вагранкавы гар. Сонца падае ў свежасць здаровым прыпёкам, ад зямлі падымаецца сытая вільгаць—і добра ўбіраць у сябе гэтую сытасць грудзьмі.

На перапынку рабочыя выходзяць на двор.

— Любата! От каб цяпер на Сож ды на Мельнікаў луг.

— Ыч, чаго захацеў. А вечар тады дзе дзенеш?

— І вечару даў-бы спосаб. Угга!

— Ды відаць, што ты выцягнуў-бы... Дай сесці.

Галалобы хлапчына, выпучыўшы грудзі, фізкультурным гэстам тузануў разы пару ўгору рукамі і, даючы месца, пасунуўся на дысцы. Насупраць папрымошчваліся на парожныя тары. Расшпільваючы грудзіну, нехта ўлёгся на дылі. Выходзячы з цэха, нейчы голас адчайна рвануў „гоп са смыкам“, але сарваўся, і на яго месца лінуўся ахапак

дружнага смеху. Выпіхаючы спевака „гоп са смы кам“, выскачылі дзяўчата.

— Ыч, якая рэзвая мая каманда,—сядаючы на спарожненае месца, жартуе Бабічаў.—Папробуй, займіся з імі.

— Я-то бачу, што Бабічаў і сам нешта за апошнія часы падпрастаўся. Аж яны мабыць і яго цугуюць!

— Але, аж памаладзеў, проста свеціцца—во што значыць жаночы начальнік.

— Дык ад таго-ж і промфінплан нешта стаў падгаджваць. Пераплётчык пераганяе, — абзываецца голас з тары.

— Хто гэта? Голубеў? Э, браце, ты хаця мяне дагані, махаючы рукою і жмурачыся ад сонца, гаворыць Бабічаў.—Пераплётчык пераганяе, гэта верна. Але-ж ён пераганяе не таму, што я спушчаюся ўніз, а што стаю на месцы, не ўцякаю. А ўцячы думаю, але вось...

— Верна!

— ...але вось ты чаму так астаўся?

— І я пераганю. Вось укамплектую як след брыгаду—і пераганю!

— Во! А то хіцёр—забраў ад мяне самых лепшых работнікаў і цяпер смяецца. Ну вот: Зайцава ў цябе, Ладыгіна ў цябе, Лапянкова ў цябе—ды я з гэтакімі работнікамі горы варочаў!

— І Голубеў варочае. Насыпле каля сябе кучу, дый варочае ў апоку.

— Ну вот, з гэтакімі работнікамі і я гавару

смела. Цяпер пацягаемся, кажу,—не паддаецца Голубеў.

— І я пацягаюся—глядзі як добра: у самую грудзіну сонца пячэ,—пацвельвае голас з дылі.— Ляжу і пацягаюся, во...

— Дальбо шкода,—памаўчаўшы, зноў гаворыць Бабічаў.—Аддаў людзей на чужы прарыў, дык цяпер яму добра і жартаваць,—ён чухае патыліцу, і сажмураны твар дабрадушна ўсміхаецца.—Але пачакай: вот натранірую новую сваю каманду, тады—усё сцеражыся! Жанкі, брат, народ заўзяты.

— А памятаеш ты, як з мяне падцвельваў?— падыходзіць Пераплётчык. Але, павярнуўшыся, ён гаворыць да ўсіх:—Заключылі спаборніцтва. У мяне маладая брыгада. Бяром-бяром, налягаем-налягаем і—хоць ты зарэжся: ні тпру, ні но. Я і сам бегаю, памагаю, а ён падыходзіць з Агранатам, растапырвае ногі, дый рагоча. У мяне ўжо, кажа, за дзевяноста восем. Вот, думаю, назола, чым-жа ён хваліцца, калі ўмова на сто з гакам? Дай лапу, кажу! На-а, кажа, і ўсё смяецца. Умова, кажу на сто з гакам? З гакам. Ну, дык, кажу, я ручаюся, што і гак вазьму... Ну, от і ўзяў. Сто дваццаць ёсць.

— Малы гак, малы.

— Разгон не важны,—жартуюць мужчыны.

— Ну, гэта-ж не канец—возьмем і болей.

Завод адпачывае перапынкам. Сціхла гамонка жалеза, ажывілася гамонка людзей. Ад механічнага цэха чутны нейкіх спрэчкі і рогат. Каля ліцейнага

сабралася кучка прачытаць на дошцы вывешаныя лічбы выкананняў. Сіняю кашуляю па дварэ прабег інжынер Фельдман... Уночы быў дождж. Двор ад прыбітага пылу здаецца прыбраным. Наводшыбе вымытым зяленівам молада шэпчацца сад. Ад саду, ад зяленіва разносяцца свежыя пахі. Сонца падае ў свежасць здаровым прыпёкам, сытую прагнасць выдыхае зямля.

— Любата!

— Што ты ўсё з любатою! Не месцішся?

— Эх-бы на Сож ды на Мельнікаў луг!

— Во ўдарыла хлопца.

— Забрала.

— Ну і сволачы!—умешваецца раптам новы голас.—Што яны робяць з Кітаем?—Седзячы наводшыбе, чалавек у руках трымае газету.—Катора пара, як таўкуцца. Ангельцы, японцы—усялякая ненасытная дрэнь. Глядзі от,—ён аддае газету другому,—зноў пачалі напіраць на чырвоных.

— Але-е. Там заварыла здорава. Ды хто каго возьме?

— Во-озьме. Па-мойму, каб я быў за Сталіна—яй-бо не ўцерпеў-бы, а ўмяшаўся-б.

— Во прыткі.

— Не думаючы?

— Не думаючы!

— А каб падумаў, то і разважаў-бы іначай. І памагаць трэба ўмець. На кожны час і свая тактыка і свая дапамога. Думаеш, абавязкова трэба рынуцца са стрэльбаю?

— Не ўцерпеў-бы, яй-бо,—на сваё напірае хлопец.

Паўз цэх дваром прайшлі дзяўчаты. З саду нехта зацягнуў пра душыстую кветку прэрый, чутую ў тэатры з „Роз-Мары“. Чалавек з дылі падняўся на локаць і, угледзеўшы дзяўчат, крычыць:

— Лапянкова! Ладыгіна!

— Чаго ты?—сунімаюцца тыя.

— Чаго вы там швэндаецеся—у нас тут адны мужчыны.

— А нам што?

— Хадзіце сюды—весялей будзе!

— Абыдзецеся і без нас... Няма часу,—і, пакінуўшы росплескі смеху, пабеглі накас двара, хаваючыся за карпусамі.

— Вось твая і тактыка. Трэ' было проста са стрэльбаю...

— Ыч, чарцянё. Вырадак,—круцячы галавою, гаворыць Бабічаў. Ён яшчэ глядзеў ім услед і не слухаў хлапечых жартаў.

— Бабічаў улюбіўся ў Лапянкову, дапраўды.

— Не кажы ты, Пераплётчык. Не магу падараваць, што давялося аддаць яе Голубеву. Гэта-ж быў мой гонар. Ты разумееш, да таго дайшла, што ўвесь апошні час—ніводнага процанта браку. Ну і работа—самі-ж ведаеце—як агнём. Усё ТНБ перавярнула дагары нагамі. Усе, бывала, нават, што лічыліся і лепшымі, дык гэта хаця-б да двац-

цацёх васьмёх дацягнуць—выцягнуць норму. Ато—дваццаць дзве—дваццаць чатыры. А яна—сорак адну апоку шпурнула... Я ўжо яе і вырадкам назваў.

— І ўсё гэта таму, што ў тваёй брыгадзе. Я-ж кажу: ты камандзір удалы,—не пакідае жартаў нехта.

— Няхай сабе і няўдалы, але я адразу быў падмеціў, што з яе будзе толк. Памятаеш, як размяркоўвалі карткі ўдарнікаў? У яе было тады яшчэ восем процантаў браку. Дай, думаю, я і Кацю пастаўлю. Тады-ж мы спрачаліся. Казалі—не варт, не падыходзіць. Але я знаў, што апраўдае—па рабоце бачыў, што возьме. І от глядзі ты—разгадаў. Скрозь не здаецца. З таго часу катора пара, і кожны раз стаіць наперадзе. Ды што мне казаць—самі-ж на канферэнцыі ліцейнікаў першую прэмію выдавалі.

— Дый самое не пазнаць,—памаўчаўшы, зноў гаворыць Бабічаў.—Бывала, як толькі яшчэ прышла яна ў цэх, дык такая пужлівая, баязлівая—вечна маўчыць, нават слова не выцягнеш. А гэта, глядзі ты—комсамолкаю стала, колькі ўсялякае грамадскае работы варочае... Не, дальбо, я шкадую, што аддаць давялося.

Бабічаў дастае закурыць, але гудок на работу, і ён падымаецца з дыскі. У цэх густа шугнулі рабочыя—цесна прайсці. Даганяючы ззаду, яшчэ раз чуцён той самы голас, крычучы: „Любата!“ З разгону ўдарыўшыся аб некага, Каця аддаецца

ан Бабічава і, яшчэ не патушыўшы прынесенае аднекуль усмешкі, пытаецца:

— Не выцела?

— Ого, яшчэ і як,—і, сплюшчыўшы вочы, Бабічаў таксама смяецца ўсімі маршчынамі свайго безвалосага жаночага твара.

Менск.
Студзень, 1932.

ЕСЛИ В МИРЕ СУЩЕСТВУЕТ НЕЧТО ПОИСТИНЕ СВЯЩЕННОЕ И ВЕЛИКОЕ ТАК ЭТО ТОЛЬКО НЕПРЕРЫВНО РАСТУЩИЙ ЧЕЛОВЕК.

М. ГОРЬКИЙ.

Па дарозе

I

— Не-не,—гаворыць яна,—угледзяць людзі, суседзі, ды нагавораць чорт ведае чаго. Скажуць, што нават прыняць не ўмела. Каторы год як не бачыла брата, а гэта зайшоў па дарозе, дык нават падвезці не парупілася. Я ўжо цябе хоць за сяло правязу, а там—калі ты так хочаш пехатой ісці—дык ідзі.

Яна запрэгла кабылу. Яна не хоча пусціць мяне аднаго з сяла.

Едзем.

Восеньскі ветраны дзень. Палеткі, выгінаючыся па ўзгорках, упіраюцца ў сінь, у лясы, у сёлы. Шэрымі, галоднымі ляжаць яны. У іржэўнік парванымі, патузанымі ніткамі паўпляталася павуцінне. Адзінока па загонах скрыгоча каменнямі плуг. Чалавек нокае на каня. Паволі крочыць, не спускаючы з баразны вачэй. Сунімаецца. Крукам

выгнуўшы спіну, з-пад ног вырывае камень і кідае ў камяніцу.

— Гэй!—свіснуўшы пугаю, паганяе ён.

І зноў ціха. Толькі ветраная поўзь. Толькі гнуткая восеньская дарога.

Я азіраюся кругом. Тут праходзіла маё дзяцінства. З прагнасцю я перабіраю яго ў памяці, прыглядаюся да гасцінцаў, да раскарачыстых старасвецкіх дзічак на межах, пазнаю, чые гэта стаяць ветракі. Вунь там, з боку, Падлужжа. Некалі яно здавалася далёкім, а гэта мусіць пабольшала і стаіць зусім пры дарозе. А наперадзе, мусіць, Сцяпкоў? Так! Сястра кажа, што гэта Сцяпкоў. А вунь з боку і Калінка, і Стараселле. Як, аднак, усё паіначала. Павыростала. І не пазнаць. А прайшло толькі сем год.

— От, братка,—кажа сястра,—ты ўжо нават пазабываўся, як што і зваць, ты ўжо зусім ачужэў.

— Не, не ачужэў я, а толькі хочацца як мага больш наглядзецца наўкола, прыпомніць от гэтую забытую, але добра знаёмую восеньскую ціш.

Сястра паганяе кабылу. Калёсы трасуцца па камяністай дарозе, барабаняць. Узгоркі зменьваюцца новымі загонамі. Вузкімі, нуднымі, як сама восень. І неяк дзіка, крыўдна, што некалі, яшчэ пры мне, былі гэтыя самыя даўжэразныя шнуры з дзічкамі ды з бур'янамі на межах. Яны ніяк незмяніліся і адтаго здаюцца вельмі пукатымі.

Гэта неяк мучыць мяне. Я думаю, што і сястры рупіць гэта, і пытаюся:

— Дакуль вы жыцьмеце так, Ульяна?

— Што?—пытаецца яна, не зразумеўшы.

— Дакуль у вас будуць гэтыя шнурышчы?

Яна не ведае, што адказаць. Яна нечага шукае ў сабе. Тузаецца, не можа знайсці слоў. Я пачынаю здагадвацца. Мне шкода робіцца і сястры, і зямлі, і гэтых сямі год.

— А хто яго ведае, дзе лепш! Калі-ж неяк страшна пачынаць.

Мы пачынаем спрачацца. І я пазнаю: яна зусім дваістая. Яна зусім на раздарожжы. У яе шмат чужых, не сваіх думак. Мне ўспамінаецца гутарка з настаўнікам, што ў сельсовеце доўгі час сядзелі кулакі. Значыць, адтаго я так і не пазнаю Ульяны—гэтае першае селавое дэлегаткі. Значыць, ты паддалася, Ульяна, а хіба-ж не на цябе гледзячы я пісаў „Затоку ў бурах", аддаючы табе ролю Алесі? Не, не такою я хацеў сустрэць цябе, сястра!

— Вунь новая будыніна відна,—кажа яна пад'язджаючы да Грэска.—Гэта-ж сямігодку пабудавалі з самаабкладання. Дык неяк і добра робіцца, як бачыш, што пайшло на карысць. Цяпер-жа і Каця вучыцца там, ды так-жа хапаецца за навуку, што і сказаць нельга. Толькі там кніжкі нейкае нехапае ёй. У яе нават і запісана якое.

І яна пачынае расказваць, як меншыя дома таксама бегаюць у школу, як трудна, што няма работнікаў, што ў іх бываюць частыя пажары і што ніяк не ўзбіцца на добрае жыццё. Тады зноў заходзіць гаворка пра калгас і пра гэтыя бяздоль-

ныя шнуры. Яна згаджаецца, што гэта было-б і добра, але няма каму першаму ў іх пачаць.

Яе голас звонкі, яшчэ зусім малады, запальчывы—падае ў восеньскі вецер, рвецца і блытаецца ў каўняры кажуха.

— Но-о-о!

II

За Анупраўскаю гарою—грэбля. З калдобіны ў калдобіну перакідаюцца драбіны. Памаленьку, адна за адною мінаюцца падгалістыя бярэзінкі, грабкі. Наабапал—скошанае рыжае балота. На гары вятрак. Журавы курлыкаюць, стройна, ключом хаваючыся за лесам.

— Но-о-о!

З-за аглабель раптам выраслі плечы. Суконны палітон, заложаныя назад рукі з кіёчкам гойдаюцца, не адступаючы ад аглабель. Пасля рукі расчапіліся, адна палезла ў кішэню і дастала шабэту. Тады другая ўзяла пад паху кіёк, а зліняўшая варшаўская шапка нагнулася ўперад.

— Ны, пайшла-а!

Кабыла тузанула, і чалавек параўняўся з сядзеннем. Старанна ўкрываючыся ад ветру, ён круціў папяросу.

— Добрага дня, куды гэта ідзеш?—пытаецца Ульяна.

Чалавек падняў галаву і пырснуў вачыма.

— Здарова! У Грэску быў. А ты-ж куды?

— От мабыць у дарогу—падкідайся!

Чалавек зайшоў з другога боку і ўкінуўся ў перадок. Патузаўся крыху, урымсціў ногі, а тады паправіў казырок і падняў голаў. Гэта быў гадоў 28 мужчына з шэрымі вачыма, з круглым задзёрыстым тварам і шчарбатымі зубамі. Вочы глядзелі гарэзна, упорчыва. На іх нізка насядалі бровы, і адтаго здавалася, што вельмі вузка і і глыбока сядзелі яны. Нос смешна задзіраўся ўгору і паказваў дзве круглых мясістых ноздрыны Верхняя губа налягала на папяросу і здавалася цяжкою.

— У Грэску быў,—кажа ён зноў,—шукаў бляхі, бо крыху на страху нехапае, але ў кааперацыі няма, і, мабыць, давядзецца ў Менск ехаць.

— Дык вы ўжо трохі забудаваліся?

— А ты-ж як думала? Хлявы, гумны пастаўлялі хаты от канчаем ды будам і жыць. У нас там не пазнаеш тае пусткі, што была. Будынкі спрэс новыя—зіхацяць.

Я ведаю гэтую пустку—Ляды. Гэта вялікае між лясоў гала пана Мельнікава. Гала няроўнае, купістае, а пасярод яго стаяў чуб старасвецкага лесу—„Сахран". Казалі, што ў тым тым лесе вадзіліся ваўкі. А гэта людзі будуюць калгас. Знесены, раскарчованы лес, павыцярэбваны кусты а пасярэдзіне пасталі сядзібныя будынкі.

Чалавек з жарам расказвае, як дорага даецца ім гэты калгас, як цяжка было адразу пачынаць і як ім ўвесь час перашкаджалі Рымашы.

Сястра слухае. Яна чула, што гэты чалавек гультай, абібок, а гэта так горача, так зырка ён гарыць работаю. Значыць, гэта мана, значыць, і ў іхным сяле перашкаджаюць Рымашы, Семачкі ды іншыя валасныя старшыні. Людзі змаглі раскарчаваць лес, выцерабіць поплаў—зрабіць зямлю,—а яны баяцца параскідаць свае межы, паламаць даўжэразныя трохвярстовыя шнуры.

Чалавек канчае, а Ульяна яшчэ доўга думае. Драбіны паволі гойдаюцца па калдобінах. Па такіх калдобінах варочаюцца, мабыць, і думкі. Цяжка, непаваротліва. Ад таго нават углыбіліся, нават пасінелі вочы.

Шугае вецер. Нязграбна па небе варочаюцца, адна адну наганяюць хмары.

— Цяпер яшчэ нуднавата, а зараз павесялее,— смяючыся, кажа чалавек.—Яшчэ жанкі нашы не ўсе пераехалі. Не кончаны хаты.

— І твае няма?

— У Камені яшчэ.

— Ой, глядзі ты,—весялее раптам і Ульяна,— пакінуў адну, а там возьме хто дый падкоціцца. Кабеціна-ж маладая.

— Толькі таго і клопату,—жартам адказвае чалавек,—што ён—адкусіць яе? А калі што такое, то мне работы будзе менш.

Ульяна звонка смяецца, а ў яго ад жарту зусім хаваюцца вочы і тырчыць дзіркаю вывалены зуб.

Грэбля мінулася, і кабыла ідзе трухам. З боку

пачынаецца лес. Пахне вільгаццю і гнілатою. Каля карчоў кучамі растуць апенькі. Асовыя лісты, пачырванеўшы, абрываюцца і цяжка падаюць на дарогу.

III

— Ого, ты не кажы, Ульяна,—думаеш, лёгка было нам рабіць? Нялёгка. Я яшчэ ўперад быў наглядзеў гэтую мясціну—разы колькі хадзіў туды, абыходзіў, вымацваў. Станеш—глядзіш-глядзіш—і страх бярэ: як пачынаць, з кім пачынаць і з чым? Балоты, лясы, куп'ё. За што тут, думаеш, узяцца спачатку?

— Знайшлося было пяць чалавек. Прыходзілі. Глядзелі. Парашылі больш сілы падбіраць. Ну і набралася шмат: з Замосця, з Рудні, з Покаршава, а чалавек колькі ажно з-пад Ігумена нашлося. Адусюль, як кажуць, па чалавеку. Брат мой старэйшы таксама быў упісаўся і нават у праўленне папаў. Ну і пачалі патроху калупацца. Як глядзелі здалёк, то і нічога было, а ўзяліся за работу—і ад сэрца адлягло. З цямна да цямна жаўрэеш—і нідзе ніякага знаку. Ну, другія і давай назад лататы даваць... А брата жонка выпісала.

— Як выпісала?

— Ды так і выпісала. Як насела на яго—не пайду і не пайду. Прывыкла, як кааператарам яшчэ быў, цукеркі паядаць, а тут трэба было за работу ўзяцца—не захацела. Надзенецца барыняю, бывала, дый сядзіць, а ты ёй выслугоўвай. Паршывая,

трэба сказаць, жонка ў яго, а ён таксама не лепшы—прыліп да бабскае спадніцы. Грызе яго жонка, а ён у калгасе нэндзу толькі наводзіць. Не вытрываў урэшце, уцёк да яе—ну яго к чорту! Гэта не работнік!

Чалавек змоўк. У Борках праз загоны кабыла павярнула нацянькі. Нехта выскачыў і нарабіў крыку. Дарога павярнула паўз лес, нырнула ў волкую восеньскую слізь. Вецер шмыгаў над галовамі па аголеным верхавінні. Унізе стала ўкрадліва ціха.

— Цяпер галоўнае нам з будоўляю канчаць трэба,—перадумаўшы, гаворыць чалавек.—Гады два пагаруем, папакутуем, а там жыць будам як лепш не трэба. Ты ведаеш гэтае месца? Разрабіўшы яго, гэта будзе зялёны рай! Зямля—паплавы, сенажаці—рэдка знайсці! Як ягада! Але лёгка нічога не даецца.

— А добрыя ў нас сабраліся хлопцы. Валаводзілі колькі нас, колькі цкавалі, бэсцілі, пужалі—а не паддаліся. Казалі: сабраліся гультаі, абібокі— а гэтыя абібокі зямлю ракам паставяць! Мы думаем тут шмат чаго зрабіць. Першае—нам трэба каровы. Галоў 20 ужо закуплена. А наладзім, паднімем гаспадарку—возьмемся будаваць і свае заводы. Малочню ў першую чаргу, а тады пільню, а тады і яшчэ сёе-тое. Мы, брат, таксама сваю пяцігодку маем.

Чалавек усё расказвае. Ён датаго захапляецца сваёю гаворкаю, што кожнаму слову хочацца ве-

рыць — няма як не верыць яму. Гэты невялікі суконны чалавек зусім непазорны, а якім аграмадным полымем гарыць яго нутро! І такіх іх сабралася шмат. А хто хоча рабіць, хто верыць у гэта, той зробіць! Сястра слухае. Яшчэ больш углыбляюцца, яшчэ больш сінеюць вочы. Якая пакута з гэтымі даўжэразнымі—за край свету—шнурамі.

— От, да дзіва што бывае. Паслухаеш самога чалавека;—кажа сястра,—і верыш яму, і ахвота бярэ. А ў нас як нагародзяць чорт ведае чаго на гэтыя калгасы, дык аж страх бярэ. Гэта-ж летась яшчэ былі прыязджалі да нас, каб арганізаваць, дык дзе там—нічога не вышла. Кулакі як сабралі да сябе поўсяла, ды як спаілі, дык ніхто і рукі не падняў. А я таксама здурнела пад старасць—маўчу. На мяне от і Янка крычыць ужо, а мне брыдка і прызнацца, што я так асталася ззаду.

Я зноў пазнаю Ульяну. Як добра, што я цябе знаходжу, сястра, і ты сама аглядаеш сваю дарогу. Ты хочаш заўважыць сваю памылку. Кулакі і на табе пакінулі свой след. Не дзіва, што можна было аслабнуць, адыйсці назад. І калі ты цяпер пільна ўглядаешся недзе наперад, сплюшчыўшы сіняватыя азяркі воч—я знаю: у цябе складаецца рашэнне. І за гэтае рашэнне я—хоць не ўмею—а хачу цябе расцалаваць.

— Вунь наша і гняздо відно,—перарывае маўчанне чалавек,—бач, дзе мы аселіся.

Сінь. Волкая ветраная поўзь. Управа, праз па-

раснік, праз кусты відны будынкі. Блішчаць новымі гонтамі стрэхі.

— Ну, мне і злазіць пара. Ужо блізка. Я от сюдэю нацянькі і пайду. Дзякаваць.

— А, няма за што,—кажа сястра,—што гэта значыць такою дарогаю падвезці чалавека. Усё адно як улегцах.

— Ну, мала што. Бывайце здаровы!

Паправіўшы шапку і наставіўшы каўнер, ён закрочыў у бок, паўз пасёлак. Восеньскі вецер дзме яму ў твар і расхільвае крысы палітона. Яны аддзімаюцца назад, цялёпкаюцца і б'юцца—то адна, то другая—па сцёгнах. Тонкія—некалі крамныя шырокія, з галіфамі порткі прадзімаюцца наскрозь і трапечуцца. І адтаго, што ён згорбіўся і падаўся наперад, налягаючы на вецер,—шырока ступаюць яго ногі, нязграбна, крыва ставячыся вялікімі ботамі. Штораз усё далей і далей віхаецца яго фігура, пераступаючы вецер і золь, і так упэўнена крочыць гэты чалавек, што, здаецца, яшчэ чутны нават абцасы яго ботаў.

IV

Гэта пайшоў новы, аграмадны чалавек.

Менск, 1929—1930.

На выселках

I

Леўка варочаўся дахаты.

Палявая дарога выкручвалася па загонах. На ёй відны былі нядаўна павысыханыя пасля дажджу і непазгладжваныя яшчэ сляды калёс. Леўка ішоў, грукаючы абцасамі. Шырокія халявы ягоных ботаў біліся па тонкіх старэчых галёнках. Ён курыў люльку і, пыхкаючы дымком, сяды-тады сунімаўся і глядзеў на загоны.

Сяўба была зроблена добра, як мае быць. Ён нагінаўся і мацаў рукамі. Набутлыя зёрны прарываліся праз шалупайкі і прыліпалі нядужымі яшчэ парасткамі да грудак зямлі. Леўка варочаў пальцамі гэтыя грудкі, расціраў іх у далоні і нюхаў чорную сытую вільгаць. І толькі ўжо калі замлявалі ногі—падымаўся і ішоў далей.

Часамі ён задумляўся, нібы што прыгадваючы. А потым ажыўляўся, і ў барадзе паяўлялася ўсмешка. Ён бачыў сябе гаспадаром усіх гэтых па-

лёў. Ён удыхаў у сябе іхную радасць і думаў: „Во“ брат Леўка, які ты вялікі начальнік. Над усім калгасам нагляд. Хто-б дзе што ні рабіў, а Леўка— праверыць. А прызнае Леўка, што нядобра,—круці не круці, а пераробіш. У Леўкі, брат, вока спрактыкаванае, ад яго нічога не ўтоіш. А знайшоў непарадак—сілу маеш і пакараць. От-жа зняў з Мігалені пяць працадзён за тое, што забаранаваў як насмех. І другі раз—не будзе... Во, брат Леўка, якая сіла ў цябе цяпер на старасць. Во да якое ты паверкі дажыў, а? Толькі от маладосць твая— як не твая была, гэта, брат, шкода“.

Успомнішы пра маладосць, ён уздыхнуў. Але праз хвіліну сплюнуў і думаў ужо зноў пра другое. Перад вачыма стаяў гэты чортаў Цярэшка. Вышла так, што той ушчэнт пазамульваў коні. Леўка адабраў іх ад Цярэшкі і перадаў другому. Не ўмееш, моў, абыходзіцца з дабром, дык і не бярыся, або навучыся перш... Цярэшка злаваўся, крычаў, што ён не вінаваты, а што такія папаліся хамуты. Ну, а калі хамут, то хіба яго нельга паправіць? Пасля Цярэшка пачынаў прасіцца не адбіраць ад яго коней. Цяпер ён ходзіць асунуўшыся, як сірата якая. Сустрэнецца, і дабрыдзень аддасць, але неяк нялоўка, відаць, яму, нават гаворкі не можа знайсці. Леўку рабілася шкода яго. От стаіць у ваччу, як ён, ледзь не плачучы, просіцца не рабіць яму на ўвесь калгас сораму.

У далоні расціснулася забытая грудка зямлі. Леўка выцер аб палітон руку і толькі цяпер заў-

важыў, што ўжо вечарэе. Ён закрочыў шпарчэй. Люлька пыхкала, пакідаючы за Леўкаваю спінаю лёгкі і сіні дымок. Халявы шоргаліся адна аб адну і біліся па галёнках, даганяючы старэчы Леўкаў шаг.

У сяло ён прышоў ужо прыцемкам. Па дарозе завярнуў да Грыбаля і застаў у яго Шкарубу. Шкаруба сядзеў на лаве, успёршыся рукамі на кіёк і палажыўшы на іх сваю рыжую драмучую бараду. Грыбаль чытаў за сталом газету. На адно плячо ў яго быў накінуты шынель. Лямпа звісала над сталом, і ад яе бляшанага кружка на столь клаліся шырокія цені.

— Дык як-жа будзе?—запытаўся Шкаруба, не знімаючы з кійка барады.

Грыбаль перагарнуў газету, і адсунуў яе ў бок.

— Так і будзе, Шкаруба. Не можам... Ну, што добрага, дзядзька Леўка?

— Табе штодня ды ўсё каб што-небудзь добрае. Ты пытай пра благое, каб яго ўпору ўбачыць.

Грыбаль зарагатаў. Леўка знайшоў і падсунуў да стала ўслончык.

— Гэта праўда... А што ты от, дзядзька Леўка, скажаш пра Шкарубу?

— А што?

— Ды ён от...

— Я табе кажу, Рыгор, што не мудрую я,—перабіў Шкаруба, паднімаючыся з лавы і адстаўляючы перад сабою кій.—Думаеш я гэта з бухты-барахты? Я, брат, пападумаў ужо колькі над гэтым. Можа я начамі не спаў перад тым, як прыйсці сюды.

Ну, а што было раней, то сам ведаеш—нярозум мой быў на гэта. Ды і калі гэта было? А што я за апошнія гады зрабіў ці сказаў дзе?.. У калгас прасіцца прышоў,—паясніў ён Леўку і павярнуўся да яго.

Леўка паглядзеў на Шкарубу доўга і ўпорчыва. Шкаруба сумеўся. Яму толькі здалося, што ў Леўкі былі занадта цяжкія бровы.

— Як ты што скажаш, дзядзька Леўка, на гэта?— запытаўся Грыбаль.

Лямпа вісела над самым сталом і адкідала на хату пачварна шырокія цені. На канцы стала ляжала пакамечаная газета. За акном вырысоўваўся высокі сілуэт бярэзіны. Леўка палез у кішэню па люльку.

— Нельга,—спакойна і холадна сказаў ён.—Каб хто другі, а Шкарубы нельга. Шкарубу кожны ведае—колькі год ваяваў з намі. Што, мо' няпраўду кажу?—звярнуўся ён да Шкарубы.—От бач. Калгас, гэта табе не Мікола цудатворац, што ты яму свечку паставіў і скажаш, што адмаліўся... Не чалавек ты нам, от што, і не паверу я, што ты прышоў на сумленне гаварыць,—гэта я кажу табе ў вочы...

— Леўка!..—Шкаруба ступіў да стала.—Вы от не верыце, мужчыны. Але-ж, я кажу, што можа я начамі не спаў, пакуль адважыўся пераступіць гэты парог. Не насмех-жа я прышоў да вас. Што было, таго ўжо даўно няма. Чым хоць бажуся, што... я ну як тут сказаць? Ат, усёадно-ж не па-

верыце,—махнуў ён рукою. Пасля раптам сутула і неяк нязграбна павярнуўся і, цягнучы за сабою кій, таропка вышаў з хаты.

II

Шкаруба жыў наводшыбе, каля лесу. Цяпер у яго быў там хутар. Праўда, хутарам яго нельга было і назваць, так сабе—хатка дрындушка. Раней ён жыў на сяле, разам з усімі, і на гэтыя выселкі пайшоў не з вялікае ахвоты. Пачалося гэта гады чатыры ці больш назад, і ніхто нават не мог і падумаць, што Шкаруба паверне на такую дарогу.

Жыў ён некалі так, што ледзь ставала ў гаспадарцы зводзіць канцы з канцамі. Да вайны больш хадзіў па людзях—батрачыў. За вольнадумства на сяле яго звалі „дамакратам", і ў старасты ён лічыўся за „лядайкага" чалавека. Пасля ён пайшоў у салдаты і вярнуўся ўжо толькі пасля рэволюцыі ў адным пашарпаным шынеліку, падпяразаным шырокаю папругаю з царскім арлом на блясе і ў сівой каракулевай папасе. Левы бот быў да таго разбіты і скрыўлены, што з яго вылазіла чырвоная, яшчэ патрэсканая пята.

На сяле ён стаў адразу прыкметны. Без яго цяпер не абыходзіўся ніводзін мітынг. Усюды, дзе-б ні было якое зборышча—відна была яго знакамітая сівая папаха. Ён быў і камбедам і ў дэпутатах; яго наўкруга баяліся ўсе самагоншчыкі і дэзертыры.

Прышоўшы з салдат, ён застаў гаспадарку разбуранаю і запушчанаю. Ён кінуўся да сваякоў, да знаёмых, просячы памагчы, хто чым можа. Памаглі—хто канём, хто насеннем. Першыя часы Шкаруба не вылазіў з даўгоў ды з адработкаў. Але год за годам гаспадарка пачала папраўляцца. Памочніцаю падростала дачка. Жонка, праўда, часта нядужала, але сваю долю гаспадаркі цягнула. І асабліва пачаў папраўляцца Шкаруба, калі далі прырэзку. Ён набыў ужо і карову, і каня, і самашто станавіўся на ногі, як у сяле ўзяліся арганізоўваць калгас. Гэтая папраўка распаліла прагнасць „выйсці ў людзі", стаць гаспадаром не горш за другіх. І от Шкаруба ў калгас не пайшоў, а разрагатаўся.—Хто гэта выдумаў такую праяву—калгасы?—гаварыў ён.—Як-жа гэта можна будзе ў чарадзе гаспадарыць? Не, брат, я яшчэ не здурнеў, каб пайсці на такую штуку.—Ён хадзіў па сяле і пацяшаўся, як, не ўмеючы і часта яшчэ нясмела, бедната зносіла хамуты, звозіла сані, бароны ды плугі на двор новага праўлення, і наспех будавала з гумнаў агульныя стайні.

Рагатаў і пацяшаўся Шкаруба з год. Але з кожным разам ягоны рогат слабеў і рабіўся трывожным. Бедната ішла ў калгас. Разбіты кулак прытаіўся, сам стараючыся пралезці разам з беднатою. Шкаруба пачаў адзіночаць. Яго забірала злосць. Ён бачыў, што тыя-ж самыя суседзі, з якімі ён некалі разам галетнічаў, цяпер у калгасе яго далёка абагналі. Цяпер пасміхаліся ўжо з Шкарубы яны. Але

ўпартасць не давала пайсці і далучыцца да іх. Ад злосці і на людзей і на самога сябе ён захацеў выбрацца з сяла, каб нават і не быць разам з імі. На ўзлеску стаяў недавеяны вятрамі хутарэц Есіпа Бенькі. Шкаруба надумаў прасіць памяняцца сядзібамі. Хутарэц быў, як порхаўка. Абмен быў не вельмі выгадны, але Шкаруба спадзяваўся яго паправіць хоць з пройгрышам, абы толькі збыць гэтую людскую назолу. Бенька з ахвотай згадзіўся нават падрадзіўшыся сплаціць барыш, і Шкаруба пайшоў на выселкі.

От тут і пачалося тое, пра што нават не думаў Шкаруба. Перш, здавалася, з ахвотаю ён узяўся папраўляць сваё новае седала. Але паволі ўсё больш і больш пачынала заядаць гэтая страшэнная адзінота. Ён пачаў прыглядацца і разбіраць акалічнасці. Ён пачаў упершыню доўга і сур'ёзна над усім гэтым думаць. Ён перадумаў усё сваё жыццё, пачынаючы ад батрацтва і канчаючы „хутаранствам". Ён пачаў шукаць у ім тае памылкі, на якой ён пакаўзнуўся. Ён прагнуў стаць чалавекам. І от тады, калі ён, здавалася, ужо намацаў дарогу, ён з разгону пусціўся па ёй, не заўважыўшы, што яна-ж сама пачала апускаць яго ўніз. Людзі пайшлі па другой і цяпер былі далёка ад яго. Ён астаўся адзін, ад яго цяпер адвярнуліся нават суседзі. І па сутнасці заслужона, бо хіба мала ён хадзіў і ад зайздрасці, што праўда была на іх старане, паклёпнічаў. Шкаруба думаў цяпер над усім гэтым доўга і ўпарта.

Яго пачала страшыць адзінота. Да яго цяпер ніхто не заходзіў. Сустракацца з сваімі даўнейшымі сябрамі па рогату ён сам не хацеў, нават неяк баяўся іх і ненавідзеў. А добры чалавек не заглядаў да яго на двор, нібы на ім ляжала нейкая нязмыўная пляма. Звычайна ў такія часіны людзі шукаюць уцехі ў сям'і. Але з некаторага часу Шкаруба заўважыў, што і сям'і гэтае ў яго цяпер няма. Яна распадалася, як дрэнна злепленыя цагліны на ветры, не маючы нейкага агульнага цэнтру. Кожны жыў сам па сабе, сваімі інтарэсамі, як пустэльнік. Жонка стагнала і ішла на работу, не гледзячы, пад сілу яна ёй ці не. У гады ўвабралася дачка. Яе плечы круглелі і вылузваліся з тонкае кашулі. Шкаруба знаў, што ў жанчыны свой лёс і яго нічым не перамудруеш. А самой-жа да хлопцаў не пойдзеш. А хутар наўкруга быў забыты. Ні з сяго ні з таго пачыналіся сваркі. Ганна нападала тады на бацьку, што ён намудраваў на сваю галаву. Хіба нельга было і ім жыць разам з людзьмі, пачалавечы, і маці-б не разрывалася на кавалкі, а стала-б дзе на лягчэйшай рабоце, як людскія— даглядаць свіней, ці на кароўнік.

— Дык-жа не прымуць,—звычайна глуха і безнадзейна адказваў Шкаруба.

— Дзіва што не прымуць, калі вы перш сябе абгнюсілі.

Шкаруба змаўкаў. Ён выходзіў на двор і браўся за якую работу. Але дзіўная рэч: некалі ён прападаў дзень і ноч ля гаспадаркі, а цяпер усё

гэта выпадала з рук, як чужое. Ён садзіўся ў дрывотні і гадзінамі глядзеў, уставіўшыся ў паломанае калясо, што валялася сярод двара. Па дарозе паўз лес ехалі хурманкі. Ён чуў іхныя галасы і адрывісты лоскат калёс. Ён зайздросціў, што ў іх ёсць шырокае гаманлівае жыццё, свае інтарэсы і гэта несканчоная гаворка, каторае хопіць на ўсю дарогу. Па небе плылі воблакі. За дарогаю пачыналася калгаснае поле. Ішла сяўба. Людзі паказваліся то тут, то там, кожны заняты сваёю работаю. У гэтай дзелавітай стараннасці была вялікая любоў і дбайнасць. А добра дбаць, калі гэтая дбайнасць усім на ўцеху, і ганарыцца, што там ёсць хоць кавалачак твае работы. І нават па тым, як звінелі там жаўранкі і пераклікаліся галасы, Шкаруба бачыў там радасць. Яму хацелася ўстаць і пайсці да іх, каб хоць нейкім крайком даткнуцца да гэтае радасці.

І гэтак, сам таго не заўважаючы, Шкаруба пачынаў жыць чужым жыццём. Свая гаспадарка яго не цягла. Ён глядзеў на калгаснае поле, і ў ім шавялілася і набракала спрадвечная патрэба дзейнае рупнасці і гаспадарскіх клапотаў. Вечарамі, тайком ён прыходзіў на гэтае поле і падоўгу прастойваў, любуючыся і цешачыся так, нібы гэтыя загоны засяваў сваімі рукамі. А калі варочаўся дахаты—зноў была пустата і звярыная адзінота. Хацелася некуды пайсці. Было такое адчуванне, што ён на хвілін колькі зайшоў да некага па дарозе, і яму карціць скарэй вярнуцца дахаты. Перад

359263

вачыма неадступна стаяла сяло. Мыслена ён бачыў сябе там, сярод мужчын. Яны сабраліся ў хату і талкуюць пра брыгады, пра трактар, пра працадні, перасыпаючы гэта жартамі або якімі здарэннямі, каторых да поўначы хопіць у Мірона.

Шкаруба скучаў без людзей і яму прагна хацелася ўліцца ў іхны гурт, стаць роўнапраўным і сваім сем'янінам. Яму хацелася вярнуцца ў сяло. Разы колькі ўжо ён памыкаўся пайсці і расказаць пра гэта Грыбалю, але не адважваўся—не паверацъ, або засмяюць. Але аднойчы-такі не вытрываў. Дачакаўшыся вечара, вышаў нясмела з двара і пакрочыў па сцежцы. Калацілася сэрца, нібы ішоў на прысуд. І невядома чаму, вярнуўся, выбраў у дрывотні спадручнейшы кій, і тады ўжо пайшоў смела і цвёрда.

III

Да чаго прыгожая гэта вясновая раніца! У паветры яшчэ сыра. На лістах вішняка вісяць буйныя кроплі начных туманоў. На платах і на стрэхах ляжыць яшчэ вільгаць. За сялом густа і тучна зеляніцца поле. Загоны перасякаюцца то тонкімі, то шырокімі звілінамі дарог. На пагорку стаіць і яшчэ дрэмле вятрак, але здаецца ён ужо сіліцца ўзмахнуць паднятымі крыламі. Узыходзіць сонца. Яно нетаропка і баязліва паказваецца з-за гарызонта, і першыя праменні яго кладуцца шырока—густым і нібы цягучым золатам. Над стрэхамі хат

вывіваюцца лёгкія празрыстыя дымкі. За імі на небе такая-ж самая лёгкая ружаватая балачынка. Здаецца, што ёй нудна быць невялічкай, адной на гэтай галубовай бясконцасці неба, але запрапасціўся недзе гэты чортаў свавольнік вецер, і яна не можа скрануцца. За сялом паказваюцца і рыкаюць каровы, падымаючы на дарозе за ноч пахаладалы і злежаны пыл. Неспакойна ў гурце снуецца бык. Сонца падымаецца над лесам. Яно слізгае па вяршалінах дрэў і западае ў прагаліны. Лес пачынае дыміцца густымі пахамі. Бесклапотна цвыркаюць птушкі. Яны то, гойдаючыся, пырхаюць з дрэва на дрэва, то вылятаюць у поле, дзе, падняўшыся ў неба, сваім танюткім і нескончоным звонам заліваюцца жаўранкі... Чорт на цябе, якая слаўная ты, селавая, вечна маладая і вечна пявучая раніца!

Леўка ішоў і ўдыхаў гэтую неўгамонную веснавую радасць. Ён рабіў сваю ранішнюю праходку па полі. Хоць усюды сяўба была ім даўно ўжо праверана, але яму хацелася бачыць, як падымаецца рунь. Такія праходкі рабіў ён штодня. Для яго было невыказнаю ўцехаю бачыць, як зелянеюць і ўбіраюцца ў сілу загоны. Ён нагінаўся і выпроставаў пакурчаныя каліўцы, гладзіў далоняю і гаварыў з імі, нібы няньчыў дзіця, і з поля заўсёды варочаўся ажыўлены і памаладзелы.

Праходзячы каля дзялянкі, на якой на днях засеялі пшаніцу, Леўка суняўся. На твары ў яго выразілася здзіўленне. Ён нават выняў з зубоў люльку і патрымаў яе колькі часу ў руках. На

дзялянцы матляліся пастаўленыя пудалы. На поплаве за дарожкаю каркала цэлая чарада варон. На Шкарубавым двары цвыркацелі, грэбаючыся ў конскім гнаі, вераб'і. Пудалы на загонах стаяць, коса паўтыкаўшыся ў зямлю, і звісаюць сваімі пустымі рукавамі. Здаецца, яны зараз пачнуць матляць імі і прытанцоўваць, перакрыўляючы адзін аднаго, як блазны. У крайняга прыстроены пад пахаю венік. На адным надзета зімовая шапка, з якое праз прарэхі павылазіла вата. А ў таго крайняга і касабокага толькі адзін рукаў звісае да самае зямлі. Леўка глядзіць і дзівіцца.

— От гэта дык мне ўжо не падабаецца,—гаворыць ён сам сабе.—Гэта ўжо, брат Леўка, нікуды не варта. Які-ж ты ў чорта гаспадар, калі сам не прыдумаў пастаўляць гэтых пудалаў. Што-ж з цябе за інспектар, калі і не дагадаўся, што птушкі зерне выклёўваюць. Але хто-ж бы гэта мог пастаўляць? Во малайчына!

Леўка падумаў, што Шкаруба, жывучы тут пад бокам, павінен быў бачыць. Ён застаў яго на дварэ. Шкаруба зачэсваў клінкі і заганяў у парасшалёстваныя зубы бараны. Леўкаў прыход ажно перапалохаў Шкарубу. Пачуўшы чужыя шагі, ён зірнуў з-пад рукі і пазнаў Леўкавы боты. Тады ён скарэй адвёў вочы, баючыся, каб не сустрэцца ў твар. У сярэдзіне нешта тарганулася і заныла. „Чаго-б яму спатрэбілася зайсці?"—падумаў Шкаруба. Ён пачуў, як яму стала горача ў шчокі, і пад сякераю крутнуўся і зламаўся клінок.

— Гаспадарыш, Ігнат? Добры дзень.

— Добры дзень... А от папраўляю. Бо яшчэ-ж думаю... грэчкі хачу кавалак засеяць. Дык от барана рассохлася.

У Шкарубы быў абабіты палец; болька на ім запяклася і закарэла, а твар зарос драмучаю шчаціністаю барадою і, здавалася, таксама быў закарэлы і адзічэлы. Ён палез у кішэню і дастаў кавалачак замурзанае газеціны, выдзіраючы больш цэлы край на папяросу. Нічога не гаворачы, Леўка дастаў свайго тытуну.

— Сей-сей.—Тытун з Леўкавых пальцаў высыпаўся за паперку і цярусіўся на дол. Пад нагамі ляжалі свежыя, пахучыя трэскі.—Сей-сей, я так уважаю, што сёлета грэчка добрая парасце. Увесь ураджай сёлета будзе багаты... Чо-ж гэта вулей у цябе пад сцяною валяецца,—няхай-бы пчол развёў.

— Ат, дзе там,—махнуў рукою Шкаруба.

Абое памаўчалі. На бярэзіну шумна прыляцеў бусел. Ён паклаў на гняздо прынесеную ў дзюбе разгачынку і заклекатаў. Сонца трапятала і гушкалася ў ягоных прыўзнятых крылах.

— Ты тут часам, Ігнат, не бачыў, хто гэта на нашай пшаніцы пастаўляў пудалы? — запытаўся Леўка.

— Не,—Шкаруба глядзеў на свой закарэлы палец.—Я бачыў раніцаю, як яны ўжо стаялі, а хто іх стаўляў, то не ведаю.

Дым засланіў Шкарубаў твар, і Леўка не бачыў,

як ягоныя вочы шукалі на чым-бы суняцца. Яны суняліся на пальцы, і тады Шкаруба выцер яго аб зашмальцованы край сарочкі, хоць на ім не было ніякае ні макраты, ні крыві.

— А я думаў, што ты тут прымячаў. Добра, што нехта дадумаўся, а то ў мяне і з галавы выпала, што тут гэтулькі птушак... Дык я думаў, што ты можа і бачыў.

— Не, не бачыў, — коратка паўтарыў Шкаруба і пачаў шукаць сякеры.

Леўка ішоў і ламаў у руках паднятую ў Шкарубы трэску. Над сялом радзелі дымкі. У полі і на дарогах паявіліся людзі. За вятрак пад гору паехала пару хурманак. Балачынка на небе расплылася і знікла. Кругом ужо было адно толькі сонца. Зямля парылася пад ім і прагла, а паветра напружвалася і пачынала трымцець. Наперадзе, падымаючы пыл, затрабашчалі калёсы і неўзабаве параўналіся з Леўкам. Выцягнуўшыся ў возе, ляжаў і намармытваў песню крамнік.

— У Слуцак?—запытаўся Леўка.

— Тпру. У Слуцак.

— Па тавары?

— Але. Учора ўсіх не забраў.

Мужчыны колькі хвілін пагаварылі, і Леўка не прамінуў запытацца пра пудалы.

— Дзе? Ля хутара?—даведаўся крамнік.

— Але.

— Дык гэта-ж Шкаруба.

— Як?—не паверыў Леўка.

— Шкаруба, я-ж сам бачыў. Учора зусім ужо прыцемкам я ехаў з горада, дык ён іх стаўляў. То я думаў, што яго папрасілі, ды толькі здзівіўся, чаму гэта ён поўначы, як вядзьмак, поркаецца.

Леўка павярнуў у сяло і пайшоў байчэйшым шагам. Ён раптам нібы нешта ўспомніў і заспяшаўся, хочучы зараз-жа гэта зрабіць. Яму здавалася, што ён толькі што нешта вельмі важнае разгадаў, над чым увесь час дакучліва думаў. Перад ім стаяў з закарэлым пальцам Шкаруба. Толькі цяпер ён прыпомніў, што той увесь час хаваў свой твар. Пасля ён паяўляўся перад ім у праўленні, калі, махнуўшы рукою і згорбіўшыся, выбягаў у той вечар з хаты.

Леўка ўсміхаўся і самаздаволена чухаў патыліцу. Быў знойдзены чалавек. Была разгадана пад адзічэлым абліччам балючая, ад усіх затоеная новая чалавечая вера. Леўка знайшоў Грыбаля і расказаў яму пра Шкарубу.

Быў знойдзены чалавек. Неўзабаве яны абодва сядзелі ў праўленні і пісалі позву, дзе прасілі Шкарубу з'явіцца ў калгас па кроўнай і вельмі важнай для яго справе.

Леўка набіваў сваю новую люльку, і тытун рассыпаўся з таропкіх ягоных пальцаў і цярусіўся на падлогу.

Менск,
1933—1934.

Законы

I

Аднойчы ў пагодлівы восеньскі вечар я заехаў да Есіпа Бенькі.

Заходзіла сонца. Яно самашто ападала за гарызонт, гарэла на стрэхах будынкаў і трапятала на пажоўклых лістах апусцелага саду. Адале ўжо апошнімі праменнямі яно слізганула па макаўцы сілоснае вежы і патухла зусім. На гарызонце астаўся толькі чырвоны край неба. Ад лесу пачалі наплываць і згушчацца змрокі, і на сяло пацягнула халаднаватаю вільгаццю паплавоў.

На двор варочаліся з поля аратыя. Коні пырхалі, пазвоньвалі цуглямі, і ад іх густа падымалася пара. Недзе рыпнула калодзежнае пругло, па вуліцы з вёдрамі прайшла жанчына, і ўсё згушчаліся вечаровыя мяккія змрокі.

На той бок вуліцы крылі гумно. У змроку відаць было, як у неба ўрэзвалася скрыжаванне лат. Пару страхалёў яшчэ стукалі малаткамі, стараю-

чыся прыбіць недакончаны радок гонтаў. Там каля іх быў і Есіп Бенька, і я чуў, як ён з долу крычаў ім:

— Канчайце, а то больш напартачыце, як наробіце. Цёмна ўжо.

Неўзабаве ён увайшоў у хату. Ён на хаду яшчэ скінуў авечую шапку, таропка распрануў і павесіў кабат, і пайшоў у мыцельнік мыць рукі. Пагаманіўшы крыху, мы ўзяліся вячэраць. І толькі цяпер я заўважыў, што ўсю жаночую работу ў хаце робіць ён сам.

— Дзе-ж твая жонка? Што гэта ты сам гаспадарыш?

— Жонка?

— Ага. Што гэта яе ў цябе не відаць?

— Няма.

— Як гэта? Разлучыліся, ці памерла?

— Памерла,— адказаў Бенька згадзіўшы, але спакойна, так, як-бы гаварыў пра нешта пабочнае і далёкае.

Крыху памаўчалі, як-бы кожны думаючы сам сабе. Чутно было, як на сцяне цікалі і на поўнач узбіраліся ходзікі. На покуці слаба абвісалі і мерклі палосы квяцістых шпалераў. У кутку віселі партрэты Леніна і Сталіна, а наводдаль—на параходзе, у белай тужурцы, пад яркім сонцам—ля зенітнага кулямёта стаяў Варашылаў. Мы разгаварыліся зноў, але пра нешта пабочнае, а калі крануліся калгаса, то зноў успомнілася жонка.

— Дык як-жа яна памерла ў цябе? З чаго?

Так і забыліся, што даўно ўжо сядзімо, павылазіўшы з-за стала, што задымілі махоркаю хату што стаіць непрыбраны пасудак ды па настольніку панакрышваны хлеб.

Бенька пачаў прыбіраць. Ён захадзіў па хаце, моцна грукаючы па падлозе цвёрдымі юхтовымі ботамі. Расшпілілася і целяпалася ззаду пражка ад камізэлькі.

— З чаго памерла, пытаеш?—азваўся ён урэшце з мыцельніка. Ён быў пра гэта быдта забыўся, але па тым, як доўга не хацеў гаварыць, відаць было, што ўвёсь час думаў.

Ён падышоў і сеў на ўслончык. Пад расшпіленым каўняром кашулі відзён быў шырокі пакручасты рубец. Рубец ішоў пад ключыцу і быў зацягнуты ружоваю, да таго танюсенькаю шкуркаю, што яна збіралася ў жмурынкі і, здавалася, можа парвацца ад самага неасцярожнага дотыку. Бенька правёў па ім далоняю і задумаўся. Адале схамянуўся, таропка і нібы вінавата зірнуў на мяне, неяк нялоўка ўсміхнуўся і расказаў цэлую гісторыю.

II

— Гэтаму ўжо скоро гадоў каля двух будзе,— роўна пачаў Бенька.—Жылі мы ўжо добра, як лепш здавалася і не трэба.

Усе даўнейшыя сваркі забыліся. Я адно любаваўся. Ты-ж мабыць не ведаеш, што калі я падаваўся ў калгас, дык мы з ёю бадай што былі

разлучыліся. Яна не хацела. Мяне адгаворвала: і плакала, і гразіла, і ўпрошвала. Ну, але-ж я наважыў цвёрда. Яна ўпроч уцякала, да сваіх бацькоў, —можа з год не жыла са мною. Урэшце вярнулася. Нейкі час жылі, як чужыя. Ужо, здавалася, і яна са мною, і я з ёю як след абыходзіліся, а от нейкая чорная кошка ляжала між намі. Не было даўнейшае шчырасці і веры— сваркі за гэтыя гады падтачылі. Але дзень за днём усё паволі наладзілася, і нам так стала лёгка, нібы мы толькі што пажаніліся. Любошчаў больш як у першыя гады было. Можа яна і папраўдзе рабіла гэта, а можа таму, што жыць пачалі мы ўжо ў калгасе па-чалавечы. Свая карова завялася, свіней кармілі, словам—куды лепш, як даўней.

Ён закурыў, перадыхнуў. Праз хвіліну ён зноў загаварыў пра тое, як добра ім жылося ўжо з жонкаю. Другія нават зайздросцілі ім. Яна ўвішная была жанчына. Вясёлая, бойкая, варушкая. Прачнецца, бывала, на золку, дагледзіць што-колечы дома і бяжыць на работу. Анэту пачалі заўважаць і любіць. Ставілі ў прыклад. Аднойчы перад навальніцаю яны ўдвух з суседкаю да поўначы былі на сенажаці, а сваю дзялянку прыбралі. Старшыня перад усімі тады заўважыў гэта і падзякаваў. Прэмію атрымала. Ды што і казаць —жыццё пачыналася.

Бенька радаваўся, яго нельга было пазнаць. Ён насіў сваё шчасце адкрыта, на людзях, нібы хочучы ўсім яго паказаць. Ён ганарыўся Анэтаю і

часта, жартуючы, пры мужчынах абнімаў яе за плечы і гаварыў:

— А малайчына ты ў мяне, жонка, га? Анэта!

Яна па-дзявочы вылузвалася з ягоных нязграбных абнімкаў і сарамяжа адпіхала.

— Пусці,—гаварыла яна.—А калі-ж гэта я была нядобрая?

Дома ў святочныя дні яны адпачывалі і талкавалі пра драбніцы жыцця. Успаміналі мінулае, перабіралі самыя лепшыя часіны яго ўжо ў каторы раз. У такія часы Есіп іншы раз успамінаў пра Анэціны прочкі. Яна перабівала яго, пакорна тулячыся і ўлюблёна гледзячы ў вочы.

— Ну, пакінь. Мала што бывае,—гаварыла яна ўся гаручая, ласкавая, гладзячы гузік на ягонай кашулі.

III

Да іх часта пачала заходзіць Мар'я. Жыла яна кілометраў за тры, у суседнім сяле. Есіп заўсёды заставаў іх удвух, яны вечна пра нешто шапталіся, але калі паяўляўся Есіп, змаўкалі.—Бабскія сакрэты,—смяяўся Есіп,—на ўсім свеце бабы мабыць аднакія; у іх вечна будзе пра што гаварыць.

Анэта да таго здружылася з Мар'яю, што і сама пачала хадзіць да яе. Перш сяды-тады, адале бадай штосуботы пачала адведваць. Толькі надыдзе вечар, глядзіш, а яе ўжо і няма. Есіпу нават пачало непадабацца гэта. Ні хаты, ні гаспадаркі як след не дагледзіць, і бяжыць. Нават, бывае, не

парупіцца, ці ёсць што вячэраць.—І хапае ў яе толку блізкі свет поўначы швэндацца,—дакучліва думаў Есіп.

У гэты час неяк пачаліся непарадкі і ў калгасе. То жарабец здох, то пахварэлі каровы. Тыдзень з таму назад аж восьмера штук прапала на пашы. Абабэнчыла нечага, з дзень пахадзілі і дайшлі. Калгаснікі занепакоіліся. І самім страты, дый на людзях што пачнуць гаварыць. Гаспадары, скажуць, бач, дагаспадарыліся. Спахмурнелі калгаснікі. Спахмурнеў і Бенька. Ён нават пачаў заўважаць і ў сям'і нейкі розрух. Прыдзеш у хату, а—ні радасці ў ёй, як даўней, ні весялосці.—Што-ж, думаў ён, няшчасце ўсюды адзываецца, гэта як камень на вадзе: кінеш, а ад яго і паплылі кругі.

Але ў Анэцінай перамене Бенька пачуў нешта да трывогі знаёмае. Далёкаю зноў яна станавілася, чужою. Сама ў сабе пачала жыць, неяк затоена і маўкліва. Прыкметы гэтага старога пачыналі пужаць.

— Што гэта зноў ты, Анэта, пачала ад рук адбівацца?—запытаўся неяк аднойчы.

— Нічога не адбіваюся, якая была, такая і ёсць, —суха адказала яна.

— Такая, ды бо не такая. Нават рупеску ні правошта не маеш, усёадно як чужы сем'янін. Можа хіба злуешся за што, то ты проста і скажы.

— За што гэта мне злавацца?

— От і я-ж так думаю. Але-ж цябе проста не пазнаць.

— Яшчэ што выдумай.

А ўвечары Есіп палез на паліцу па тытун. Поркаючыся ў клубках ды скрутках крамніны, наткнуўся на нешта цвёрдае, выцягнуў, паглядзеў— евангелле.—„Адкуль гэта такая звярына паявілася?"—падумаў сам сабе.

— Гэта тваё евангелле?—запытаўся, калі ўвайшла Анэта.

— Маё.

— Дзе-ж ты яго ўзяла? Можа богу пачынаеш маліцца?—зарагатаў ён.

—Ну, а што там.

Есіп здзівіўся, што Анэта гаворыць сур'ёзна, і сам стаў сур'ёзным.

— Ты гэта ўпраўду?

— Упраўду.

Ён памаўчаў. Адале рэзка зірнуў на яе, нэшта прыпомніўшы.

— Дык гэта Мар'я? Гэта з таго ў вас і дружба такая пайшла?

— Не Мар'я, а я сама захацела.

— Чаго захацела?

— У евангелісты.

— Нават у евангелісты?!

Есіп аж устаў з услончыка. Ён не мог паверыць сам сабе. Прабаваў жартаваць, думаючы, што жартуе і Анэта, але жонка-такі не жартавала. Ён злаваўся, зноў адыходзіў, пераходзячы на просьбу Што ёй убілася ў галаву? Яна-ж не маленькая і не дурная, каб верыць у такую лухту? Дый брыд-

ка-ж перад людзьмі! Мала таго, што самой нельга будзе паказацца на вочы, дык і яго-ж засмяюць.

З гэтага дня Есіп хадзіў як прыглушаны. І ўсё не верылася, што можа быць праўда. І брыдка стала і крыўдна. Як-жа гэта ў яго так здарылася? І хто мог падумаць, што Анэта так зробіць? Каб хто, а то Анэта! Дый людзі-ж затыкаюць пальцамі—на ўвесь калгас сораму нарабіў. Нішто скажуць, комуніст, жонку як выгадаваў... Але Анэта не можа верыць у гэта сур'ёзна. Тут нешта другое. Тут разгадаць трэба... Прапала жанчына. І такая жанчына—хто-б сказаў? Сам дзівіўся і з кемкасці, і з розуму, і хараство якое мела, а от—глядзі ты!..

Што ні рабіў Есіп, а Анэта стаяла на сваім. Зноў нібы пустэльня зрабілася хата. У яе аж не хацелася ісці. Ні гаворкі, ні цеплыні, ні прывету. Просьбы і ўгаворы не памагалі. Ён пробаваў цэлымі днямі маўчаць. Думаў, што ўспомніць, як некалі жылі, спужаецца і адумаецца. І самому страшна было гэтага, і Анэты шкода было—гэта-ж такое было пачалося жыццё...

IV

Аднойчы ён быў адлучыўся на дзён колькі ў суседні калгас. Варочаўся дахаты і думаў, што от за гэты час, без яго, Анэта ўсё перадумала і цяпер сустрэне яго па-даўнейшаму, так, як-бы нічога і не было. Зарадуецца, падбяжыць, загарыцца сваімі іскрыстымі вачыма, просячы імі не ўспамінаць пра

старое. Усё забудзецца. І толькі пасля ўжо ён калі-небудзь мелькам успомніць пра гэта. Яна зноў будзе туліцца, перабіваючы яго:

— Ну, пакінь. Мала што бывае.

З гэтакімі думкамі Есіп падыходзіў да хаты. Дзверы ў сенцы былі адчынены і ён увайшоў без ніякага скрыпу. Хата таксама неасцярожна прачынена. Есіп узяўся за клямку дзвярэй, але адтуль пачуліся галасы, і ён суняўся. У адным з іх Есіп пазнаў Мар'ю. Яму хацелася ўскочыць і вышвырнуць гэтую нягодніцу. Ён ужо памкнуўся адчыніць дзверы, але зноў пачуліся галасы, і ён прыслухаўся. Рука на клямцы застыла, баючыся скрануцца. Мар'ін голас то павышаўся, то сцішаўся да ледзь чутнага шэпту. Есіп стаіўся, яму хацелася пачуць хоць колькі слоў. Раптам ён скамянеў, увесь, пераходзячы ў слых. Праз хвіліну ён выскачыў з сянец. Ён-такі пачуў гэтыя некалькі слоў, і нават не толькі пачуў, а разабраў жахлівы сэнс іх. Перад ім раптам стала Анэта, уся разгаданая. Зразумелаю стала і яе маўклівасць, і перамены да яго, і дружба з Мар'яю, і падзеж у калгасе. На хвіліну ён ашаламіўся. Усведамленне адмаўлялася асэнсаваць гэтую страшную нечаканасць. Ён расшпіліў каўнер кашулі. Гладзячы нервова шыю, рука наткнулася на рубец. І раптам у памяці пранеслася цэлая вераніца ўспамінаў: польскі фронт, яшчэ чатыры раны, пакутлівае каханне, уцёкі, разлука. Ён упершыню пачынаў цвяроза і ясна бачыць сваё жыццё. І тут-жа ўспомніўся

сакратар парт'ячэйкі Палер. Бенька таропка закрочыў па вуліцы. Ён цяпер бадай нічога не думаў, але цвёрда ведаў, што яму трэба ўбачыць Палера як мага скарэй.

Палер сустрэў Есіпа радасна.

— Вярнуўся?

— Вярнуўся.

— Ну, і добра, а то...

— Пачакай—нецярпліва перабіў Бенька.

— Чаго пачакай?

— Евангелісты... Мы і не ведалі. Цяпер атруціць хочуць сілас... У нас усё гэта рабіла Анэта...

V

Бенька закурыў папяросу. Я больш нічога не распытваў. Нейкі час у хаце панавала цішыня датаго аднатонная і цягучая, што нават чуцён быў яе несканчоны танюсенькі звон. За акном плыла ноч і пачаў узыходзіць месяц.

— Ну, іх і судзілі,—выпусціў Бенька сінюю плойку дыму.—Усіх судзілі, і выслалі. З таго часу я от так і жыву. Цяжка жыць аднаму, але што-ж ты зробіш. І нудна. Пустата нейкая вялікая аднаму. Нават па целе нуда гудзе.

Бенька пайшоў слаць пасцелі, а я задумаўся. Перада мною выплыў вобраз Анэты з майго дзяцінства. Я быў тады хлопчыкам, а яна ўжо дарослаю дзяўчынаю. Пра яе наўкруга гаварылі. З далёкіх сёл знакамітыя хлопцы прыязджалі ў сваты. Яна была шляхцянка, і гэта давала ёй права тры-

мацца ганарова. Яна ведала, што на ўсёй аколіцы няма прыгажэй за яе дзяўчыны. Я памятаю яе быстрыя чорныя вочы і дзве высокія тонкія дугі броў. Яна чартоўскі хораша ўмела смяяцца. Здавалася, што з воч у яе падалі тады чорныя іскры, і яны пырскаліся і пякліся. Аднойчы я купаўся ў плёсе заросшае рэчкі. Аднекуль прышла Анэта. Яна азірнулася, ці нікога няма, і пачала раздзявацца. На мяне яна не хацела і зірнуць. У вадзе яна прысядала і пляскалася наўкруга рукамі. Я перастаў боўтацца і заціх, гледзячы на Анэту. Мне запала ў памяць ружовае, мяккае і нейкае празрыстае яе цела. Я ўпершыню тады бачыў жаночыя грудзі, такія высокія і тугія. На жываце ў яе ляжала халодная складка, і гэтая складка глыбока ўрэзвалася, калі ўжо на беразе яна нагіналася па кашулю.

Бенька пазнаўся з ёю на сенажаці ў касавіцу. Перш яны спатыкаліся нясмела і рэдка. Яна саромілася бачыцца з Есіпам на людзях. Бенька пачаў рабіць гэта ўпотай. Ён ехаў знарок на начлег, адлучаўся непрыкметна ад хлопцаў і ішоў цераз поле ў засценак. Варочаўся ён на золку разбіты, нявыспаны, але поўны сваім затоеным шчасцем. Гэтак мучыла Беньку Анэта гадоў са тры. Ён быў просты мужык, і гэта ляжала між іх, як прорва. І пажаніліся яны толькі тады, калі ён вярнуўся з фронта, паранены, але ўсюду вядомы—з ордэнам Чырвонага сцяга. Анэта цяпер ужо ім не грэбала.

Гэта ўсё мне ўспомнілася, калі я згадаў пра

Анэту. Я зноў уявіў яе ў дзяцінстве і мне здалося цяпер, што і тады, калі я бачыў яе на беразе—у далікатным і празрыстым яе целе я бачыў, як танюсенькімі звілінамі сачылася кроў. Глухая засмяглая кроў атруты. І я падумаў, як цяжка чалавеку ажывіць сваю кроў.

Бенька паслаў пасцелі, і мы патушылі агонь. Я ляжаў пад акном, на тапчане. За печчу свістаў цвыркун. Месяцава святло бледна клалася на падлозе, вырысоўваючы ценямі рамы акна. У гэтым святле я бачыў Есіпаў ложак і коўдру, што краем звісала на падлогу. Я бачыў, як Есіп доўга варочаўся і ўздыхаў, і не мог заснуць.

— А кахаў-жа я яе, нягодніцу, як!—урэшце азваўся ён, нібы хочучы адагнаць нейкую неадчэпную думку.—На руках, здавалася, насіў, і от вынасіў—гадзюку. Аж успамінаць брыдка перад людзьмі. І добра што расквітаўся ўпору, цяпер у мяне хоць яснасць ёсць, нібы выкінуў з сябе кавалак гнілога мяса,—дакончыў ён.

Зноў засвістаў за печчу цвыркун. За акном спакойна і шырока драмала ноч. Месяц плыў, перабягаючы з хмаркі ў хмарку, то хаваючыся, то зноў выблісквачы. За сялом, цмяна адсвечваючыся, высілася макаўка сілоснае вежы і чотка ўрэзваліся ў неба недакрытыя кроквы гумна.

Бенька ўжо спаў. А я доўга глядзеў у гэтую сінюю ноч і думаў. Я думаў пра шырокую чалавечую любоў і нянавісць, пра жорсткія і непадкупныя законы жыцця, пра законы класавае барацьбы.

Менск. Красавік—лістапад, 1933.

Зноў па дарозе

1

— Ну, што прыпамінаеш?—гаворыць ён, усё яшчэ трымаючы маю руку ў сваёй.—Не пазнаеш? А памятаеш, як два гады таму назад мы ехалі з Ульянаю—вы мяне з Грэска тады падвезлі. Цяпер памятаеш? Ну, от бач—гэта той самы я і ёсць. Перамяніўся? Ну, што-ж, усе старэем. Толькі ўсё-ж такі дужэем, не горбімся. Не хочам. А ты ўсё ездзіш? Ну, і ладна—смалі. Толькі-ж да мяне не забудзься завярнуць. Вунь там я жыву, бачыш?—за ўзгоркам хаты. Ага. Ну от гэта наша і гняздо. Глядзі-ж, не забудзься даведацца.

І яшчэ раз паціснуўшы руку, ён пакрочыў у бок дарогі так, як тады, шырока ступаючы нагамі.

Гарасім шлёгнуў кабылу і калёсы рвануліся, затарабаніўшы лёскатам. Дарога сухая, пыліцца, і, выгінаючыся, недзе прападае наперадзе. Паўз дарогу спеюць жыты, і наводшыбе, стаўшы на ўзгорку, не дамахнуўшы аднойчы крылом, застыў

вятрак. За ім далёка відаць, як у нізе пайшлі паплавы. Наперадзе лес, ён краем загнуў леваруч, і туды-ж занырцала невялікая дарожка. Туды толькі што пайшоў чалавек. Я гляджу, як ён аддаляецца, то паказваючыся, то хаваючыся зноў за кустамі. Вось ён загнуў ужо на сцежку да будынкаў.

— Абавязкова заеду,—паўтараю я сам сабе ўголас сказанае на развіт, і чую яшчэ ў сваёй далоні цвёрды след яго рукі. Я нават бачу як ён смяецца мне вышчарбленым зубам і толькі цяпер пачынаю разглядаць яго твар. Але, ён пастарэў. Неяк пацвярдзелі, пабольшалі скіўіцы і глыбей яшчэ селі вочы. Лоб падаўся наперад і бровы навіслі гусцей. На ўсім абліччы відна нейкая новая, разумная сталасць, такая, калі чалавек багата пабачыў жыцця. Нават гарэзнасць і тая паскупела, яшчэ больш падкрэсліваючы гэтую сталасць. Але ўсё-ж такі гэта той самы Дубік, якога тады я яшчэ нават не ведаў і прозвішча.

— Но-о!—абрывае марыва Гарасім і пасіверанымі пальцамі вырывае кавалак газеціны на цыгарку Ён прывязаў лейцы за біла і згорбіўся над шабэтаю, дастаючы тытун, і паволі, каб не расцярусіць, насыпае яго ў папяросу. Адале неўзабаве паявіўся дымок і, выпускаючы яго, Гарасім адкідаецца ў перадок на сядзенне ўсімі плячыма.

— Ну, што-ж, от і па-новаму мы жыць пробуем, толькі кадук яго ведае, як яно будзе,—пачынае Гарасім, відаць даўно ўжо збіраючыся загаварыць.

— А што, хіба непарадкі якія?—пытаюся я, стараючыся зразумець, пра што хоча сказаць Гарасім.

Ён перш маўчыць, адале доўга здзімае за біла попел з цыгаркі і тады толькі адказвае.

— І парадкі, і непарадкі—усё разам.

— Як гэта?

— Ды так—неразумеем мы яшчэ багата чаго, от што.

— Ну, гэта набудзецца. Кажуць-жа: і лапця не спляцеш, не ўмеючы. Абы захацець.

— Ды так яно, але-ж...

Ён канчае гаворку махам рукі і глыбока зацягваецца дымам. Адале выцягвае з-пад сябе саломіну і пачынае доўга яе шчыкаць. Я гляджу на Гарасіма і таксама маўчу. Ён нешта-такі хоча сказаць. Ну, і няхай памаўчыць, а раз яму рупіць, то не ўтрывае, і тады адразу раскажа ясней. Няхай нагарыць у самога, бо так, калі дапытвацца—чалавек заўсёды не гаварыцьме проста.

Па лесе калёсы пайшлі павальней, трасучы па карэннях. На глыбокіх каляінах яны западаюць і гойдаюць, як у калысцы. Падыхае здаровым пахам смалы і цёплае вільгаці. Сонца, прарываючыся ў шчыліну дарогі, кладзецца на доле густымі мазкамі. На розныя галасы недзе ў лістоце цвыркаюць птушкі. Гарасім доўга, забыўшыся, паскубвае густую шэрсць барады, зрэдку нокаючы на кабылу.

— Дык я от і кажу, што не разумею я гэтага,—

абуджваецца ён ужо толькі тады, калі лес пачынае радзець.—От ніяк не магу раскусіць.

— Чаго?

— Ды жыцця нашага. Мудра пайшло яно. Ні сяк, ні так людзі жывуць. Няхай-бы ўжо ўсе аднакава, а то: адзін—калгас, другі—некалгас, і невядома, на чым яно стане. Ну, і разброд у людзей. Жывуць так, дачасу, абы пераж ыць. А па-мойму ўжо, раз калгас, дык трэба, каб усе. Каб не перабіваліся адзін аднаму пад нагамі. От тады і толк быў-бы.

Я стараюся загаварыць з Гарасімам так, каб мы адзін аднаго зразумелі, але ён перабівае.

— Ат, талкаваць гэтак здолее кожны. А нам не талкаваць, а жыць трэба. А што гэта за жыццё, калі ты не ведаеш нават—гаспадар ты ці не гаспадар. Я-ж кажу—аддалі-б ужо загад такі, Сталін, ці хто там, што ўсім падавацца ў калгасы, тады кожны і ведаў-бы, што ён ужо жыць будзе гэтак і нікуды ў бок не глядзеў-бы. Ато—от кругом паглядзець—адзін розрух. То будуецца, то раскідаецца. Такая каламуць, што нямаведама дзе ты жывеш. Так і мадзееш, абы дзень перабыць. І ніхто ні пра вошта не дбае, бо няма веры ў чалавека ў што-небудзь адно.

Гарасім сплюнуў праз зубы за біла і злосна тузануў кабылу. Тая рванулася, і калёсы зноў затарабанілі па роўнай, гладкай дарозе. Канчаўся лес і зноў пачыналі палі, далёка забягаючы жаўтаватым морам жытоў, гонячы недзе ў бяскон-

цасць шырокія, павольныя хвалі. Сям-там паміж іх відны адзінотныя, яшчэ старасвецкія, дзічкі. Вунь там, пад узгорак, садамі засланілася сяло. А там—ледзь відно—між жытоў паволі едзе хурманка, гэта мабыць тудэю загнула дарога. І над усім гэтым неабсяжная, як толькі можна акінуць вокам—празрыстая, лёгкая летняя сінь. Эх, як шырока, аднак, можна дыхаць, так от жытнёвымі хвалямі плысці, і каб усюды багатымі сокамі пахла зямля! Не, шчаслівы ты чалавек, калі можаш, от так от, шырока, над усім гэтым стоячы, жыць!

— Ураджай сёлета—у-у-у!—гаворыць Гарасім, як-бы пераймаючы маю думку,—адна радасць. Калгасаўскае... Толькі нямаведама, як прыбярэцца, можа гэтак як летась,—канчае ён праз паузу, глушэйшым голасам.

Я рагачу з Гарасіма, пазнаючы ў ім адразу ўсю душу—дваістую, хворую, але шырокую, размашыстую, як гэтая прастора.

— А рад, нябось, дзядзька Гарасім, за ўраджай, хоць не ведаеш, гаспадар ты над ім ці не?

— Ну, мала што—кроў,—гаворыць ён, гладзячы вус, і я бачу, што гэтым ён хоча прыкрыць усмешку.—Гэта ўсёроўна як кроў свая. Бачыш, што карысці многа—і радуешся.

— А чаму ты з калгаса вышаў, дзядзька Гарасім?—пытаюся я.

Гарасім не адразу адказвае. Ён гэтак-жа сама, як некалі Ульяна, нечага доўга шукае ў сабе—

тузаецца, не можа знайсці слоў. Адале гаворыць, зноў-жа такі глуха.

— А думаеш я сам ведаю дзе я—я і там і не там. Вышаў, бо шчымела ў сэрцы, што па-сапраўднаму жыць хацелася. А гэта глядзіш—зноў ні на месцы, усёадно як сам сабе чужы. Ды гэтак і шмат хто, нават з тых, што і ў калгасы папісаны. Так от ад гэтага і дбальства нямашака. От я і кажу, што горш за ўсё месца свайго не ведаць, чужым быць.

І Гарасім зноў расказвае пра тое, як цяжка зразумець жыццё. Мудрае яно стала, і ніяк за яго не ўчапіцца, не дагнаць так, каб асіліць. Усюды ўсё—трашчыць, перайначваецца, так, як перашываюць нанава апрануху. Тырчаць старыя рубцы, і не зразумець, дзе пойдуць новыя. І толькі тады зразумееш што да чаго, калі можна будзе прымераць. І добра хто ўжо гэтую апрануху прымераў—ён ведае, што яна пашыта на яго. От узяць хоць-бы Дубік. Яму хоць-бы што—ён заўсёды аднакі. Дый усе яны, хто з даўнейшых, што тады адразу з ім згуртаваліся. Дый то—гэта даўняя дружба. Прышлі на карчы, на імшары, колькі поту, пакуты разам паклалі, пакуль разрабілі, дык дзе ты цяпер пакінеш, гэта ўжо ўсё адно, як сваё. Яны глядзяць у адно—ім няма куды варочацца. І не было. А тут—як ні як, а свая гаспадарка. Ды яшчэ і прырэзка была прыпала. Думалася, што можна было-б і... Ну, от так і стаіш, не ведаючы, якою нагою ступіць, так от і блудзіш.

А ўрэшце,—кадук яго ведае,—каб гэта ўжо пэўна на важыў...

Я слухаю Гарасіма і толькі цяпер заўважаю, што ён гаворыць сам з сабою. Утаропіўся недзе ў лёсткі і шавеліць губамі, нават не заўважаючы, што кабыла сама завярнула на шашу.

— Думай, Гарасім,—гавару я таксама сам сабе, і паволі падбіраю неўзаметку выпушчаныя ім з рук лейцы.

II

Ёсць нешта прыемнае, калі пазнаеш забытыя мясціны. Вось едзеш—перад табою ўваскрасае знаёмае. Мінаюцца сялібы, палеткі, лясы. Прыглядаешся наўкруга, перабіраючы памяць. Хочацца што-небудзь прыпомніць, пазнаць, паглядзець, як яно павыростала. Глядзіш і не ведаеш—ці то памяць падводзіць, ці то так багата чаго пайначала. Перад табою праходзіць даўнейшчына. Вот цягнецца Кацярынінская шаша—Масква—Парыж, выезджаным каменнем бялеючы да гарызонта. Некалі ляжала яна праз лясы, як праз тунелі. Пасля, у вайну, лясы пачыналі высякаць. Збежанцы, уцякаючы з радзімы, наабапал яе пакідалі могілкі, ставячы на іх белыя бярозавыя крыжы. Ні лясоў, ні крыжоў цяпер няма. Сям-там—праязджаючы вёрсты—пападаюцца старасвецкія раскарачыстыя, з дуплямі ды з падсмаленымі бакамі кляны ды дубы, пасаджаныя яшчэ ў Кацярыніну бытнасць. Вунь там, каля рэчкі, таксама быў некалі лес.

Далёка цягнулася паўз яго балота, заросшы лазою. Тады на ўзгорку стаяла адна сіратлівая палясоўшчыкава хатка, і мне, памятаю, заўсёды здавалася, што яму аднаму тут мабыць страшна жыць. Я гляджу цяпер, як гэтае выцерабленае балота лягло далёка роўным галам сенажаці. Я нават шукаю старое палясоўшчыкавае хаткі і думаю, што яе мабыць перанеслі вунь у тое сяло, што разраслося за рэчкаю. А вунь там, памятаю, стаяла капліца, а гэта тудэю пайшла селавая дарога, і толькі збоку валяецца пара вятрамі павысушваных камянёў. А от зноў сяло, новае, яшчэ нават з непаканчанымі будынкамі. Валяюцца шулы, пад сцены пакладзены жэрдкі. На прыгуменнях яшчэ нават не пазгладжвалася куп'ё. І от, так, от, кругом— нават цяжка пазнаць. Незнаёмыя ландшафты з палеткамі, з сёламі, з пералескамі. У памяці няма іх. Як-бы нехта аднойчы ўзяў ды як на карце і пераставіў. І яшчэ нават не скончыў гэтае свае перастаноўкі, бо кругом паасталіся сляды непрыбраных бярвенняў, недакончаных стрэх, лініі новых дарог ды дзялянак.

Ці не гэта розрухам называў Гарасім?

Я сам сабе думаю і пачынаю ўспамінаць. Летась я таксама ездзіў сюдэю. Была восень. Хмары па небе сунуліся густа і нізка. Нават здавалася, што ім цяжка было ісці ў сваю вялікую дарогу і яны слязліва аплывалі дажджамі. Тады былі гразкія, глеістыя дарогі, і Гарасім раз-по-раз нокаў на кабылу.

Паўз нас паплавамі ляжала сенажаць. Часта дзе яна была скошана, і пракосы ляжалі—забытыя, пачарнелыя, паўплесканыя дажджамі ў траву. Праз іх пачынала была праростаць атава, але таксама зачахла, парыжэўшы ад халадоў. Над паплавамі цягнулася волкасць—густая, слязлівая—і пракосы далёка чарнелі, астаючыся забытымі, зімаваць.

Адале пачыналася поле і восеньскаю вільгаццю пахла зямля. Сям-там пападаліся шырокія загоны з недавыаранаю бульбаю—таксама забытыя. Дзені-дзе відно было яшчэ каліва бульбоўніку, збутлае, паваленае на зямлю і ўплесканае конскімі капытамі.

Тады мы ехалі моўчкі, гойдаючыся ў каляінах, і на калёсы цягучым глеем накручвалася гразь. Адзінотныя, забытыя загоны міналіся паволі, нехаця і, здавалася, яны скардзіліся на тое, што іх пакідалі ў полі адных, на марозы. І тады-ж Гарасім сказаў:

— Нават праца свая прападае. Блудзяць людзі. Ніякае дбайнасці няма.

От мне і падумалася, што і цяпер, гаворачы пра нядбайнасць і розрух, ён усё яшчэ бачыць леташнюю восень.

III

Праз пару тыдняў я заехаў да Дубіка. Ён сустрэў мяне, седзячы на лаве і дапіваючы чай, з забінтованаю і падвязанаю на марлі рукою. На маё запытанне пра ваду, ён не адказаў, а загава-

рыў пра нешта іншае. Тады я заўважыў, што і на ілбе ў яго з боку чырванеў яшчэ кагадзе загоены шрам.

— Ат, глупства адно,—зноў ухіліўся ён ад запытання, надзяючы шапку.—Ну ты адпачні, ці пагуляй сабе, а я пайду. Увечары паталкуем.

— Нават і гаварыць саромяецца. Здуру от такую цацку набыў,—гаворыць жонка, прыбіраючы са стала.

Адале яна расказвае, што цяпер пачалі паказвацца ваўкі. Мабыць гэта пачапалі іхныя гнёзды, асвойтваючы лясы. Ну, дык да коней сталі наведвацца. Надоечы перад самым досветам жарабя задушылі. От ён аднае раніцы і пайшоў са стрэльбаю да начлежнікаў. Тыя і самі ўжо сцерагліся, але яму карцела праведаць самому. Ну, а назад ідучы і здарылася гэта вада. Сустрэўся з нейкім ці што, ды мабыць мацнавата грукнуў, ставячы стрэльбу. Ці мо' знячэўку як зачапіў за што. Дык так от праз гэта траха і калекаю не астаўся. Далонь ушчэнт пашчапаў, тры пальцы, кажа, валодаць не будуць.

Пагаварыўшы яшчэ крыху, я выходжу на двор Добрае, летняе сонца прыпякае як мае быць. З агародаў пахне рамонкамі. Ад грушы на паркане кладзецца цень, і ў ім, стуліўшы морду на лапы, дрэмле сабака.

На прыгуменні відаць, як з мужчынамі яшчэ гаворыць Дубік. Яны талкуюць мабыць пра работу,

адале чалавек колькі з косамі ідуць за гумны, і Дубік адтуль крычыць мне.

— Пагуляй, пагуляй! Пахадзі, паглядзі нашага жыцця.

Тыя, што асталіся на прыгуменні, запрагаюць у трое калёс коні. Яны збіраюцца ехаць па вецце, каб пападсцілаць пад сена тарпы.

— Ну, як пажываецца?.. У харошую пагоду да нас даведаліся—мурагі косім. Любата!—гаворыць да мяне хлопец, уводзячы каня ў аглоблі.

— Цяпер у горадзе нядобра—духата, пыл,—практыкоўна заўважае другі, з барадою.

— Мо' хіба нуднавата толькі будзе.

— Як там, скажыце,—паджылы невялікі чалавек паказваецца з гумна і, згортваючы вяроўку, падыходзіць да нас,—як там, вы-ж лепш ведаеце палітыку гэту, з вайною, скажыце, нічога не чуваць?

— Яму гэта, каб ведаць, ці супадзе з евангеллем. Ён-жа ў нас за прарока,—абзываецца той самы, што запрагае каня.

— Але, а то ён вылічвае, вылічвае, ды ўсё нешта і не выходзіць. На каторы там месяц у цябе прыпадае яна, дзядзька Антось?—жартуе яшчэ нехта.

Дзядзька Антось пробуе аскірзнуцца, але тыя заядла жартуюць, і ён, махнуўшы рукою і не дагаварыўшы, зноў варочаецца да гумна. Ён нават як-бы нечага шукае там, але, так толькі патупаўшы, кладзе ў драбіны вяроўку і падбірае лейцы.

— Ны, пайшла... Смейцеся сабе. Што вы скажаце адно, як гэтыя сорак два месяцы пройдуць. Як тады адно парагочаце,—канчае ён сам сабе, ужо заязджаючы за вароты. Неўзабаве і ўсе хурманкі хаваюцца за гумнамі, але і адтуль яшчэ чутны галасы, што пакепваюць і з дзядзькі Антося і з ягонае евангельскае мудрасці.

Аглядзеўшы будоўлю, сыраварню, бровар, я выходжу на поле. Між жытоў падымаецца дарога на ўзгорак. Узышоўшы туды, я гляджу наўкруга. Жыты плывуць спакойнымі хвалямі і звоняць. За імі, паўз лес, пачынаюцца сенажаці. Мне відаць, як там гуртам косяць касцы. Сяды-тады чутно як звоняць ад мянташак іхныя косы і на сонцы паблісквацць. Па дарозе едзе хурманка ў сяло. Я бачу, як адным сваім краем сяло ўдаецца ў жыты. Другі канец яго ападае ў нізіну, а там—за мосцікам, што гарбом перакінуўся праз ручаіну—пасёлак. Гэта той самы пасёлак, што відзён быў тады, калі мы ехалі з Ульянаю. Тады ён толькі яшчэ будаваўся і далёка відзён быў новымі гонтамі. І тады наўкруга яшчэ былі кусты ды карчы ад расцярэбленага лесу. Гэта было першае гняздо, дзе аселі людзі, прышоўшы хто адкуль, і, аглядзеўшы зямлю, пачыналі асвойтваць яе. Тады селавікі нядружна ставіліся да новых суседзей. Адале, калі з года ў год новыя людзі ўсталёўваліся і іхная гаспадарка пачынала віднець і будынкамі, і ўраджаем, і каровамі, што пасвіліся за нізінаю — праз ручаёк неўзаметку перакінуўся

мосцік. Пасля зрэдку адзін да аднаго заходзілі гуляць. З калгасаўцаў пачыналі смяяцца ўсё менш і менш, і, аднойчы, некалькі селавікоў нават падалося да іх. З гэтага часу і пачало сяло жыць неспакоем. Арганізоўвалі свой калгас, выходзілі з яго, зноў арганізоўвалі і, урэшце, наважылі злучыцца ў адно. У калгас падаваліся памалу, падумаўшы, адзін за адным, і нават да гэтага часу некалькі селавікоў з гэтага канца яшчэ не адважыліся. Праўда, яны ўжо не сварацца, не вераць, калі хто яшчэ падбухторвае ды падсмейваецца, як некалі, і ўсё часцей і часцей заходзяць да калгасаўцаў і да Дубіка пагуляць. Нудна ім мабыць адным, без гурту. Вунь і адсюль, за касцамі, я нават бачу іхныя сенажаці. Сям-там і на іх матляецца з касою чалавек. Толькі ўпарта не падаюцца шнуры. І як доўга, мабыць, цягнецца дзень, калі так от марудна ды скупа кладуцца пракосы...

Я сыходжу з узгорку па дарожцы, што вядзе ў сенажаці. Пад нагамі на ўзмежку мякка падаецца трава. Высокі падарожнік б'е па каленях. За рукі чапляюцца нахіленыя над дарогаю каласы. З жытоў падымаюцца жаўранкі і, недзе ўгары, пад сонцам, заліваюцца так, што здаецца гэта спявае само паветра.

Не, ты-такі харошая, мая радзіма—новая, свежая, звонкая, як маладосць. Добра, што сустракаеш ты мяне заўсёды па-інакшаму—не пазнаць цябе!—і нядобра, што Гарасім заве тваю гарэзнасць ды бунтоўнасць розрухам. Але ён такі зра-

зумее, што ў гэтым розрусе пачынаецца твая новая радасць!

— Куды гэта вы так задумаліся? — пытаецца раптам жаночы голас.

Я падымаю голаў і бачу, як з граблямі на плячах да мяне падыходзіць Ганна. Прыжмуранымі ад сонца вачыма яна ўсміхаецца і пра нешта гаворыць.

— Любата ў вас,—кажу я, пераймаючы яе гаворку.

— Дык прыходзьце да нас грэбці сена.

— Далёка?

— На ляды.

— Дык я і цяпер магу пайсці,—кажу я.

— Ну і добра.

І мы ідзем разам з Ганнаю, падмінаючы падатлівую траву і наганяючы грабцоў, ад якіх яна асталася.

IV

Увечары Дубік варочаецца позна. На ім відна дзеняшняя стомленасць, але, толькі ўспеўшы скінуць шапку і паправіць хворую руку, ён садзіцца каля мяне.

— Ну, як-жа пажываеш, кажы. Агледзеў трохі нашу рэспубліку? На бровары быў? На сыраварню заходзіў? Бачыў, як мы цагельню пачынаем будаваць? Ну, як? Трохі варушымся? Ды я і сам бачу, што незадарма пражыў. Багата здароўя пакласці давялося, але рад. На голае месца селі, здавалася,

на пагібель прышлі, а от вылюдзелі. Памятаеш, як я табе казаў, што некаторыя нават паўцякалі? А што пасля яшчэ было? Як пачалі з сялом арганізоўвацца? У-у, колькі пярэтрусу перажылі. Перш бадай усё сяло было арганізавалася, адале траха не ўгробілі і ўсяго калгаса. Ды ты сам ведаеш і гэтыя войны і хто іх рабіў. І от трэба было проста не спаць, а быць скрозь напагатове, каб трымаць лейцы. У-у, было! А гэта, як перажылося, дык нават і не верыцца. Праўда, ёсць крыху ябеды яшчэ і цяпер, але што гэта ўжо значыць. У нашай справе галоўнае—чалавек. І от важна, што людзі павыросталі. Пакуты багата паклалі, а гэта знітоўвае. І калі пападзецца яшчэ і цяпер, як кажуць, малавер, які, дык ён проста ўсмоктваецца. Праз колькі часу і не пазнаць будзе яго, сам не заўважыць як пераробіцца. От ходзяць у нас яшчэ чалавек колькі аднаасобна, дык, яй-богу, я ведаю, што іх ужо нудзіць. Ім толькі маргнуць цяпер, дык адразу прыдуць. Але няхай выходжваюцца—мацнейшымі пасля будуць. Самі няхай вырашаць, дык пасля ні віляць, ні наракаць не будуць. Я табе кажу. Я ўжо ведаю.

Дубік дастае закурыць, але адною рукою цяжка скруціць папяросу, і я яму памагаю.

— Ну, але добра, што цяпер моцна стаімо,— гаворыць ён зноў.—Я-ж кажу, што галоўнае, што мы дружнымі цяпер сталі. А гэта, брат, вялікая радасць. Так і знай, што гаспадарка на мацунак адразу пойдзе. Сталеем. Сілы яшчэ багата ёсць,

і я табе кажу, што ні гэта мы яшчэ зробім. Быць не можа, каб узорна гаспадаркі не паставілі. А? Пабачыш.

Дубік падымаецца і, папраўляючы руку, пачынае хадзіць. Ён часта зацягваецца і пачынае расказваць ужо сваю будучыню. У-у, як многа яшчэ работы—і каля зямлі, і каля будынкаў, і з самымі людзьмі. Важна, каб у норму ўвайшоў новы побыт. Каб чалавек знайшоў сваю сталасць. Год за годам гэта набудзецца... Яму-б хацелася з'ездзіць дзе-небудзь на экскурсію. У „Гігант" які ці што. Каб паглядзець, ды мо' што пераняць. Добра, што пачынаюць падымацца ўраджаі. А яшчэ-ж калі ўсю зямлю абрабіць як след. На днях яны абмяркоўвалі з калгасаўцамі свой план. Яны там мяркуюць...

Дубік расказвае запальчыва, горача, так, як-бы гэты заўтрашні дзень ён ужо бачыў перад сабою. Я пазнаю яго, гэтага няўтомнага энтузіяста, якога бачыў два гады назад, калі яны яшчэ кагадзе пачыналі жыць. Ён і тады от так-жа гарэў сваім заўтрашнім днём, і верыў. Тады нават і Ульяна не магла не паверыць яму і, я памятаю, як, сплюшчыўшы сіняватыя азяркі воч, яна пазнавала сябе. Тады і ў яе пачынала народжвацца радасць і за гэтую радасць мне хацелася яе расцалаваць.

— От так, брат, і будам памаленьку ступаць,— канчае ён, пагладжваючы хворую руку.—А цяпер давай пра што другое. Як ты там, што ў вас, у горадзе?

Неўзабаве як мае быць змяркае. Праз адчыненае акно цягне здароваю свежасцю вечара. На неба навалакаюцца хмаркі і месяц сяды-тады кладзе на падлозе бледныя цені.. Відно было, як у хату ўвайшла Ганна, і неўзабаве вышла, доўга трымаючыся за клямку перад тым, як адчыніць дзверы. На вуліцы пачынаюць гусцець галасы. Каля прызбы збіраюцца папрастарэкаваць мужчыны, і мы выходзім да іх.

Тут я пазнаю і хлопцаў, што на прыгуменні запрагалі коні, і Антося, і Дубікаву жонку, і Гарасіма, і яшчэ колькі чалавек. Малодшыя жартуюць з дзяўчатамі, а старэйшыя талкуюць пра будзёнасць. Нехта гаворыць пра кантрактацыю сена і Дубік умешваецца ў гаворку. Адале нехта пытаецца, ці варта за Галамі скідаць стагі. Пасля пачынаецца пра жніво, пра нарыхтоўкі і пра тое, што гарычаўцам мабыць і сёлета давядзецца пазычаць малатарні.

— Ды свайго колькі там будзе—ураз памалоцім.

— Ого, ты можа яшчэ скажаш, што і малаціць няма чаго?

— І пажном і памалоцім, але...

— Чаго там але?

— Адна рызыка. Усёадно, калі-б чаго захацеў, то і купіць няма дзе.

— Чаго-ж гэта ты так накупляў-бы?

— Мала чаго трэба? Але-ж дайшлі да таго, што так от і бота нідзе не дастанеш.

— Уг-га, аббасячаў.

— Кінь ты нэндзіцца, Кандрат. Вечна ты от так ныеш. Абы плявузгаць нямаведама што.

Той, каго назвалі Кандратам, не падаецца. Што там плявузгаць нямаведама што? А што, гэта няпраўда? Калі гэта было, каб так нават на ногі не мець права агораць?

— Неразумнае ты пачаў ужо,—чуцён новы голас і па ім я пазнаю Гарасіма.—Мабыць няма чаго табе ўжо і гаварыць, што ты на гэтым мудруеш. Хіба забыўся, што не панам быў? Калі-ж гэта ты меў больш? Ды я-ж ведаю, што мо' і жаніўся ў пазычоных, а цяпер колькі пар маеш? І за крата прэмію палучыў, і за нарыхтоўку, і з кааперацыі ўзяў. А енчыш. Або хіба забыўся, як некалі дзеці ў школу ў атопках хадзілі? Многа тады ў чаравіках было? А цяпер-жа яны, богу дзякаваць, усе надзеты. І твае і чужыя, і сам ты. Але от ненажэрлівымі людзі пасталі. Вечна ім мала. Абы звягаць.

Гарасім сплёўвае і доўга затоптвае папяросу.

— От і брыдка мне за цябе, Кандрат. І бачыш, не я з табою спрачаўся, а Гарасім,—гаворыць Дубік, і ўсе неяк трохі сціхаюць.

Цемрыва на вуліцы кладзецца ўсё гусцей. Чалавек колькі ўжо разышлося па хатах. Чутно, як пазвоньваюць цуглі, і недзе за суседнім дваром пераклікаюцца галасы. Гэта збіраюцца начлежнікі.

Неўзабаве на вуліцы пырхаюць коні і, грукаючы капытамі, аддаляюцца за сяло.

Ноч дрэмле, і па хатах адзін за адным патухаюць агні. Гаворка пачынае радзець і становіцца

куды спакайней. Непадалёку яшчэ гуляе маладзеж, і сяды-тады адтуль чуцён высокі жаночы голас. Дубік даўно ўжо пайшоў дахаты, і цяпер гаворыць з мужчынамі, высунуўшыся ў акно. Відно, як на падваконніцы ляжыць яго заверчаная ў белую марлю рука.

— Ну, мужчыны, давайце разыходзіцца. Ды каб заўтра з расою ўлажыць той клін, што не ўдолелі сёння.

— Але, хлопцы, давайце, каб не заспаць,—гаворыць Дубік, і зачыняе акно.

— А позна засядзеліся. Хаця-б заўтра пагода дадзержала, — канчае нехта за ўсіх апошнюю думку.

Я доўга яшчэ астаюся на вуліцы. У такую от ноч мне хочацца думаць. Я думаю пра новых людзей, якіх толькі што бачыў. Не пазнаць іх праз гэтыя пару гадоў. Яны выраслі ў дужасць і ўжо знайшлі сваю сталасць. І няправільна, Гарасім, ты думаў пра розрух. Вот, пайшлі яны спаць і панеслі з сабою руплівасць пра заўтра. Гэта ў людзей нарадзілася новая якасць—дбайнасць. Не, сёлета не зазімуе ў полі чалавечая праца!

Ноч заціхла зусім. Сяды-тады з хмар паказваецца месяц. Вішнякі дрэмлюць, на платы паапускаўшы галовы. Недзе далёка—то ападаючы, то зноў падымаючыся—чутна залівістая песня начлежнікаў. З саду зрэдка пракрадаецца затоены

шопат, і я знаю, што гэта адтуль яшчэ не вярнулася Ганна.

Якая багатая ноч. І як добра, што я гашчу ў цябе, радзіма мая—гарэзная, свежая і звонкая, як маладосць.

Менск.
Істапад—снежань, 1932.

Дбайнасць

I

Першы раз я сустрэў яго ў праўленні калгаса. Мы сядзелі там увечары пасля работы. Як і заўсёды, тут было чалавек колькі мужчын, якія прыходзілі паталкаваць перад сном пра драбніцы жыцця ці пра што-небудзь даведацца ў старшыні. Тут сядзеў сёлавы гарэза і жартаўнік Мірон, рыжабароды, з канавамі маршчын на твары, і цягнуў сваю вечную „казіную ножку". Казіную ножку ён скручваў з добры палец, з самасейкі, прычым ніколі не даваў, каб яна зусім патухала, а зараз-жа даставаў пузаты кісет і скручваў новую, прыкурваючы яе ад старое. І гэтак селавікі за ўсё жыццё ніколі не бачылі Мірона без гэтае суслы.

Ён сядзеў на лаве крышку наводдаль стала і выдумляў сваю новую гісторыю. Ён расказваў і сам рагатаў усімі сваімі маршчынамі, і гэтым заражаў смехам больш, як самімі анекдотамі. Папяроса звісала тады на губе, разжованая і аб-

слюненая да палавіны, і недзе глыбока ў рыжым імшэўі броў блішчэлі яго маленькія вечна гаручыя вочы.

Мірон пачаў быў новую выдумку, калі на вуліцы пачуўся звон мандаліны. Мандаліна паступова набліжалася, і ў яе з кожным разам усё больш умешваліся чалавечыя звонкія галасы. Неўзабаве музыка пачулася пад самым акном, і адтуль молада і бойка крыкнуў голас:

— Хто на рэпетыцыю—у школу!

— Зайдзіце сюды, пайграйце трохі,— пазвалі з хаты.

З шумам, з гамонкаю і прыпеўкамі ў хату ўвайшло чалавек колькі хлопцаў. Першы, самы высокі, перад сабою нёс мандаліну. Ён перастаў іграць, але заднія яшчэ падпявалі яму, робячы ўражанне цэлага натоўпу. Яны адразу напоўнілі хату новым настроем, прынёсшы з сабою размашыстасць, весялосць, непакойлівы юр маладосці.

— Ну-ну, браткі, пайграйце.

— Падвесялі ты нас, Міхаіл.

— От тут, музыка, садзіся,—усхапіўся Мірон з лавы, даючы сваё месца.

Але Міхаіл іграць перастаў, а за ім змоўклі галасы і ягоных кампан'ёнаў. Гэта настала тая хвіліна няякавасці, калі непасрэднае выяўленне настрою адчувае на сабе чужую ўвагу. Але праз хвіліну ўсё наладзілася і пацякло па-ранейшаму. Міхаіл пачаў закурваць. Да яго пападсядалі мужчыны. Адразу знайшліся шырокія і патрэбныя

тэмы работы ў брыгадах, заўтрашніх разнарадак. Пацякла цягучая гаворка гаспадарчае рупнасці і турбот. Нехта зноў упрошваў пайграць, але Міхаіл прапускаў гэта міма ўвагі, быдта і не чуў. Каля яго сабраўся цэлы гурт, зрабіўшы нібы невялічкі бурлівы сход. Міхаіл то перш слухаў, то пасля гаварыў, высока і гарачкова падымаючы голас, то раптам раскаціста рагатаў, і тады твар яго быў шырокі, адкрыты, малады і здаровы.

Але яго такі ўпрасілі пайграць. Ён сеў на Міронава месца і ўдарыў медыятарам па струнах. Мандаліна гойкнула і задрыжэла. Ён іграў, пераменьваючы танец за танцам, песню за песняю, але ўжо не так, як тады, увайшоўшы, а спакойна, паволі, лоўка пагойдваючы пальцам, каб дрыжэла струна і размерана выбіваючы такт. Ён іграў доўга, забываючыся і сам сябе слухаючы. Адале пакідаў, зноў гаварыў, гарачыўся і зараз-жа смяяўся. Адчувалася, што ў мужчын ён мае павагу. Ён быў нібы нейкім іхным цэнтрам, дзе яны маглі вырашаць усе іхныя гаворкі і планы. Я глядзеў і дзівіўся, чаму гэтыя старыкі гэтак слухаюць яго, маладога,—пытаюцца, раяцца, нібы ў якога бывалага знатака. Я бачыў, як яны любяць яго і ганарацца ім, і я думаў, што калі-б ён сказаў, што трэба зараз-жа пайсці і недзе стаць на неабходнай рабоце—яны адразу пайшлі-б, забыўшыся, што кожны з іх ужо збіраўся ісці адпачываць.

Неўзабаве на вуліцы пачуліся новыя галасы, звонкія, і ўжо жаночыя. Яны клікалі хлопцаў.

І калі пайшлі яны зноў з шумам, з гамонкаю пяючы і іграючы па вуліцы, я ўжо ведаў, што Міхаіл—брыгадзір палявое брыгады, комсамолец, селавы энтузіяст, завадзіла ўсялякіх новых пачы, нанняў і душа і гадаванец калгаснікаў.

II

Быў адзін з тых восеньскіх дзён, калі па небе паволі і нізка плылі купчастыя воблакі і праз іх прагаліны прарывалася яркае, але ўжо халоднае сонца. Пахла сытаю вільгаццю зямлі і набутлым бульбоўнікам. Далёка ў сінец гарызонта забягалі шырокія папрыбіраныя палі. Па ўзгорках выгіналася малажавая рунь жытоў. У паветры чулася ціхая сцюдзёнасць. Наводдаль ярка жаўцеў і асыпаўся бярозавы гай. Над балотцам за палеткамі то кружылі, то ключом адплывалі гусі.

Мы ўтрох ішлі па полі, перасякаючы малады калгасны сад. Наперадзе, за дарогаю, стаяла невялічкая група мужчын. Гэта былі члены рэйда, наладжанага МТС па праверцы калгасаў у зоне свайго абслугоўвання. Міхаіл быў членам камісіі Узбуджаны і размашысты, ён радаваўся, што сёння будзе свежая работа, што яны да малюсенькае драбніцы правераць усё гаспадарчае жыццё свайго калгаса. У ягонай гаворцы і ў рухах была таропкасць. Шырокі, плячысты, ён ішоў паперадзе нас, размашыста сігаючы нагамі і раз-по-раз сунімаючыся і чакаючы, каб сказаць якое новае слова ці думку.

Побач першая брыгада выбірала бульбу. Жанкі стаялі панагінаўшыся над радкамі, кожная на сваёй дзялянцы. Хлопцы пазнавалі сярод іх дзяўчат і жартавалі. Я сіліўся нагнаць Міхаіла. Я запытаўся ў яго.

— А дзе-ж ваша брыгада?

— Мая—дома.

— Як дома?

— Мы скончылі ўжо,—растлумачыў ён.—Скончылі датэрмінова і цяпер прыбіраем кожны сваё, на сваіх агародах.

Ён памаўчаў і крокаў праз два павярнуўся зноў.

— А заўтра будзем памагаць ім,—паказаў ён на жанок.—На буксір возьмем. Я-ж з імі спаборнічаю. І калі-б не адна штука, то яны-б мяне адолелі. У іх больш рабочае сілы. Я, нават, папраўдзе кажучы, і не спадзяваўся, што гэтак выйдзе.

Мяне зацікавіла гэтая штука, якая вырашыла поспех Міхаілавае брыгады і я запытаўся пра яе. Але Міхаіл не ўспеў расказаць, як мы падышлі да мужчын.

— Міхаіл!—абазваў яго нізкі, карчукаваты чалавек.

— Я.

— Ты куды гэта змыўся?

— На таку, да малатарні забягаў. Там у мяне малоцяць.

— Та-ак,—працягнуў Мінін,—а мы без цябе пасевы аб'язджалі і, ведаеш, знайшлі, што ты здорава напсаваў.

— Як?—адразу перамяніўся Міхаіл, чырванеючы і трывожна перабягаючы вачыма з аднаго на другога, нібы хочучы скарэй дазнацца ў чым рэч.— Не можа быць. Дзе папсаваў?

— А вунь там, каля дарогі, жыта забаранована, як насмех. Гэта твая брыгада?—спакойна гаворыць Мінін, пранікліва гледзячы Міхаілу ў вочы.

— Не можа быць! Тады гэта вы не на маёй дзялянцы былі.

— Ну як-жа. Самі вашы хлопцы бачылі, яны-ж знаюць. Папытайся ў Сяргея.

— Праўда, Сяргей?

Міхаіл падбягае да Сяргея. Той ляжыць на калёсах, на якіх яны кагадзе прыехалі на гэты ўчастак. Сяргей ківае галавою. Міхаіл прыкусвае губу і думае.

— Ну дык што, усё не верыш?—азываецца Мінін.

— Не веру.

— Што-ж, давядзецца паехаць зноў, разам з табою.

Яны садзяцца і едуць зноў у толькі што агледжаны палетак. Мінін ведае Міхаілавую ўпартасць і хоча, каб ён пераканаўся сам. Ён не хоча без патрэбы спрачацца.

III

Увечары я доўга не бачыў Міхаіла. Вышла, што дэфект з баранаваннем зрабіла-такі яго брыгада. Прыехаўшы туды, Міхаіл доўга стаяў і гля-

дзеў. Ён не мог даўмецца, як гэта магло здарыцца. Каля самае дарогі, паўз край загонаў колькі толькі для прыклёпу пацягнены бараною. Не паразбіваны груды, тырчыць дзярна. І як назнарок каля самае дарогі, каб кожнаму кідалася ў вочы. Што-ж гэта—шкодніцтва? Ці неахайнасць? І чаму ён усё кругом праверыў, мог ручацца за сваю брыгаду на адрэз галавы, а тут прапусціў? Хто гэта тут баранаваў?

З поля Міхаіл пайшоў адзін. Ён ішоў напрасцяк, праз палеткі, у сяло. Ён нават забыўся, што можна было-б куды скарэй заехаць хурманкаю. Ён ішоў па раллі зябліва і спатыкаўся. Ён ішоў па іржэўніку, і іржэўнік стукаўся па нагах і шабуршэў. Ён перасек дарогу і пайшоў агародамі. Змяркала. З лагчыны пацягло вільгаццю і туманам.

— За ўсю брыгаду мог ручацца галавою і такое злачынства. Хто гэта баранаваў?

Ён пайшоў з хаты ў хату да тых, што працавалі на гэтым палетку. Ён пералазіў цераз платы натыкаўся на патарчакі. Ён плёхаў па гразі па івуліцы, не заўважаючы, што поўныя чаравікі вады. Ён лазіў цёмначы і не прыкмячаў, што настала ўжо ноч.

— Хто баранаваў?

І калі знайшоўся вінаваты, яшчэ больш узяла злосць, што нельга як след і пакараць. Вышла, што гэта малады калгаснік, які яшчэ не зразумеў важнасці калгаснае стараннасці і дысцыпліны. Што не ўспрыняў яшчэ адчування жорсткае адказнасці

за работу перад усімі калгаснікамі. Яго там захапіла ноч, і ён пакінуў, спадзяючыся дакончыць заўтра, а назаўтра пайшоў на другую работу, а пра клін і забыўся.

— Як-жа ты мог, калі на цябе была паверка? Які-ж ты калгаснік, які гаспадар?

— Ну, вылецела з галавы, ну... братка...

— Ты разумееш, што ты нарабіў? Гэта-ж калгас! С-сорам! І пры самай дарозе. Гэта-ж добра, што агледзелі. На гэтым-ж могуць іграць кулакі. Ты разумееш, што значыць у калгасе зрабіць дрэнна?..

Ён прышоў у праўленне цяжкі, пахмуры, і ў ім нельга было пазнаць ранейшага Міхаіла. Гаварыў ён мала і скупа. Рэйдавікі не напаміналі пра гэта, але ён сам загаварыў, нібы хочучы скончыць нейкую мулкую неадчэпную думку.

— Добра, што выкрылі, а то...—ён вяла махнуў рукою і абвёў усіх вачыма, гэтым нібы гаворачы: „во, брат, бывае".

Неўзабаве рэйдавікі разбіліся на тры групы і, пабраўшы „лятучыя мышы", пайшлі правяраць гумны і клеці. Я далучыўся да групы Міхаіла.

IV

Нас было чэцвера. Была густая цёмная восеньская ноч. „Лятучая мыш" мігцела наперадзе ў Міхаіла і перабягала з рукі ў руку, то хаваючыся за ім, то зноў выблісквачы, гледзячы па тым, як варочаўся ён, абыходзячы лужы. Ад туманавае

сырасці зямля стала ліпкая і цягучая. На яе мокрай і бліскучай паверхні клаліся гіганцкія цені нашых ног, пачварна выгінаючыся і перабягаючы з месца на месца. Мы прабіваліся ў цемры, прыціскаючы яе бязгучную пустату. Мы хадзілі з гумна ў гумно, пералазячы цераз платы, абходзячы загуменнямі. Мы рыпалі варотамі, заходзілі на такі, лазілі па стаўпах, разварочваючы і нюхаючы сена. Мы мацалі снапы, прабіваючы іхныя калючыя камлі і затыкаючы глыбока руку, каб знайсці, ці няма дзе мокрага ці гнілога. Мы доўга шворылі там рукою, прыслухоўваючыся, ці не гарачае збожжа. Мы грукалі па таках абцасамі, аглядаючы кожны закутак, ці па-гаспадарску тут дагледжана і прыбрана. Замыкалі і зноў ішлі ў цемень да наступнага гумна. Мы абыходзілі паклажы другое брыгады. правяраючы Міхаілаву дбайнасць. У запакованых дашчэнту гумнах не адчыняліся вароты. Мы пралазілі зверху, адтульваючы невялікія шчыліны, як мышы. Мы забіраліся пад самыя стрэхі, стукаючыся галовамі аб ключы. На прыгуменнях мы аглядалі сцірты саломы. На сціртах ляжала туманавая раса; яна ападала ад першага дотыку рукі, пяклася холадам і, падаючы, блішчэла ў палосах ліхтаровага святла. Мы правяралі кожную драбніцу гаспадарчае рупнасці,—усё было ў найлепшым парадку, і да Міхаіла варочаўся даўнейшы вясёлы настрой.

Мы зайшлі ў апошняе гумно. У кутку стаяла малатарня. Пахла малочаным збожжам і нядаўна

падмеценым токам. Мы абыходзілі стаўпы, прабіваючы іх сваімі рукамі. Маўклівы і флегматычны рэйдавік надоўга суняўся ля вікі.

— Сыра!

Мы сабраліся ўсе гуртам, выскубаючы з сярэдзіны жмені вікі. Мы камячылі яе ў руках, нюхалі, раскалупвалі струкі. Віка падатліва згіналася ў жмені і сціскалася ў кулаку, як пакля.

— Сырая!

Зноў шчыльней прыглядаемся. Міхаіл сам як мага глыбей прабівае руку, выскубае новую пасму, камечыць і нюхае.

— Добрая,—гаворыць ён.—Бачыш, не пахне і не гарачая. Такая віка не сапсуецца.

Мы спрачаемся. Міхаіл гарачыцца, што іначай нельга было яе прыбраць. Умешваюцца іншыя члены камісіі. Нашы думкі разбіваюцца напал. Мы забіраем падазроную пасму, каб паказаць яе ўсяму рэйду і вырашыць разам. Мы ідзем назад па вуліцы, плёхаючы ў густых восеньскіх лужах і абіраючыся паўз платы. Першыя два рэйды яшчэ не вярнуліся. Мы заглядаем пад акно праўлення,—там нікога няма і Міхаіл дае прапанову.

— Хадзем да Мірона. Да дзяўчат. На трохі перадыхнуць.

V

У Мірона бадай штовечар збіраецца маладзеж. Але сёння яшчэ нікога няма і Міронава хата выглядае пуста. На лаве робяць панчохі і шэпчуцца

пару дзяўчат. Міронава дачка мабыць толькі што прыбрала вячэру і мые пасудак. Сам Мірон сядзіць на ўслоне тварам на хату і б'е масла. На ягонай губе вісіць неадменная казіная ножка, разжованая і змочаная да палавіны. Ён моршчыцца і закідае назад голаў, прыплюшчваючыся ад дыму. Каб не адвалілася папяроса, ён гаворыць, шапялявячы, адным краем губ.

— Здаровы, здаровы, хлопцы,—заходзьце.

У хаце пачынаецца ажыўленне. Міронава дачка ўвіхаецца, каб скарэй кончыць з пасудкам. Дзяўчаты перакладаюць у прыполле клубкі і папраўляюць хусткі. Рэйдавікі прысядаюць да іх. Мірон адсоўваецца на ўслоне, падкочваючы за сабою бойку. Каля яго ляжыць пузаты кісет з тытуном і запалкі.

— Ну, як-жа, хлопцы, рэйд! Усё ў парадку, Міхаіл?—апошнім запытаннем зварочваецца ён да свайго брыгадзіра.

— На яць! Ато што-ж бы мы за гаспадары з табою былі? Што-ж з нас былі-б за калгаснікі? От толькі адна загагуліна ёсць, дзядзька Мірон, ты як старэйшы, век свой гаспадарачы перажыў,— рассудзі.

Мірон доўга варочае ў руках прынесеную пасму вікі. Ён хоча разабрацца як след, па-знатоцку, каб ягонае заключэнне было не толькі словам аўтарытэта. Няхай сабе гэта свая брыгада, а што праўда, то павінна быць праўда.

— От што, хлопцы,—гаворыць ён, пагадзіўшы.—

Віка добрая, гэта нічога, што яна здаецца вільготнай. Сапсавацца яна не можа. Глядзі якое здаровае зерне. Яе толькі малаціць трэба, калі крыху сцісне марозік... Віка, хлопцы, добрая,—канчае ён цвёрда і ўпэўнена.

Міхаіл зноў ажыўляецца. Ягоны твар святлее і робіцца па-ранейшаму адкрытым, шырокім, ясным. На губах расплываецца ўсмешка. Гонар брыгады апраўданы. Рабілі чэсна і дбайна. Гэтае восені, як ніколі ў жыцці, змагаліся заўзята і дружна, крывёю пазаўшы вялікую задачу настаўніка і правадыра—зрабіць калгасы большэвіцкімі і ўсіх калгаснікаў заможнымі. Біліся! Пабольшэвіцку, як чэрці біліся, заваёўваючы права на радасць.

— Я-ж ім казаў! А што, хлопцы, маніў я вам?—звяртаецца ён да рэйдавікоў, буйна рагочучы і размашыстым жэстам выкідаючы ўгору руку.

Ён пачынае парыўчата хадзіць па хаце, самаздаволена паціраючы рукі. Адале нешта ўспамінае і падыходзіць да мяне.

— Ага,—гаворыць ён,—я-ж тады і не сказаў. Пра спаборніцтва. Было так,—ён адсоўвае Міронаву шапку і садзіцца каля мяне.—Пачыналі выворваць бульбу. Я з першаю брыгадаю спаборнічаю даўно. І скрозь яе перамагаў. А гэта, бачу, не выкарабкаюся. Дзялянкі ў нас то роўныя, але ў мяне мала жанок. Як на злосць у гэты час радзіць пачалі. Ну, а мужчыны-ж, бывае, на другой рабоце,—зябліва. Мала людзей, бачу, у мяне. І от

падыходзіць аднойчы да мяне Павал. Брыгадзір іхны—Жук.

— Здаешся?—пытаецца жартам.

Я пачухаў патыліцу. Што тут сказаць, думаю? А ў самога хоць-бы каліва надзеі.

— Падумаю,—кажу.

— Падумаеш?—і ўсміхаецца, нібы гэтым гаворачы: „тут, брат, і думаць няма чаго“.

— Падумаю,—кажу.

Так і разышліся. І я пачаў шавяліць галавою. Ну, і што я зрабіў? А от што. Першае—я загадзя пачаў падрыхтоўвацца і, калі вышлі ў поле,—у мяне ўжо ўсё было як мае быць гатова. Другое. Яны сабе спакойныя, робяць спакваля, выходны дзень зрабілі, а я—без выходнага. І брыгада ўся—гарыць агнём. І трэцяе, самае галоўнае, і я яму пра гэта не сказаў, а то-б ён усёроўна мяне ўходаў. А от што: паставіў я першы дзень рабочую сілу—кожнай жанчыне па адным радку. Гляджу, прыглядаюся—цесна ім. Штырхаюцца адна аб адну локцямі, кошыкі адзін аднаму замінаюць. Назаўтра расстаўляю па-новаму—на кожную па два радкі. Жанкі ў крык, у пратэст—не хочам, налаўчылі ўжо рукі. Хто не хоча, кажу, не трэба—ідзіце дахаты, от як. Жанкі ўламаліся. І я бачу—адразу спарней. І самі жанкі ўжо бачаць, і рады, што я на іх накрычаў. Можаце, кажу, цяпер станавіцца як і раней, гудуць—не хочам. Ну, мы і зырнулі. І на тры дні абагналі. Павал ажно схапіўся за вушы. Ён не ведаў, што за праява.

У хаце таксама знайшлася агульная гаворка. Мірон расказваў, як сёння адваяваў на трактар газы. МТС не давала, дык паслалі Мірона, і Мірон-такі дабіўся. Яму памаглі ўскаціць велізарную бочку на воз. Бочка разагналася і боўтнула на ўвесь перадок. Мірон выехаў на дарогу і збіраўся сесці. І от тут-то яму і пашанцавала. У перадку ляжала бочка, аставалася месца ззаду, але адтуль не даставалі кіраваць лейцы.

— От, брат, гора было,—канчае Мірон і сам ужо трасецца ад смеху.—І так-жа лягла, на яе агні, што я ўсю дарогу ад Слуцка клыпаў узбоч воза ў гэтых сваіх самаходах.

Ён расказаў гэта да таго смешна, што ўсе мы качаемся з рогату. У самога Мірона пацякла ад смеху і заблішчэла ў маршчынах сляза. Але калі супакоіліся, Міхаіл зноў падыходзіць да мяне і, як-бы не скончыўшы яшчэ самае галоўнае свае думкі, якая мучыць яго, гаворыць.

— Можа і нядобра, што я не сказаў Паўлу пра гэта апошняе. Выходзіць, быдта я тайком перахітраваў яго, а?

Менск, 1933.

Сустрэчы

I

Я ўз'ехаў на двор і саскочыў з сядла. З паліта майго лілася ручаямі вада. Анямеўшыя ногі падгіналіся і няўмеючы станавіліся на зямлю. Ішоў косы сцюдзёны дождж, на ветры ён разбіваўся і плыў несканчоным туманам. Двор быў пусты і азызлы, з халодным глянцам размешанае гразі. Нікога не вышла, у сенцы былі адчынены дзверы і я крыкнуў у іх глухую нямату:

— Эй, ці ёсць хто дома?

З сянец выскачыла сястра. Яна пазнала мой голас і на-бягу абівала хвартух і паправіла хустку. Рукавом яна выцерла губы, і яны задрыжалі і ўспыхнулі ў мяне на губах. Дождж змыў пацалунак халоднымі каплямі. Над плотам падымалася згорбленая ветрам канёва спіна.

Сястра дастала мне сухое швагрусёва адзенне. Яна прынесла дзве пары крамных зялёных шкарпэтак. Яна была ўзбуджаная і таропкая, не знаходзячы, што гаварыць. Так бывае пры дарагіх

і нечаканых сустрэчах, калі мова без сілы выказаць усхвалёваную радасць. Яна не магла даўмецца, адкуль я ўзяўся ў такую непагадзь і бездарожжа.

Я кажу, што падарожнічаю ў гэткіх краях і не захацеў яе абмінуць. Такавы законы мае неспакойнае прафесіі—усюды ўсё ведаць, і, як Фама Няверны, абмацваць сваімі пальцамі.

Пасля ўзрушанасць праходзіць, і мы ўжо спакойна гаворым. Мне цёпла ў чужых калашматых штанах і ў прасторнай сухой світцы. Холад шавеліцца яшчэ толькі недзе ў маіх касцях. Паліто вісіць ля дзвярэй на круку і з яго капае ў цэбрык вада. Сястра ідзе ў кухню. Яна бразгае дрэўкамі і грыміць трыножнікам, раскладаючы пад ім аганёк. Я загадзя чую спакуслівы пах падсмажаных скварак. Я хаджу, размінаючы ногі, і мне здаецца, што падлога перада мною ўспучваецца ўпарта не дае цвёрда паставіць шаг. На сцяне я чытаю плакаты і разглядаю палінялыя карткі. Гэта гісторыя станаўлення і росту сям'і ў яе сувязях і дачыненнях. Вот сама сястра з швагрусём ся род свайго маладога патомства. У яе высокі завіты чуб і поўнакроўнае, яшчэ прагавітае мацярынства Даніла ў форме салдата імперыялістычнае вайны. У двух жаночых галоўках наводдаль я пазнаю Веру і Кацю. Яны ўжо дарослыя, крамяныя дзяўчаты. А гэта—Кацін жаніх... Чорт на яго,—калі гэта ўсё прайшло! Здаецца, зусім нядаўна я іх ведаў дзяцьмі...

Вечар лёг за вокнамі раптоўна і густа. Мне

няма калі ўспамінаць свайго пакінутага ў сястры дзяцінства. Аднекуль, як па сігналу, пачынае збірацца сям'я. Адно за адным: і Вера, і Раіса, і Коля, і Алёша, і Алесь—я іх ледзь пазнаю. І зусім ужо позна прыходзіць Дачіла. Ён нібы замыкае сабою круг сумятлівага дня і прыносіць права на адпачынак.

— Ага, во які госць у нас,—гаворыць ён сваім вечна спакойным і роўным голасам, і сунімаецца ў парозе, каб напіцца вады.

II

...Ноч звініць за акном адватоннымі каплямі. На сцяне ходзікі няўтомна клююць цішыню, і паўзуць, адна адну абганяючы, стрэлкі. Мы яшчэ доўга сядзімо ўтраіх. Мне прыемна пазнаць пра навіны і змены ў калгасе і ў іхным жыцці. А селавыя гаворкі даўгія і несканчоныя, як зімовыя вечары. Яны поўны і трывог, і радасцей, і надзей, і балючых хваляванняў. Сястрын голас звонкі, высокі і поўны, ліецца парыўчата і неяк непадкупна праўдзіва і мякка.

— Няма чаго і гаварыць,—кажа яна, як-бы ў заключэнне сваіх думак,—што цяпер ужо ў нас не гора. От і дзеці-ж усе бадай вучацца, пакуль што гэта-ж нахлебнікі, а тым часам, што трэба, то і маем, і не бядуем. Каця-ж, дык онь нават ужо настаўнічае недзе ля Урэчча. А што сёлета, дык некаторыя, у каго работнікаў было многа, аднае бульбы колькі напалучалі.

Даніла сядзіць, як заўсёды, маўклівы і строгі. У гаворку ён урываецца рэдка і раптам, і, засаб выгаварыўшы ўсе свае думкі, гэтак-жа раптам сціхае. Яго вельмі хвалюе, калі ёсць непарадкі; Ён будзе тады мучыцца і кіпець, і ўвесь свет успрыймацьме толькі праз іх.

— Бузы то ў нас пападаецца яшчэ многа, от што. Лезе іншы ў правіцелі, а самому хоць пальцам паказвай. Або мала напакасціў гэты чорт сляпы, што быў у нас за старшыню? Сабраў ля сябе любімчыкаў—то кумоў, то сватоў,—дый панаваў, тайком сыры ды масла паядаючы. Коні онь былі пазаганялі да таго, што на іх страшна было паглядзець...

Апошняе ён сказаў загарэўшыся, і адразу-ж патух. Ён сказаў сваё самае балючае. І ўсё ранейшае, фактычна, ён гаварыў для таго, каб толькі ўпамянуць пра коні. Ён—конюх. Гэта яго няшчасце і радасць. Конь для яго ўсёадно, што свая кроў ці сваё дзіця. Няхай толькі ён захварэе, дык з ім захварэе і сам Даніла. Ён не будзе тады ні есці, ні спаць; ён хадзіцьме з ліхтаром раз-по-раз у хлеў, як лунацік і тады ўжо ніякая работа не пойдзе яму ў рукі. Я памятаю, як у яго некалі была захварэла свая Сіўка. Тры дні ён тады нічога не браў у рот, а хадзіў, як разбіты—пануры і ачужэлы. Сястра тады баялася ўжо не за кабылу, а за самога Данілу. Яна не адступалася ад яго, упрошваючы, як дзіця.

— Ну, Данілка, ну, кінь. Ну, няхай сабе яна

і здохне, то ты-ж перш за ўсё сябе пашануй, а кабыла, калі жыцьмецца, то набудзецца.

І боль у яго не за тое, што можа быць страта. Ён, проста, не можа трываць, як пакутуе немая і бездапаможная жывёла. Яна-ж не можа ні сказаць, ні паскардзіцца. Яму тады здаецца, што ў гэтым вінаваты ён сам. Я часта дзіўлюся, як можа мясціцца ў гэтым панурым і адзічэлым чалавеку такая невычэрпная чуласць і нежнасць, мяжуючая з мацярынствам.

— Ну, але цяпер ужо годзе,—астыўшы, гаворыць Даніла.—Цяпер у нас Грышка, і чалавек ён, здаецца, талкавіты.

— Які Грышка?

— А ты-ж яго мабыць ведаеш,—перабівае сястра,—Грыбаль Грышка.

Я прыгадваю. З дзяцінства майго выплывае задзёрысты танклявы хлапчына, галаварэз і мой аднакласнік па школе. Мы яго тады звалі проста Грыб, і ў яго такі, праўда, былі рыжыя непакорныя валасы, стрыжаныя наўкруга, як застрэшак. Ён жыў на канцы сяла і насіў у зрэбнай торбачцы кнігі. Узімку, выходзячы з школы, мы заядла рэзаліся ў снежкі, а ўлетку гулялі ў таланта ці качалі па вуліцы кацёлку. Здаецца, у настаўніцы мы выбілі былі аднойчы акно, і тады пахаваліся хто куды, адцураўшыся нават кацёлкі. Пасля я яго неяк сустракаў, калі ён ужо быў чырвонаармейцам; я бачыў тады яго мелькам,

і ў памяці астаўся толькі цмяны воблік высокага і энергічнага чалавека.

— Дык ён у вас цяпер за старшыню?—пытаюся я, ніто радасна, ніто здзіўлена.—Ну, як-жа ён?

— А, нічога, бярэцца добра,—устае Даніла, папраўляючы свой калючы белабрысы вус, і ідзе спаць, трымаючыся за паясніцу штаноў.

— Ну-у, ён-жа комуніст,—папраўляе сястра, з нейкаю асабліваю павагаю гаворачы гэта слова. Я чую, як унутры маім падымаецца невыказная нежнасць і ласка. Мне хочацца падыйсці і пацалаваць Ульяну. У гэты час я ганаруся ёю, яна, чартоўка, і не ведае да чаго я яе люблю.

III

Назаўтра я шукаю, каб убачыцца дзе з Грыбалём. Але яго не так лёгка і знайсці. У праўленні я застаю аднаго толькі Лапеку Марку—даўгавязага рахункавода. Ён заняты з працаднямі, і на стале ў яго ляжаць недабітыя лічыльнікі і груды працоўных кніжак. Гэта таксама мой даўні знаёмы. Ён быў на два класы старэй за мяне і меў рэпутацыю безнадзейнага гультая і абібока. Цяпер гэта рослы мужчына з чорнымі слядамі пабрытых вусоў і з мяккім, нейкім лірычным, басам. Ён усміхаецца сваім знакамітым шчарбатым зубам. Ён расказвае мне пра калгас, у той час і запісваючы свае таямнічыя лічбы, і гаворачы з прышоўшымі мужчынамі—як Юлі Цэзар... Я іду, думаючы су-

стрэць Грыбаля дзе на сяле—на таку ці на ферме. Але яго нідзе няма, і я пачынаю аглядаць аколіцы.

Любата! Дождж перастаў яшчэ ўночы, ад яго асталася толькі земляная пахучая вільгаць і густы, цяжкаваты сінец гарызонта. Палеткі то велічна падымаюцца ўзгоркамі, засланяючы адзін аднаго, то ападаюць пакатамі, па якіх, пенячыся і размываючы гліну, сцякае ўчарашняя вада. Дзе-ні-дзе высяцца і мшэюць у спрадвечным сне валаты-камяні—сляды дагістарычных фінляндскіх ледавікоў. Іхныя, некалі расцёртыя неймавернаю сілаю, аскепкі валяюцца па дарозе, і на загонах паскіданы ў пірамідальныя камяніцы. Вада булькае і шуміць, прабіваючы ручайкі, і збягае ў звілісты, вякамі прарыты ў нізіне роў. Ён глыбокі і абрывісты, гэты роў, і абвеяны таямнічымі легендамі. Яго берагі падымаюцца голымі выступамі, а вада стогне і бурліць далёка ўнізе, як у цясніне, прабіваючы камяні і абвалы. Аднойчы пасля навальніцы, калі вада змыла з сабою зямлю, на дне яго былі знойдзены два калодзежы. Дуб быў чорны як вугаль, і цвёрды, як косць. Калодзежы паразбіралі і парабілі пасудак. Пасудак быў моцны і незнашоны. І нават самыя глыбокія старыкі не памятаюць там ніякага паселішча. Яны ўспамінаюць, што там быў драмучы лес, шумелі векавечныя дубы і між іх вілася невялічкая сцежка. Я гляджу цяпер на гэты роў і ў шуме вады чую далёкую старажытнасць. Ён ляжыць тут вякамі, вечна ўядаючыся ў цела зямлі. За ім пачынаецца зялёны

бархат жытоў; ён расцілаецца недзе ў бясконцасць па гэтых выгінастых узгорках і зліваецца на гарызонце з хмарамі. Я іду лёгкі, акрылены, нават не чуючы паналіпаўшае да ног зямлі. Я не магу наглядзецца на гэтую шыр. Па мне разліваецца нейкая невыпеўная радасць зямлі, як радасць табою апладнёнага нараджэння.

За равамі я паварочваю дахаты і іду агародамі. Унізе цягнецца балотца з радкамі скошанае атавы. Тут некалі былі непраходныя нетры і ў іх гразлі штогод каровы. Але я гляджу ў далячынь, я шукаю Острава—гэтае легендарнае краіны майго дзяцінства. Гэта быў куток вечна шумлівага, цёмнага лесу, абкружанага гэтым чартоўскім балотам. Там вадзіліся і начамі ўзімку завывалі ваўкі, а ўлетку пасвіліся каровы. Недаступны і далёкі ад нас, дзетвары, ён быў абвеяны ў нашым уяўленні ружовымі казкамі, лёгкімі і дзівотлівымі, як міраж. Мы ўцякалі туды ад мацярок на цэлыя дні. Мы лазілі па дуплях дубоў, раскладалі пад развесістымі кронамі агні і гулялі ў таланта. Як жалобна крычалі паспорваныя вараняты ў нашых руках! Я памятаю, як мне хацелася вымяняць у кагосьці нейкае чароўнае шкелка, гледзячы ў якое відаць было безліч чалавечых твараў. Я цяпер ўжо ведаю, што гэта было гранёнае шкелка ад кішанёвага электрычнага ліхтарыка. Тады я даваў за яго маленькае металічнае калёсіка, знойдзенае мною ў паповым сметніку. Гэта было калёсіка з-пад нікелевага ложка, але тады гэтага я таксама

не ведаў. На Остраве мы адчувалі сябе веліканамі, кожны з нас рабіўся дарослым і самастойным. За гэта мне часта пападала ад сястры, але ўлучыўшы хвілінку, я забываўся пра кару і зноў уцякаў.

Замест Острава я бачу роўнае, пакацістае поле. Вакол яго прапала балота, і вока нідзе не зачэпіцца нават за які-небудзь лядашчы куст лазняку ці за чахлую, разгатую алешыну. Няма майго легендарнага лесу, каторы фактычна і быў жменькаю недалужнага прыбалотнага рагачча, ператворанага ў казачную краіну нашаю неспакойнаю дзіцячаю фантазіяй. Вышэй, падымаючыся да старых палеткаў, стаіць сяло. Яно яшчэ невялікае, але дзіўна прыгожае, нейкае святочнае і радаснае, нібы вышла туды спраўляць маёўку. Гэта аддзяленне калгаса. Вунь-жа прыжмурваецца сваімі незлічонымі вокнамі новы свінарнік. За гумнамі, на чорных, нібы градах, загонах тырчаць аголеныя сцяблы сонечніку ды кукурузы. На геаграфічнай карце мае памяці ні гэтага сяла, ні гэтых культур няма—тут павінна быць невялікая палянка ды фальварак недалужнага поўпанка Бронькі, каторы і меў толькі тое, што лакіраваныя боты ды ненасытную сваю палюбоўніцу.

Я гляджу і дзіўлюся. Быдта прайшлі не гады, а цэлая вечнасць. Якая неймаверная сіла ў гэтага чалавека!

IV

Дома я застаю карчукаватага, з сівымі пасмамі ў барадзе, чалавека. Ён здароваецца, я бяру ягоную руку і гляджу ў твар. Вочы ні то баязліва вывучаюць мяне, ні то іранічна ўсміхаюцца. Урэшце, я пазнаю пастарэўшага Цымбала.

— А, здароў, дзядзька,—кажу я,—я ледзь пазнаў вас.

— Дык вы-ж усе так цяпер не пазнаеце нас, бацькоў.

— Як гэта не пазнаем?

— От мой-жа адцураўся, не піша. Бацькі цяпер не патрэбны, калі ўжо вас павыгадоўвалі.

— Калі нягодныя бацькі, дык, канешне, не патрэбны.

Я заўважыў, што Цымбал неяк нядобра паглядзеў на мяне. Быдта я сказаў пра яго. Ён ўздрыгнуў, павярнуўся да мяне бокам і замоўк. Пасля толькі я даведаўся, што ён кругом пакрыўджаны. Яго не прынялі ў калгас за кулацкую агітацыю. За гэта з ім пасварыўся сын і адцураліся суседзі. Цяпер ён ходзіць і раскайваецца, і крыўдзіцца, што яму ніхто не верыць.

Ён уздыхае, скрабе ў барадзе, і, відаць, што пра нешта хоча загаварыць. Ён можа знарок прышоў пра што запытацца і не адважваецца.

— Скажы ты мне,—урэшце садзіцца ён паволі на лаве і глядзіць мне проста ў вочы,—ці гэта ў нас ужо бяскласавае грамадства гэтае ёсць ці не?

Я хачу зразумець хаду ягонага запытання і насторожваюся.

— Мы яго яшчэ будуем,—кажу я.

— Дык, значыцца, і барацьба гэтая класавая таксама яшчэ не скончана?

— Не, не скончана.

— Та-а-ак,—уздыхае ён, памаўчаўшы,—а я думаў, што мы ўжо ў соцыялізме... Нядобра,—коратка заключае ён, паскубваючы бараду на шчацэ.

— А чаму гэта ты, дзядзька Цымбал, пытаешся?—цікаўлюся я.

Ён адказвае не адразу, а перш глядзіць на ўсіх, пробуючы ўсміхнуцца.

— Дык я-ж і кажу. Я думаў, што ў нас ужо бяскласавае грамадства гэтае, як пісалі, што ў другой пяцігодцы будзе, то я ўжо хацеў ісці дый патрабаваць, каб мяне ў калгас прынялі, бо тады-ж я быў-бы ўжо роўны з усімі.

Цымбал рагоча кароткім дробненькім смехам і відаць, што рагоча ён нехаця, а так—для людзей.

За акном густа і нізка перакочваюцца воблакі.

На акне ляжаць ненадзетыя мною шкарпэткі. Сястра ў кухні крычыць на сабаку. Яна нешта беспярэстанку робіць. Яна вечна чым-небудзь занята, гэтая Ульяна. Яе дзень сумятлівы і неспакойны, як перад жнівом. Я бачу, як яна то паказваецца ў хаце, то недзе знікае, то зноў варочаецца, стукаючы па падлозе голымі пяткамі.

Я чую, як пасля хады пачынаюць ныць ногі.

Цымбал доўга сядзіць, уставіўшыся недзе ў

жуток, на гэты час расшыранымі, шклянымі вачыма.

— Няма справядлівасці,—гаворыць ён урэшце.— Што я кулак які ці што, каб мяне нават у калгас не прыняць? Што я забіў каго, ці зарэзаў?

— Ат, не крывіце душою, дзядзька Цымбал,— высокім нецярплівым голасам урэзваецца Ульяна.— Не такі ўжо вы маленькі, каб нічога не ведаць. Нябось папабэсцілі нас не мала, дый цяпер, богу дзякаваць, язык не на прывязі, але ўсё гэта быдта скардзіцеся, што вас крыўдзяць!

Я чую, як цяжка Ульяне стрымацца, каб не перайсці ў злосць. Яе рукі нервова папраўляюць расслаблены вузел хусткі. Цымбал устае і грузна ідзе ў дзверы, але дзверы адчыняюцца і на парозе паяўляецца Богуш. Яшчэ з парога ён смяецца сваімі маленькімі прытушанымі вугалькамі і ўжо гаворыць пісклявым заржаўленым голасам:

— Ну, што, прыехаў, коцік, а? Да сястры захацеў праведаць? А як-жа, трэба, малайчына. Ну, як-жа пажываеш, коцік, скажы. Эч ты, і барада вырасла, хе-хе-хе!

Ён гаворыць не перастаючы, то пакашліваючы, то ўсміхаючыся, і ўвесь час ходзіць, паціраючы рукі. Ён сухі, танклявы, з вузкімі плячыма і з востраю бародкаю—увесь варушкі і неспакойны, як на спрунжынах. Такое ўражанне, што ён некуды вечна бяжыць і спяшаецца, каб не спазніцца. І смех яго дробны, кароценькі, таксама таропкі і неспакойны.

— Як-жа калгас табе наш падабаецца, а? Усё пішаш? Я-ж таксама ў калгасе, коцік, і нічога, ведаеш, добра. Ты-ж гарэлкі ці маеш, Ульяна? Яна цябе можа і не ўчаставала?.. Ну, як-жа скажы, коцік, ці ў нас ужо бяскласавае грамадства ёсць? Цяпер без класаў ужо?

„Хто гэта іх панавучваў?"—думаю я, згадваючы Цымбала і бачачы тут невыпадковасць. Але папаволі здагадваюся. Я пачынаю прыгадваць усяго Богуша, і ён паўстае перада мною, як на далоні.

З японскае вайны ён варочаецца не простым салдатам, а з нашыўкаю—фельчарам. З братам ён дзеліць гаспадарку. Яму ўжо не да твара калупацца ў зямлі, ён прадае сваю часць і едзе ў свет. Ён жыве ў Сіняўцы, у Несвіжы,—у яго там нейкія важныя, па службе ў салдатах, знаёмыя і панна Паліна. Пратраціўшы „маёмасць", ён варочаецца назад. Але ён ужо не просты селавік, ён водзіць знаёмства з валаснымі чыноўнікамі ды з пісарамі. Урэшце ён жэніцца на нейкім паповым неданоску. Яна—старая, крыклівая, непаседлівая і напалову вар'ятка. Яны пачынаюць лячыць. Яна—шэптамі і зёлкамі, ён—каплямі. У хаце паяўляюцца яйкі, сыры, масла, усялякае дабро. Хворыя павінны плаціць добра, бо другі раз пан Богуш не будзе лячыць. Яна—бегае па хатах і нюхае, чым у каго пахне з печы, хваліць страву і просіць прынесці дробак гэтага мяса і ёй.

Рэволюцыя застала Богуша ў новенькім, гон-

тамі крытым доміку з шкляным, малёваным ганкам, з кветкамі вакол яго, і з садзікам. У рэволюцыю кветкі пасохлі і пабітыя шыбы ў ганку пазабіваліся дошкамі. Ён бачыў, што нічога з гэтым не зробіш—на перабой ён усім хваліў рэволюцыю, але на дно куфра беражліва схаваў партрэт Нікалая. Часы ішлі і Нікалая давялося дастаць і спаліць. Жонка памерла, гаспадарка асунулася, і ён падаўся ў калгас адразу-ж, як яго толькі арганізавалі—нават быдта лёгка і радасна. Ён-жа не лячыў цяпер ні зёлкамі, ні шэптамі, і быў сапраўдным совецкім фельчарам. Але калі заходзіў палячыцца надзейны чалавек, Богуш рад быў успамянуць добрае старае. У Польшчы ў яго жыла дачка. Яму прыемна было з кімнебудзь паскучаць па ёй і адкрыта ўздыхнуць. Ён нават мог сказаць цішком якую „свежую“ навіну ці паталкаваць пра палітыку. Ён мог параіць чалавеку як трымацца, каб было спакайней. Наогул быў чалавекам „прадбачлівым“. І ясна, што гэта ён навучаў Цымбала „чакаць“ бяскласавага грамадства.

— Дык ты і на Каўказе быў?—беспярэстанку парашчыць ён.—Ну, як-жа там, добра? Усяго хапае, не галадуюць? Хаця-б не галадавалі, коцік. І чыгункі па горах ходзяць? От, бач, Ульяна, гэта ні то што мы з табою сядзімо тут у гэтым пекле, а ён дык онь колькі свету пабачыў. А скажы ты, коцік, ці гэтыя чыгункі там старыя яшчэ, ці ўжо цяпер пабудованы?

Я зноў бачу наскрозь гэтага „палітыка“ і злосна, гледзячы ў вочы, гавару:

— А нягодны ты, дзядзька Богуш. Я-ж ведаю, чаму ты пытаешся: старыя яны ці цяперашнія. Ты хочаш, каб я сказаў, што старыя, тады ты пабяжыш абрадваны шушукаць: „ага, от бач, і дарогі яшчэ Нікалаеўскія, яшчэ ўсё царскае, аднак, спажываем“. Свежы хлеб табе быў-бы.

Богуш неяк горбіцца, збіваецца з панталыку, і спуджана моргае вачыма. Ён пробуе жартаваць, але кашляе, заікаецца, і хударлявая фігура яго яшчэ больш корчыцца і неспакойна шавеліцца.

У дзвярах чуецца свежы тупат і галасы. Даніла нясе папраўлены хамут. За ім я бачу нечыя шырокія плечы і цвёрды шаг. Праз хвіліну я пазнаю калгаснага здаравілу, каваля Антона, а за ім Грыбаля. Яны ціснуць мае рукі сваімі жалезнымі рукамі і трасуць іх. Іх двое, але здаецца, што тут прышоў цэлы натаўп. Богуш з Цымбалам непрыкметна, але таропка знікаюць. У хаце становіцца шумна і ўзбуджана радасна. У Антона на перадзе шырокі залаты зуб, і ён блішчыць і смяецца разам з Антонам. Якія яны здаровыя і свежыя, быдта прынеслі з сабою іншы свет. Я гляджу на Грыбалёў твар: ён яшчэ малады, але суровы і каменны, з глыбокаю папярочнаю складкаю на ілбе, з шурпатымі слядамі вятроў. Раптам я ўспамінаю гранёнае шкелка, рыжага з непакорнымі валасамі карантыша і рагачу.

— Чаго ты?

— Шкелка,—гавару я.—У цябе было такое харошае шкелка і ты не хацеў са мною мяняцца. Мы тады бегалі ў палатняных, з паадтоптванымі калошамі, штанах.

— Во ўспомніў,—гаворыць ён, канфузліва ўсміхаючыся і расшпільваючы свой прасторны, без пояса шынель.—Ну і дадумаўся,—давай лепш пра цяперашняе.

— Давай, старшыня...

V

Цёплая раніца чакала мяне ля парога з асядланым канём. Сястра праводзіла мяне за вароты і доўга стаяла, пакуль я не схаваўся за аселіцаю. Падыхаў лёгкі восеньскі вецер і сонца нехаця варочалася ў густых, цяжкаватых воблаках. Дарога вілася і звінела наперадзе, як бясконцая песня. За мною замыкаўся і патухаў свет спадманлівага майго дзяцінства. Я варочаўся ў свет няўтомнага, прагавітага, найпрыгажэйшага нашага жыцця. У палявой торбачцы я вёз запіскі апавядання і пару новых, зялёных шкарпэтак.

Менск,
1933—1934.

Я НЕ ВИНОВАТ, ЧТО МОЯ ЮНОСТЬ ПРОХОДИЛА В УСЛОВИЯХ, КОГДА МИР, ОКРУЖАЮЩИЙ НАС, БЫЛ СТРАШЕН.

Ю. ОЛЕША.

Яшчэ пра гордасць

ГАЛІНЕ ГАММЕР

I

Я часта думаю пра патомства. Доўгімі гадзінамі я праседжваю ў скверы каля агароджанае пляцоўкі, дзе ў пяску забаўляюцца дзеці. Подаўгу я гляджу ўслед піонерскай калоне, калі дружна, весела, бесклапотна—песенным морам—яны адпраўляюцца ў лагеры. Колькі звонкасці і галасоў! Які прыгожы час чалавека! У празрыстай перспектыве гадоў я бачу іх дарослымі. Я сілюся разгадаць іх духоўны свет. Якія будуць у іх адчуванні? Якія дачыненні адзін да аднаго? Мабыць, зусім не падобныя на нашы. Якія ў іх будуць паняцці дружбы, любові, нянавісці, рэўнасці, страху, адвагі? Мне цяжка разгадаць гэта. Гэта не ўкладаецца ў рамкі майго ўяўлення. Але цвёрда я ведаю і адчуваю адно—у іх будзе гордасць. Гордасць за свае жыццё і за бацькоў, якія яго тварылі.

Я зайздрошчу ім, гэтай новай фармацыі чала-

вечае годнасці. Іншы раз я ўяўляю, што ў мяне ёсць сын. Трывожна і радасна я бачу яго непадобнасць да мяне. Ён уваходзіць у жыццё новымі шляхамі, каторых не ведалі да яго людзі. Вось ён стаіць перада мною—русавалосы, з жывымі, чыстымі вачыма, у якіх свеціцца свой свет невядомага мне дзяцінства. Ён толькі што прышоў з піонератрада. Ён пытаецца ў мяне:

— Тата, раскажы мне што-небудзь пра рэволюцыю. Ты-ж яе памятаеш.

Гэтае запытанне напаўняе мяне гордасцю перад сынам—я, яго бацька, памятаю рэволюцыю. Я магу расказаць яму пра яе. Як добра быць такім бацькам!

Я расказваю. Сын з захапленнем слухае. Яго чыстыя вочы загараюцца прагавітасцю. Ён зноў пытаецца:

— Тата! А якія ты маеш заслугі перад рэволюцыяй?

Ён нецярпліва глядзіць у вочы. Я бачу, што яму гэта вельмі важна, вельмі патрэбна. Ён пытаецца гэта, каб ведаць, ці мае ён права гардзіцца. Гардзіцца мінулым сваіх бацькоў.

Так, гэта будзе іхная радасць. Яны будуць пытацца пра нас. Яны будуць берагчы памяць пра нашы дні, як сваю славу.

II

Мы таксама гардзімся і нават самі гэтага не заўважаем. Мы гардзімся блізкімі, таварышамі, знаёмымі і нават тымі, каторых не ведаем.

У мяне быў прыяцель. Ён цяпер у Маскве, у Інстытуце горных багацціяў. Ён аднойчы зайшоў да мяне і назваўся земляком. З гэтага пачалося наша знаёмства. Ён займаўся на рабфаку. Ён часта заходзіў да мяне, каб падзяліцца сваімі вынашанымі і нікому яшчэ нерасказанымі думамі. Ён палучаў лісты з калгаса і ўсякую навіну прыносіў да мяне, каб разам яе перажываць.

Ён быў інвалід. У яго была пакалечана правая рука. Яна вісела цяжкая, непатрэбная, іншы раз бездапаможна шавелячыся ў рукаве. Я прывык да яе так, што нават не заўважаў яе і ніколі не запытаўся пра прычыну калецтва. Мы праседжвалі цэлыя вечары ў гаворках. Я круціў яму папяросы, даваў прыкурваць; на хвіліну перарываўся яго спакойны, павольны голас, каб пасля зноў загаварыць з першай выпушчанай зацяжкай дыму. Нашы гаворкі былі наглядным падарожжам па нашай краіне. Пачынаючы ад калгаса, яны забіраліся ў Кіраўск, падымаліся над Кубанню, купаліся ў гарачых пясках Кара-Кумаў, плылі палявымі дарогамі, абвейваючыся ласкавым шэптам спеючых ніў чарназём'я.

Аднойчы мы ўзгаварыліся пра грамадзянскую вайну. Гэта быў вечар успамінаў і стоеных у памяці хваляванняў. І толькі тут выявілася, што ён—чапаевец. Следам гэтых далёкіх паходаў асталася ў яго пакалечаная рука і яшчэ чатыры раны, параскіданыя па целе. Прабіта плячо, прастрэлены грудзі, недзе ў галёнцы яшчэ і дасюль астаўся

сядзець чарапок, даючы сябе знаць у лядайкую пагоду. Ён хваляваўся. Ён расказваў і нанава ўсё гэта бачыў. Ён уваскрашаў далёкія дні і ажыўляў іх гарачаю крывёю сваіх ран. Я бачыў, як мылася ў крыві зямля. Я бачыў стэпы, лясы, пераправы, атакі — неймаверную смагу людзей і іх волю. Я бачыў гады геройства і мужнасці. Яны грымяць у памяці стрэламі і палыхаюць агнямі надзей і смерцей, гэтыя гады. Яны неўміручыя і будуць звінець у вечнасці, як песня, гэтыя гады. Прыяцель хваляваўся. Я глядзеў на яго і ён мне здаваўся незнаёмым. Я толькі цяпер як след яго ўбачыў. Я яго пачаў адчуваць, як чалавека, каторы даўно ўжо ўсяліўся ў цябе. Як дзіўна пазнаюцца людзі! Я чуў, як падымаецца ва мне гордасць. Мне здавалася, што толькі цяпер я заўважыў і руку. Я любіў гэтую руку; мне хацелася паціснуць яе ў падзяку, і ў яе пакалечанасці я бачыў цяпер вялікі сэнс—цану чалавечае мужнасці.

Гэты вечар быў вечарам дружбы і вялікага чалавечага хвалявання.

III

Яшчэ ніколі ніхто не забываў свайго дзяцінства. І якое-б ні было яно—добрае, ці лядайкае—яно заўсёды астанецца ў памяці, як радасць чалавечага нараджэння. У ім астаюцца дні непаўторнае прыгожасці. У ім многа сонца, бесклапотнасці, першых непатухаючых уражанняў. Слаўная пара чалавечага фармавання—дзяцінства.

Яно прайшло ў мяне крыкамі імперыялістычнае мабілізацыі. Недзе ў сутонні свае памяці я бачу, як плачуць мацяркі, развітваючыся са сваімі сынамі. І нейкія недарэчныя, як вар'яцтва, песні. Пасля—далёкія, ледзь улоўныя стрэлы гармат на фронце. Адступленне рускай, падточанай ужо рэволюцыйнай падпольнай работай, арміі. Людзі прыслухоўваюцца трывожна да выбухаў. Вечарамі яны прыпадаюць да зямлі, каб прыложаным вухам пазнаць—набліжаюцца ці аддаляюцца гэтыя выбухі ў параўнанні з учарашнім вечарам. Пасля бесперапынны лёскат калёс па шашы—несканчоныя збежанскія хурманкі. Колькі гора, няшчасця, плачу! Па дарозе, паабапал шашы, павыросталі ад гэтых уцёкаў адзінокія курганкі, паўстаўляныя бярозавымі з карою крыжамі і абгароджаныя калючым дротам. І толькі пасля гэтага пачалося галоўнае, што няўхільна падрыхтоўвалася ўсімі няшчасцямі разам. Я памятаю мітынгі, нумар дзевяты спіскаў, немцаў, палякаў, балахоўскія банды, партызаншчыну і дэзертырства—усё гэта параскіданымі эпізодамі паставалася ў памяці. Але я ведаў, што любяць большэвікоў і ненавідзяць буржуяў. І толькі пасля ўжо, калі сам я ўсіх пабачыў—я меў і свае сімпатыі. Я насіў у лес пастухам ежу і па дарозе заносіў хлеб чырвонаармейцам часавым. Яны мне давалі патроны. Яны мне давалі вінтоўку, каб я застрэліў на вяршаліне бярозы сіваваронку. Мне стукнула прыкладам у плячо; я рагатаў, рагаталі чырвонаармейцы. Калі зноў

прышлі франтаватыя і фарсістыя патрыёты Паспалітай жэчы—я ўпершыню пачуў прыклад не ў плячо, а ў самыя грудзі. Я не любіў іх. Я ненавідзеў іх нахабнай самаўпэўненасці, нагаек і крыкаў. Ноччу я скраў у капрала цясак і закапаў у агородзе, пад прызбаю. Я краў патроны, хаваў іх пад стрэхамі і насіў у лес, у дуплё абгарэлага дуба.

І от—загрукацелі дарогі налоўленымі хурманкамі. Патрыёты ўцякалі за Нёман. Вечарамі наўкруга зіхацелі заравы пажараў. Я ўцякаў з хаты, подаўгу хадзіў і глядзеў на гэтыя страшэнныя ўспышкі неба. Як жудасна, калі здаецца, што гэта падпалена сама ноч і яна зіхаціць і палыхае ў цемры. Я чуў далёкія стрэлы з лясоў і ўзрывы на шошавых мастах. Сёлы пусцелі. Ноч вар'яцела агнямі і трывожнымі шорахамі. Раніца нарадзілася ў цішыні. Здавалася, яна хацела адпачыць ад стомы і жахаў.

Я выходзіў з лесу на палянку, каб дабрацца да абгарэлага дуба. Я ўглядаўся ў узлесак і нікога не бачыў; шаг мой смялеў. Раптам яго абарваў проста перад вачыма бырзнуўшы стрэл. Я кінуўся назад і стрэлы нарадзіліся з усіх бакоў. Насустрач мне нёсся лес, б'ючы мяне па твары, па пальцах, раздзіраючы рубашку, колючы ў пяты сукамі сухога галля. У выжарай імшарыне я кінуўся між куп'я. Я ляжаў там, чуючы, як бзыкаюць у круглай высокай траве кулі. Я ляжаў там, пакуль не сціхлі стрэлы і тады зноў кінуўся бегчы, не чуючы сваіх

пакалечаных ног. Я знайшоў пастухоў за паўдня. Я прынёс ім прастрэленую шапку, і толькі цяпер пачуў боль на спіне. Яшчэ і цяпер я абмацваю пальцамі гэты маленькі шрам на паясніцы і ўспамінаю той дзень. Гэты раз я не прынёс ім патронаў. Але, дзяцінства, як люблю я цябе за тое, што ўсё гэта ты пакінула ў памяці, як дату майго нараджэння.

Мой сын! Ты бачыш, якія малыя мае заслугі і як упарта трэба іх дасягаць. Я таксама быў тады дзіцянём і зайздрошчу геройствам другіх. Але я іх бачыў і адчуваў. Я нашу іх у сабе, яе ганаровы падарунак майго дзяцінства, каб некалі пра іх расказаць і табе.

IV

Аднойчы прыяцель зайшоў да мяне, як заўсёды спакойны і спачатку маўклівы. Ён паздароваўся леваю рукою. Правая непатрэбна вісела, прыціснуўшыся сухою кісткаю к боку. Я памог распрануцца. На ім была новая, ваеннага колеру, рубашка, туга перахопленая шырокаю папругаю. Павесіўшы паліто, я зірнуў на прыяцеля і ад здзіўлення застыў. На левай грудзіне ў яго я бачыў ордэн Чырвонага сцяга. Я чуў, як ён расказваў мне пра франты, пра паходы, пра чэхаў, пра смагу, але ён ніколі не ўпамінаў пра ордэн. Я нават не ведаў, што ён мае такую высокую ўзнагароду.

— Чаму-ж ты дасюль не гаварыў мне пра гэта?— запытаўся я, гледзячы на ягоныя грудзі.

Ён паспрабаваў усміхнуцца, але замест усмешкі на твары сабралася безліч маршчын. Тарганулася і бездапаможна заварушылася падкурчаная рука.

— А ты не ведаў?—яшчэ ўсё сіліўся ён жартаваць.

— Чаму-ж ты яго не носіш?

Раптам маршчыны з усмешкі сабраліся ў суровасць. Ён уздыхнуў:

— Правільна.—Ён пачаў даставаць тытун. Я ўзяўся круціць папяросу.—Правільна—не нашу. Тут нават цяжка і расказаць табе—чаму. А от чаму—сорамна мне. Ордэн Чырвонага сцяга, а—невук. Ты-ж ведаеш, я—парабак. У грамаце ледзь разбіраў літары. Цяпер от вучуся. Стараваг ужо, але гэта нічога не значыць. Папробую выцягнуць. Думаю дабрацца да інжынера па якой-небудзь горнай справе. Прырода, зямля, горы, вецер. Люблю я гэта. Прывык да вятроў. Калі ўспамінаю—у мяне тады варушацца раны. Тады мне страшэнна хочацца, каб быць разам з усімі. А глянеш—адстаў. Гэта-ж увесь маладзеж, за які мы некалі біліся, абагнаў нас чорт ведае як. Цяпер трэба, выходзіць, даганяць ужо іх. І от, як дайду да гэтага—не брыдка будзе насіць і ордэн. От бачыш. Таму і не нашу. Можа гэта і не добра, але мне здаецца, што так, калі ты астаўся—у хвасце—дык ты, проста, яго зневажаеш сабою. Не вельмі зручна ганарыцца толькі мінулым,—заслугі трэба апраўдваць заўсёды.

Што я мог сказаць на гэта? Значыць слава, ге-

ройства—гэта толькі ўмоўнасць. Самі носьбіты іх гэтага не адчуваюць. Значыць ёсць нешта вышэйшае, што вызначаецца неўміручасцю чалавечых ідэалаў. Няма чалавечае гордасці за самога сябе, а ёсць гордасць за іншых, каб, гледзячы на іх, ніколі не таміцца жыць.

V

Хваляванні заўсёды бываюць большымі не тады, калі яны выклікаюцца з'яваю непасрэдна, а калі васкрасаюць у памяці і іх перажываеш зноў, як нешта далёкае, але сваё і дарагое. Тады ў іх удзельнічаеш увесь з цэлым комплексам іншых, табою ўжо асэнсаваных [за гэты доўгі час, адчуванняў. Іх нават успрыймаеш па-новаму—з-пад напласту гадоў твае бытнасці яны раптам прарываюцца далёкім тваім і звіняць, як знячэўку кранутая струна.

Нядаўна я зноў бачыў сваё дзяцінства. Быў сцюдзёны, бясснежны вечар зімы. На вуліцах у людзей дыханне ператваралася ў пару. На голых дрэвах парку туман ледзянеў у сусолкі і, стукаючыся, сусолкі зрываліся і падалі на зямлю. Людзі ішлі таропкімі крокамі, настаўляючы над плячыма высокія каўняры.

У зале таксама было сцюдзёна. Па навошчанай падлозе скрыпелі падэшвы і здавалася, што гэта людзі яшчэ ішлі пазмярзанымі ботамі па снезе. Скрыпелі і ляпалі адкіднымі сядзеннямі крэслы.

Каля мяне садзіўся ваенны і жанчына з высокімі, як скляпенне начнога неба, брывамі.

Экран патух разам з выключаным святлом у зале. Ён паволі пачаў ажываць імглою і шэраю муццю. І з імглы, з шэрае муці—з экрана—у залу ўварваліся гукі шамкоў. Яны пачуліся недзе з далечыні. Яны імкліва выросталі і набліжаліся. Яны мацнелі і рваліся ў публіку, запаўняючы залу. Людзі не ведалі, адкуль і да чаго гэтыя гукі. І от, калі здавалася, што гукам ужо няма куды дзецца—з імглы паявілася тройка. Запрэжаная ў тачанку, яна шалёна неслася па дарозе, крута паварочваючыся на паваротах, падымаючы пыл, хаваючыся ў пылу і ў чалавечых крыках. З тачанкі відна была паднятая рука; яна паказвала ўдалячынь: туды неслася дарога, туды рваліся крыкі і туды страчыў кулямёт з тачанкі. Гэтак пачыналася карціна „Чапаеў".

І пасля—нельга было сядзець спакойна. Ты не быў гледачом, ты быў разам з чапаеўцамі, але ты бачыў, як хітра падкрадаецца вораг і табе хацелася крычаць, каб гэта пачуў Чапаеў. Нельга было сядзець спакойна. Я чуў каля сябе тонкае плячо Ліны. Тут нельга было быць чалавеку аддзельным; можна было быць—як адзін чалавек. Мы сядзелі, дыхаючы адным дыханнем. Мы да болю сціскалі адзін аднаму рукі, не чуючы гэтага. Я быў недзе далёка ад самога сябе. Я бачыў гады, якія крануліся майго дзяцінства. Я жыў уваскросшым далёкім жыццём, забытымі хваляваннямі, напаўняючы

іх адчуваннем дарослых год. Пасля я нёс усё гэтае бачанае жыццё з сабою. Перада мною нестухана стаяў чалавек, які, здавалася, прайшоў праз усю маю бытнасць. Недзе ў памяці звінела яго імя. Я шаптаў яго, паўтараючы толькі гэтае слова. І калі трэба было выйсці з трамвая, я звярнуўся да чырвонаармейца, і замест слова таварыш назваў таварыш Чапаеў. Словы народжваюцца паняццямі. Слова таварыш нельга было сказаць без Чапаеў. Па дарозе дахаты я нёс чужое жыццё, каторае стала даражэй, як сваё.

VI

І тады я зноў думаў пра патомства. З якою прагавітасцю яны будуць слухаць пра гады, каторыя нас узгадавалі. Нават мы, у каторых рэволюцыя прайшла дзяцінствам, глядзім на герояў яе з адчуваннем невыказнай любові і гордасці. І я думаў пра свайго прыяцеля. Ордэн Чырвонага сцяга ён перадасць свайму пакаленню, як слаўны пачатак новага чалавечага роду. Ён не адчуваў свайго геройства і славы—ён толькі збіраўся яшчэ іх дасягаць. Але за яго гэтае адчуванне насілі іншыя, каб знаць цану чалавека і ніколі не таміцца жыць.

Патомкі непаўторных нашых дзён—не застануць. Пра сваіх герояў яны будуць чуць толькі ў легендах. У празрыстай перспектыве гадоў я бачу іх, і вітаю гэтае шчаслівае пакаленне. Я сілюся ўявіць свет іхнай маралі і адчуванняў. Якія ў іх будуць паняцці дружбы, любові, нянавісці, рэўнасці, страху,

адвагі. Мне цяжка разгадаць гэта. Але цвёрда я ведаю адно—у іх будзе гордасць. Гордасць за знатных людзей рэволюцыі. Гэта будзе пачаткам іх біяграфіі. Яны будуць берагчы памяць пра нашы дні, як сваю славу.

Так.

Менск.
Снежань—студзень, 1934—1935.

На выстаўцы

I

Часта я сустракаў чалавека, каторага, невядома чаму, паважаў. Я не мог-бы растлумачыць, чым падкупаў мяне гэты чалавек, але мне падабалася і яго постаць, і хада, і нават тое, як ён апранаўся. Ён быў мастак. Я ведаў яго толькі здалёк, нават ніколі не чуў яго голаса, і ўсё-ж у маім уяўленні ён вырысоўваўся да таго пуката, што, здавалася, быў маім даўнім знаёмым.

Гэта быў гадоў 28 мужчына, невысокі, можа нават крыху таўставаты, але шчытны і стройны. На чыста выбрытай яго галаве ляжаў роўны, спакойны загар. Вочы некуды вечна глядзелі паверх галоў; яны то ажыўляліся, то патухалі, жывучы нейкаю прагавітаю думкаю. На твары-ж ляжала алімпійская спакойнасць. Я ніколі не бачыў, каб ён смяяўся. Я сустракаў яго кожны раз мелькам, калі ён праходзіў, і ў зроку заўсёды аставаўся

яго партфель, кароткая моцная шыя, круглыя плечы і цвёрды шаг. Хадзіў ён надзеты надзвычай проста: касаваротка, цесна падпяразаная раменным поясам, простыя роўныя штаны і боты. Гэта чамусьці пасавала да ўсяе яго фігуры і ствара́ла ўражанне сур'ёзнасці, важкасці і нейкае, я сказаў-бы, сілы. Я паважаў яго, мабыць, за гэтую сілу. Я пераносіў яе і на яго творчасць. Якія, мабыць, глыбокія і змястоўныя ў яго рэчы. Як у Мікеля Анджэло ці Леанардо да-Вінчы. Эпічныя, размашыстыя. Ён і сам от не падобен на іншых. Яму нават непатрэбен, як мешчаніну, вонкавы бляск, калі ён папоўнен прыгажосцю духоўнага багацця.—Якая вялікая воля і ўпартасць ва ўсёй яго постаці,—думаў я. Я бачыў у ім тып чалавека, у якім спалучаецца свая вузкая прафесія з размахам палітычнага дзеяча. Тайком я зайздросціў яму.

Да дваццацігоддзя імперыялістычнае вайны ў Доме мастака была наладжана выстаўка. Зала была ўстаўлена скульптурамі і карцінамі, у якіх адлюстроўваліся крывавыя дарогі вайны. Былі рэчы, што патрасалі сілаю жахаў, чалавечых ахвяр, калецтва, смерці. З групамі наведнікаў хадзіў тлумач. Перад намі стаяў грукат гармат, ляжалі чалавечыя трупы, піраміды галоў, рук, ног,—загінутых чалавечых жыццяў. Я бачыў перадсмяротныя мукі салдата, і яго аголеныя зубы—нема застыўшыя—здавалася крычалі, толькі цяпер зразумеўшы жахлівую праўду свае смерці. Я бачыў гісторыю са-

мае жудаснае вайны цывілізованага дзікунства, каторае завецца імперыялізмам.

У кутку аднае сцяны, унізе, віселі карціны, накіданыя на аркушах жаўтаватае паперы. Тлумач прайшоў міма іх, мелькам кінуўшы поглядам і сказаўшы пару слоў, у якіх была ніто зняважлівасць, ніто крыўда за іх прысутнасць. Калі прайшла група наведнікаў, я суняўся каля іх. Пад карцінамі стаяў подпіс майго мастака. Я пільна пачаў узірацца ў іх. Якое-ж было маё расчараванне, калі я ўбачыў неахайныя плямы, лініі, мазкі, якія павінны былі, відаць, паказваць людзей, а ў іх—прадстаўнікоў класаў—буржуазію і пролетарыят. На адной з карцін ляжаў чорны затушованы фон і на гэтым фоне напісаны брацкія могілкі, крыжы, паўплятаныя калючым дротам. На двух крыжах надзеты нямецкая каска і руская салдацкая шапка. Шапкі нахілены адна да аднае і павінны былі выражаць фігуры, што між сабою вітаюцца. Паводле подпісу гэта была „Разгадка вайны“: паказвалася адзіная сутнасць рускага і нямецкага імперыялізма, і гэты імперыялізм паказваўся ў вобразе салдат,—тых салдат, каторыя між сабою браталіся і рабілі рэволюцыю. На работах ляжаў след неахайнасці і бездапаможнасці. Мне стала брыдка ад гэтых карцін. Нечага стала да болю шкода—можа ашуканага свайго паважання.

— Якое ідэйнае ўбоства,—заўважыў нехта за плячыма ў мяне, дапаўняючы маю думку.

Я пайшоў з выстаўкі, несучы ў сабе прыкрасць.

І калі аднойчы зноў сустрэў чалавека—я доўга глядзеў яму ўслед. І ва ўсім: і ў гэтым брытым чэрапе, і ў спакойнай хадзе, і ў важкай фігуры я ўбачыў убогасць, самаздаволенае мяшчанства і пустату.

Менск, 1934.

Бацькі і дзеці

I

На зімовыя вакацыі школьнікам задалі напісаць тэму—як удзельнічалі ў Кастрычніцкай рэволюцыі вашы бацькі.

Колькавага бацькі не было дома. Яго чакалі з дня на дзень з камандыроўкі, але ўрэшце палучылі тэлеграму, што ў раёне ён астанецца яшчэ тыдняў на пару. Колька быў нярад—ён баяўся, што бацька не вернецца да канца вакацый і нічога не раскажа. А яму хацелася скарэй напісаць, і ён загадзя ўжо бачыў—як гэта будзе цікава.

Ён да таго захапіўся гэтаю тэмаю, што часта начамі не мог заснуць. Ён бачыў перад сабою вайну, салдат, гарматныя стрэлы, коннікаў з голымі шаблямі,—і яны нясуцца з крыкам—у дыме, у страляніне — праганяючы буржуяў. Усё гэта вельмі шпарка праносілася ў галаве, і ва ўсім гэтым мелькам паказваўся твар бацькі. Ён то нешта крычаў нема раззяўленым ротам і махаў рукамі,

то камандаваў, то нёсся наперадзе натаўпу, то абстрэльваў бронецягнік, то веў палоннага генерала. Колькава ўвабражэнне так разгаралася, што ў галаве пачынала шумець. Ён уяўляў, што ён ужо чытае гэта ў школе, і ўсе школьнікі слухаюць, затаіўшы дыханне. Пасля яны ўзбуджана глядзяць на яго. „От які адважны бацька ў Колькі",—перашэптваюцца яны. Колька рад. Яму хочацца з усімі гаварыць і яшчэ больш расказваць.

II

Неўзабаве трэба было ісці ў школу, а бацька не прыязджаў. Ён папрасіў, каб яму пра ўсё расказала мама. Мама расказала, таксама ўпамінаючы гарматы і неймаверныя страхі. Яна гаварыла пра Калчака, Балаховіча, пра бандытаў і большэвікоў, як ездзілі ў цяплушках і як не было чаго есці. Колька слухаў, затаіўшы дух, але з маміных апавяданняў ён мала разумеў—дзе-ж тут што рабіў бацька.

— І татка ўсюды там быў?—запытаўся ён.

— Ну, а як-жа. Твайму татку цяжка было, яго раз траха не застрэлілі.

— Мамка, а ён быў ранены?—прагавіта запытаўся Колька.

— Не, яму пашанцавала.

— А я сніў, як ён быў на вайне. У яго стралялі, а ён бег наперадзе ўсіх і таксама страляў, і ўзяў у палон генерала, і ён быў герой.

— Ну, але. Ты так і напішы.

— А гэта будзе праўда?

— А чаму-ж няпраўда. Ён-жа ледзь не памёр, калі ўцякаў ад белапалякаў і захварэў у лесе.

III

Пасля вакацый Колька ішоў у школу. Па дарозе яму сустрэлася Надзька, сяброўка яго сястры— Веры. Цяпер Вера была ў Ленінградзе і Надзька даўно не заходзіла да іх. Яны з ахвотаю разгаварыліся. Колька пахваліўся сваім творам. Гэтакія творы сёння ў школе будуць чытаць усе яго сябрукі.

— А гэта няпраўда, — выслухаўшы, сказала Надзька.

— Што няпраўда?

— Што ты гэтак напісаў пра свайго бацьку. Ён такім не быў.

— Яшчэ што выдумай. Мне мамка расказала.

— Твая мамка схлусіла.

— Як?

— А так. І не герой ён быў, а дэзертыр.

— Як!—перапытаў ужо здзіўлена Колька.

Надзька расказала усё, што ведала. Бацька не быў рэволюцыянерам. Ён хаваўся ад большэвікоў, уцякаў з балахоўцамі, і толькі пасля ўжо цішком вярнуўся і пачаў памаленьку абвыкацца.

— Няпраўда, гэта ты хлусіш!—ледзь не заплакаў ад крыўды Колька.

— Мой татка расказваў.

— Яго ледзь не застрэлілі, ён хаваўся ад белапалякаў у лесе!—апраўдваўся Колька.

— Не ад палякаў, а ад большэвікоў, кажу, і большэвікі яго ледзь не расстралялі за гэта,— не падавалася Надзька.

— Гэта ты ўпраўду?—яшчэ ўсё не верыў Колька.

— Упраўду.

IV

У школе было шумна. За вакацыі ў кожнага панабіралася навін і хацелася іх расказаць. Кольку было нявесела. Ён думаў—як-жа ён будзе чытаць хлусню?

На парце паселі ўсе яго сябрукі. Яшчэ і цяпер не пераставалі шаптацца. Урэшце настаўнік выклікаў Лёньку. Пачалі чытаць пасля і другія. Колька ўважліва слухаў. Ва ўсіх былі бацькі то партызаны, то старыя большэвікі, то маракі, то чэкісты. Усе нечым вызначаліся—хто браў Перакоп, хто даваў першы стрэл па Зімнім з „Авроры," хто быў недзе ў сібірскай тайзе. Шмат у каго былі ўзнагароджаны ордэнам Чырвонага сцяга. Мішкаў бацька меў ажно два ордэны—адзін за тое, што біўся разам з Чапаевым, а другі за пабудову завода. Калі кончыў Мішка чытаць—яму запляскалі ў ладкі. Мішка сеў на парту; увесь клас глядзеў на яго, нібы героем быў не яго бацька, а ён сам.

Кольку было сорамна і балюча. Ён зайздросціў сваім сябрукам. У іх ёсць чым ганарыцца і радавацца. А яму няма чым пахваліцца. Як паглядзяць

усе на гэта? Што яны скажуць? Яны нават перастануць дружыць з ім. Бацька дэзертыр, скажуць, хаваўся ад рэволюцыі. І нашто ў яго такі бацька? Чаму не такі, як у іншых? Толькі брыдка яму цяпер. Няхай-бы лепш не было яго, такога. Няхай-бы ён нарадзіўся дзе ў каго чужога.

Калі выклікалі Кольку, ён доўга мяў сшытак у руках. Ён не мог пачаць чытаць і не ведаў, як выгаварыць першае слова. Яму хацелася плакаць.

— Ну, Колька, чытай, — падышоў настаўнік і цёпла пагладзіў па галаве.

Школьнікі глядзелі на Кольку, чакаючы. Тады Колька не вытрываў.

— У мяне няма бацькі. Я не хачу мець такога! — з крыўдаю выкрыкнуў ён і, упаўшы галавою на кулачкі, горна заплакаў.

Менск.
Снежань, 1934.

Смерць

Я ішоў па вуліцы адзін, задумаўшыся. Я думаў пра апавяданне, каторае збіраўся пісаць. У ім павінен быў паміраць дзядуля, каторы страшэнна хацеў яшчэ жыць і зайздросціў маладосці і сіле. Старэнькі, ён яшчэ хадзіў на фізкультурныя парады, каб глядзець і любавацца на юную нашу дужасць.

Мне трэба было напісаць яго апошнія хвіліны. Я думаў пра смерць. Я ўяўляў перад сабою хворага чалавека. Яму цяжка дыхаць. Яму не хапае паветра. Вакол яго людзі—знаёмыя, блізкія, сваякі. Нехта кажа, што трэба выклікаць доктара. Усім вядома, што няма ніякіх надзей, каб ён ачуняў, але думка пра доктара раптам дае ўсім гэту надзею.

Чалавек дажывае апошнія хвіліны. Ён прагавіта ўглядаецца ў рэчы, у людзей, раптам адкрываючы ў іх новыя, раней не заўважаемыя ў іх рысы і яму шкода, што дасюль ён пра іх не ведаў, і што цяпер ужо больш іх не ўбачыць. Я гляджу на

яго. Я сілюся разгадаць яго перадсмяротныя адчуванні. Я прасякаюся імі так, што непрыкметна сам апыняюся на яго месцы. Гэта я ляжу ў пасцелі. Гэта мне цяжка дыхаць; я адчуваю, як мутнее мая свядомасць і недзе ў ёй цепліцца яшчэ кавалак надзеі на доктара. Я таксама веру ў яго. Я хачу жыць. Як хочацца мне выйсці на двор, дзе сонца, дзе людзі, дзе так многа пахаў і галасоў і на ружы каля ганка звісае вялікая, цяжкая кветка. Я сілюся нешта выгаварыць. Я ўспрыймаю ўяўленне чужое смерці, як рэальную маю небяспеку.

І от у гэты час маіх думак на рагу бліснуў— успыхнуўшы прарэзліваю сірэнаю і чырвонымі крыжамі — кузаў хуткае дапамогі. Я рвануўся бегчы. На адзін малюсенькі момант у крайку ўсведамлення здалося, што гэта паехалі да мяне, калі, не ўспеўшы пераключыцца ў рэальнасць, я ляжаў на пасцелі дзядулі.

І калі ўяўленне вярнулася ў рэальны свет адчуванняў—я пачуў, як дрыжаць мае калені, як усхвалёвана б'ецца сэрца: я задыхаўся.

Я азірнуўся наўкруга. І такім прыгожым здалося мне жыццё, нібы толькі цяпер я як след зразумеў яго. Я быў рад, што я жыву; я быў самы шчаслівы. І калі сустрэўся мне прыяцель,—я загаварыў, перабіваючы яго без дай прычыны:

— Як хораша. Ты толькі паглядзі, як сёння хораша! Чаму ты не радуешся?

Слепата

Аднойчы я адпачываў на Каўказе, у Хосце. За адным сталом са мною абедала жанчына Ласка. Я ведаў, што яна акторка і таленавітая спявачка.

Яна заўсёды прыходзіла крыху пазней за другіх, ветла віталася і садзілася на край стала. Яна трымалася сціпла і ціха, гаварыла скупа, але цёпла і разумна, заўсёды пакідаючы пасля сябе прыемнае і багатае адчуванне. У яе была нейкая адмысловая жаночая цеплата і прывабнасць, катора не кідаецца ў вочы, а пазнаецца разам з самім чалавекам.

Мы часта хадзілі з ёю ў горы, лазячы па пяшчорах ды скалах. Штораніцы мы сустракаліся на моры; я прыходзіў з усходам сонца і заўсёды заставаў яе ўжо там. Перад тым як акунуцца ў ваду, яна займалася гімнастыкаю. Мы здалёк віталіся, махаючы над галавою рукамі. Мы купаліся ў ранішняй марской здаровай вадзе, і варочаліся дахаты, калі нашы калегі яшчэ толькі ўставалі з пасцеляў. На сняданні я зноў сустракаўся з Лас-

каю, і на маё прывітанне яна ўсміхалася сваімі да слепкасці белымі зубамі. Калі за сталом яе крэсла доўга аставалася пустым,—я нудзіўся і чакаў яе.

Аднойчы з калегам мы ляжалі на гарачым беразе, жмурыліся ад сонца і глядзелі на мора, разгадваючы на гарызонце далёкі дымок парахода. Калега, без ніякае прычыны, загаварыў:

— А слаўная жанчына твая суседка.

— Ласка?—запытаўся я.

— Але. Толькі шкода, што ў яе гэтак з вокам. Ты бачыў, што ёй самой нялоўка і яна стараецца не глядзець у твар, калі гаворыць?

— А што ў яе з вокам?

— Яно-ж не бачыць. Хіба ты не заўважыў, што яно зацягнена туманком?

— Гэта не ў Ласкі,—рэзка не згадзіўся я.—Ты можа думаеш пра каго другога.

— Як! Хіба ты дасюль і не ведаў?—зарагатаў мой калега і пачаў пакепваць з мае няўважлівасці.

Сустрэўшыся з Ласкаю, я знарок прыгледзеўся і адразу заўважыў тое, чаго не бачыў дасюль. Так, левае вока ў яе было з туманком і шмат вузей за другое. Як-жа гэта я дасюль не ведаў пра гэта?—дзівіўся я.

І пасля, калі-б я не сустракаўся з Ласкаю, я перш за ўсё бачыў яе пакалечанае вока.

Старасць

ЗАІРУ АЗГУРУ

I

Скульптараў дзень быў пачаўся так:

Ён доўга дамагаўся нейкага таемнага завяршэння формы, каб фігура набыла душу. Пальцы слізгалі, то прыкладаючы, то сціраючы гліну. З кожным разам фігура набывала новы характар, але ўсё не той, якога шукаў скульптар. Пальцы пачыналі хваляваццa. Але, урэшце, апошні мазок успыхнуў. Скульптар таропка адышоўся, спатыкаючыся на табурэтку. Малюсенькая, непрыкметная рыска каля воч—і фігура пачала жыць. Гліна загаварыла.

Маршчынамі каля губ скульптар усміхаецца і падыходзіць зноў... Але папраўляць больш нічога не адважваецца і толькі беражліва ўкрывае мокрым рыззём. Няхай правяне, а ён лепш зробіць праходку.

Гэта ўсё-такі вялікая рэч—выйсці на вуліцу

і панесці з сабою радасць. І гэта ўсё-такі добра, калі ў цябе радасць да таго вялікая, што яе хочацца паказаць на людзі. От-жа няхай паглядзяць, і, калі хочуць, пазайздросцяць чужому шчасцю ад удала скончанае работы. Або няхай сабе і не заўважаць, і ўсёроўна песня радасці не паменшае. Як слаўна насіць яе плённую грузнасць!

Халаднаватаю вадою з-пад крана скульптар вымывае рукі. У яго такі вялікі подым, што ён глядзіцца ў люстэрка. Але вось маршчыны ад губ, што былі асталіся яшчэ ад усмешкі, паступова пераходзяць на лоб і там вырэзваюцца напружанымі складкамі. Ён прыгінаецца бліжэй да люстэрка і пільна ўглядаецца. Гэта ён даўно не бачыў самога сябе і цяпер знайшоў новую трывожную прыкмету. Ад скроняў і да самае патыліцы— тлустыя палосы сівізны. Да таго тлустыя і незнаёмыя, што нават здаюцца чужымі. Але ўсё-ж такі гэта свае, бо аж чутны пад рукамі.

— Няўжо так трагічна шпарка можа прыходзіць старасць?—з жахам думае скульптар.

Складкі на ілбе камянеюць надоўга. Ад радасці не асталося нават і следу—яна адляцела, як спадманная веянь.—Але—старасць.—Скульптар адыходзіць ад люстэрка і нават пачувае яе наяўнасць. Грузнае, цяжкае цела. Таропкі, баязлівы шаг. Вяласць. Раптам ён чуе, што і сярэдзіна ў яго ные, і рукі ўсёадно як чужыя. Дзіўна, значыць ён не заўважаў свае стомленасці таму, што быў узрушаны, што арганізм жыў уздымам. Якая няўхіль-

ная логіка. Вот ляпіў і не ведаў, што аддаў у гліну кавалак сябе. А самога сябе ўжо не вернеш. Пагібель таксама, як і росквіт, набывае інерцыю, і ў яе ёсць таксама свой подым. Страшна...

Скульптар доўга сядзіць, задумаўшыся. У майстэрні пахне размочанаю глінаю. Каля сцяны стаіць штук колькі парожных варштатаў. Відаць, што на іх таксама некалі мелася пачынацца работа— кавалкі гліны паўсыхалі на іх і патрэскаліся. З боку валяецца патрушчаны гіпс.

Перад ім толькі што скончаная фігура прэе пад мокрым рыззём. Але скульптар пераводзіць вочы на другую, што стаіць у кутку—высокую, пад белым прасцірадлам. Прасцірадла абцякае складкамі да таго тонкімі, спакойнымі, што фігура пад імі, здаецца, дрэмле, або прытаіўшыся, марыць. І ў гэтай белай спакойнасці яна здаецца зданем.

Скульптар глядзіць на фігуру доўгім, забытым позіркам. Рукі ляжаць на каленях, і крывая лінія спіны, выгнуўшыся, застыла. Гэта, забыўшыся, ён глядзіць у самога сябе. Адале паволі ўстае і баязліва падыходзіць да здані. Асцярожным дотыкам рукі ён падымае край прасцірадла, але больш не адважваецца. Гэтак хвілін колькі стаіць, пасля рыўком выкідае прасцірадла з рук і, над сабою падымаючы горб, таропка выходзіць з майстэрні.

На прасцірадле, выпушчанымі складкамі, асталіся папялець сляды пальцаў.

II

Праходка трохі заспакоіла скульптара. У скверы ён адшукаў сабе парожную лаўку. Ад дрэва падаў густы цень і на плечы прабіваліся ад сонца лапінкі. Капялюш скульптар паклаў каля сябе на лаўку. Па галаве плавала свежасць ад ценю. Праляцеў матылёк. Людзі, праходзячы, забаўлялі ўвагу. Іншы раз вочы натыкаліся на характэрных тыпаў і ўглядаліся ў іх больш прычынна. А іншы раз яны хапаліся абы за каго і праводзілі да таго часу, пакуль форма чалавека ўжо прападала, а аставаліся адны толькі ногі. Яны неяк дробна махаліся і смешна блыталіся адна за адну. Адале на гэты сілуэт наплывалі іншыя, і ног рабілася калейдаскапічна багата.

— Гэта як у крывым люстэрку. Гледзячы адкуль у яго зірнеш. У суб'ектыўным акуляру ўспрыймання от гэтак пачварна можа крыўляцца ўсё чалавечае жыццё. І папрабуй, знайдзі тады той пункт, адкуль можна было-б глядзець на яго правільна,—падумаў сам сабе скульптар і хацеў усміхнуцца. Складкі сабраліся толькі на адным краі губ.

Адале скульптар пайшоў далей па вуліцы. Сонца пакошвалася на вечар і пачынала вышчэрбвацца аб рубцы камяніц. На тратуарах раставала спякота і людзі зарушылі гусцей. Толькі на Карла-Маркса-вай вуліцы ад іх паслабчэла.

Раптам збоку пачулася чужое захлібістае дыханне. Па вуліцы, пераганяючы адзін аднаго, пра-

беглі два фізкультурнікі. У памяці выразна зафісаваліся іхныя косыя постаці. Гэтак-жа нарапкам прабеглі і яшчэ тры фігуры. Скульптар здзіўлена азірнуўся назад. Адтуль паказваліся новыя бегуны, абганяючы вуліцу і штораз ганчэй закідаючы шаг. На тратуарах пачынала гусцець людзей.

— Бягі. На спаборніцтва,—падумаў скульптар, і пачаў прыглядацца да фігур больш прычынна.

Неўзаметку ўвага перарасла ў цікавасць. Чужая напружанасць перадалася яму. Скульптар гарачкава хапаўся зрокам за кожную фігуру і ўпіваўся ў яе магнетычна. Нават не заўважыў, як сышоў з тратуара, прабіваючыся на сярэдзіну вуліцы. Людзі беглі напорным замашыстым шагам, і на косым святле адвячоркавага сонца адпалітуроўвалася бронзавая рытміка іхных мускулаў.

Скульптар узрушыўся. Ягоны твар успыхнуў і на негатыве воч перакуленаю праекцыяю загарэўся адлюстровак вонкавага свету. Ён знайшоў той пункт, адкуль правільна можна было сузіраць чужое жыццё.

Ён бачыў усяго чалавека, пачынаючы ад маленства і канчаючы ягонаю старасцю. Вось крохкае дзяцінства з першымі баязлівымі крокамі. Адале гарэзнасць, дураслівая бесклапотнасць, гады залатога вучнёўства. І памалу, зусім непрыкметна, чалавек афармляецца ў дарослaсць. Свет пачынае ўскладняцца, шырэць. Паяўляюцца першыя сумлівы, жаданні, доўгія, шчымлівыя вечары лірычнае прагі. І аднойчы чалавек заўважае, як крута ён

паіначаў, паіначалі вакол яго рэчы, разуменні і нават дачыненні да тых, што кагадзе былі сяброўкамі ў гульнях, а гэта непрыкметна пасталі жанчынамі. Новым рупескам пачынае муляцца свет. Гэта бунтоўная, шырокая маладосць хоча выліцца ў сталасць. І вось чалавек ужо ўвесь— спелы, набраклы, як поўдзень. Ён ідзе радасны, поўны, нават не ведаючы да чаго лёгка насіць яму сваю дужасць.

Вот бягуць яны перад ім. Скульптар глядзіць на гэтую бронзавую смугласць і раптам бачыць новую, дасюль непазнаную, логіку. Гэта-ж не проста спорт, якім займаецца выпешчаны ў тупасці ды ў лагодзе свет цывілізацыі, каб прабаваць свой час, а гэта-ж праекцыя асэнсаванае дзейнасці. Якая вялікая воля ў гэтай заўзятай гарэзнасці. Вясна чалавечае сілы! Ім жыць яшчэ цэлую вечнасць! Яны панясуць сваю дужасць запалам разумнае дзейнасці. Самым найбольшым правам тварыць. Росквітам чалавечай дапытлівасці і мыслі. Пакалення шчаслівага часу і разумнага сэнсу жыцця. Як буйна яны берагуць сваю маладосць. І як прагна яшчэ хацелася-б жыць, каб разам з імі пайсці ў іхнае заўтра. І каб мець хоць адзінае права—любіць і цалаваць вось гэтыя запечаныя губы чалавечае смагі. Жыць-бы чалавеку такім увесь век!

Але адсюль пачынаецца ўжо і старасць.

Негатыў скульптаравых воч патухае. Ён думае пра старасць і ў ёй бачыць самога сябе. Яна заўсёды,

мабыць, прыходзіць да чалавека не ў час. Тады, калі чалавек самашто пачынае ўваходзіць у мудрасць, калі ў самастойную сілу фармуецца мысль. Прайшоўшы праз практыку ўласнага жыцця і ўвабраўшы культуру папярэднікаў, яна робіцца іх завяршэннем. І ў гэты час свайго росквіту павінна памерці, бо ў любую хвіліну можа памерці цела. Вось логіка разумнае дужасці. І дужасць трэба набіраць з маладосці.

— Жыць-бы маладым чалавеку ўвесь век, — уголас паўтарае скульптар.

— Вы пра гэты парад?

— Але, пра парад.

— Глупства.

— Пра здаровага чалавека і пра разумную старасць.

— Глупства, — матэрыяльна важка намагаў голас.

Скульптар азірнуўся. Чалавек вырас не адразу. Ён паявіўся з-за лакця высокім плячом і тонкім, скептычным профілем твара. Скульптар паглядзеў на яго доўгім позіркам.

— Чаму вы хочаце абазваць гэта глупствам?

— Бо вы бачыце толькі адзін бок чалавека, — адказаў тонкі профіль.

— Як вас зразумець?

— Проста, больш пільна зірнуць вось на гэтую дзікасць. Што вы бачыце разумнага ў заалагічнай зайздрасці адзін аднаго перагнаць?

— Я бачу разумнае ўдасканаленне чалавека. Каб

ён быў гордым прадуктам прыроды і разумным носьбітам яе.

— Каб ён быў дурнем?

— Я вас не разумею, малады чалавек.

— Манія! Вы разумееце, манія фізічнае сілы,— горача загаварыў спадарожнік. — Я ненавіджу. Бадай пагалоўна ўвесь маладзёж. Цэлыя дні на пляцоўках. Выпала ў яго вольная хвіліна, і ён ужотам. Мускулы сталі хараством. Загарэлае цела— модаю. Ні паэзіі, ні музыкі ім не патрэбна. Чума. І вы заўважалі: па вуліцы ідзе чалавек. Ён здаровы. У яго з каўняра выпірае шыя. І ён знарок надзяе майку, каб відны былі біцэпсы. А папробуйце загаварыць з ім на любое пытанне, якое-б выходзіла за межы ягонае прафесіі, і ён нічога вам не адкажа. Вось яго хараство. Любуйцеся на ягоныя мускулы. Толькі не гаварыце з ім, бо ўсё хараство рыне, як камень у воду. Ён зусім аднабокі. Тупы, лёгкаважны, як Тарычэлева пустата. Гэта вам другі бок чалавека. Дужы як бык, затое такі самы і дурны.

— Вы хворы,—коратка заключыў скульптар.— Вы не бачыце цэлае эпохі. Вы не бачыце самае разумнае эпохі, малады чалавек.

— Каторая бегае па вуліцах у трусіках?

— Каторая любіць сваю рэспубліку і жыве для яе.

— І гадуе ёй прымітыўных экспанатаў?

— І гадуе ёй самых лепшых людзей. Самых здольных.

— З пурытанскім духам і з мускуламі, што робяцца стылем эпохі?

— Вы ходзіце ў тэатры, кіно? Бываеце ў бібліятэках, універсітэце?—перабіў раптам, сунімаючыся, скульптар.

— Мне няма чаго там рабіць.

Скульптар:—Шкода. А вы-ж гаворыце пра паэзію і музыку і нават самі яе не ведаеце. А яны там бываюць і самі памагаюць яе ствараць.

Спадарожнік:—Не бачыў.

Скульптар:—Гэта пад майкаю і за мускуламі і гэта ўбачыць трудней... І прайдзіце ўвечары, калі ў залах чыталень гараць агні. Шмат каго з іх вы там пазнаеце. Вам будзе пра што гаварыць з імі, калі вы знойдзеце ў сябе крыху больш мыслей. Вы ўбачыце, хто з вас больш лёгкаважны. І тады пазнаеце стыль эпохі, пра які намагаецеся гаварыць.

— Энтузіяст!—пагардліва абарваў спадарожнік.

— Хто-ж з нас бачыць толькі адзін бок чалавека?—запытаўся спакойна скульптар.

Спадарожнік крута скрануўся і пайшоў паперадзе.

Скульптар глядзеў на яго спакойна. Чалавек быў даўгі, выгінасты, як буслава шыя. Ён насіў паласатыя майткі і навыпуск кашулю, тонка перахопленую паяском. З каўняра выбягаў востры кадык. Галава на ім сядзела высока і на кожнай ступе, як у кітайскае лялькі, угіналася. Адале відно было як чалавек закашляў. Ён кашляў захліб-

ста, і на гэты час відно было, як завастрыліся яго-ныя плечы і выгнулася тонкімі пазванкамі спіна. Тады ён сударгава выхапіў хусцінку і аберуч паднёс яе да губ. Праз кашаль ён сплёўваў і корчыўся.

Раптам ён скульптару здаўся вельмі стары. Мізэрны, пакалечаны, з паталагічна развітым пачуццем пагарды. Такія людзі, звычайна, ненавідзяць тое, што самім ім хацелася-б мець. Яны ненавідзяць ад зайздрасці.

— Вы занадта стары. Вы на шмат старэй за мяне, малады чалавек. Вы—смерць,—нагнаў яго скульптар.

III

Прабегла жаночая партыя. Іхныя грудзі заносіліся высока, напінаючы цела. Скульптару выдалася, як адна фігура настойліва выпярэджвала іншых. Яна вылучалася сілаю стройнае пругкасці.

— Як Найда,—ажывіўся новаю іскраю скульптар.

— Каторая?

Скульптар:—Што выпярэджвае. Як мая Найда, каторую я выляпіў.

Спадарожнік:—Я-ж казаў—пурытанка.

Скульптар:—Якая харошая спеласць. Не цела, а—песня.

Спадарожнік:—І яно без душы. У ім нават няма нічога таго, што завецца жанчынаю. Ні лірыкі, ні ласкі, ні інтымнасці. Вы заўважалі, што

няма пяшчоты кахання? Яно асталося толькі ў паэзіі. Дзе пачуцці? Няхай слабасці, няхай лірычная ўтома. Гэта хораша. Каб перад вамі паўстала ўся жанчына. З гарачым дыханнем свае прыроды. І я шукаю яе, от такое, сапраўднае, а не дэлегаткі, што носіць мужчынскую шапку і вытраніроўвае мускулы. І я не люблю гэтага цела, каторае страціла сваю інтымнасць і выносіцца на паказ, як у цырку.

— Гэта ад зайздрасці.

— Каму?

— Ім. Хараству. Лірыцы, ласкам, інтымнасці, што яны вам чужыя. Не вялікая філасофія—быць нездаволеным: гэта ад адзіноты і слабасці.

— Мараль?

— Вы яе кахаеце?—раптам запытаўся скульптар.

— Я яе ненавіджу.

Скульптар:—От я-ж і кажу: ад зайздрасці. Што яна не можа па-рабску належаць вам. Вы—эгаіст.

Спадарожнік:—Я—лірык.

Скульптар:—Яе безнадзейны шукальнік.

Абодва змоўклі. Вуліца цякла людзьмі. Знаёмы прафесар паказаўся збоку, алё ен не заўважыў скульптара. Ён заўзята прабіваўся наперад, гледзяючы недзе над галовамі і, то знімаючы, то надзяючы назад пенсне. Нехта знячэўку штырхануўся аб локаць, выбіваючы з рук капялюш. Нехта мігнуўся, перабягаючы вуліцу. На рагу, па панелі, пакульгваючы, адыходзіла ўбок дзяўчына. Яна

была ў трусіках. За ею паявіўся мужчына. Ён злавіў яе за руку і ўзяўся за стан, памагаючы ісці. Па сценах сачылася сонца. На сцягне і на трусіках у яе ляжала густая палоса зямлі. Мабыць з ёю здарылася няшчасце ў бягах. Мужчына хваляваўся і, моўчкі, вачыма пытаўся пра боль. Але праз боль, гледзячы ў вочы, дзяўчына ўсміхнулася. Мужчына таксама ўсміхнуўся і ў вачах запалілася радасць.

— Ідзіце пазычце ў іх лірыкі і цеплыні—паказаў на іх спадарожніку скульптар.

Спадарожнік горда выпрастаўся з закладзенымі назад рукамі ён ішоў паперадзе скульптара і ступаў так, як-бы ўвесь свет быў у яго пад нагамі. Тонка сціснуўшы губы, ён глядзеў на жанчыну пагардлівым зрокам, знарок спадылба.

Скульптар здзівіўся. Ён раптам пазнаў у спадарожніку нешта знаёмае. Маленькім крайком паказалася ў ім нешта сваё. У памяці адразу паўстала Найда. Свая, вылепленая, пад белым прасцірадлам. Тая, каторая стала ягоным дакорам, і каторае ён баіцца адкрываць, каб не глядзець на яе. Тады ён адразу пазнае гэты спадарожнікаў эгаізм — як свой—і крычыць яму:

— Вы яе ненавідзіце, бо любіце. Бо баіцеся, што ў любы час яна будзе не вашаю! І зайздросціце, што не можаце быць там самі! Хадзем! Я хачу паказаць вам таго, каго таксама ненавіджу, бо люблю як лятунак!

IV

Яны ўзышлі па чыстых лесках ганка. Дзверы адчыніла жанчына з тоўстымі галёнкамі і з шырокімі грудзьмі. У карыдоры запахла патрушчаным гіпсам. Каля сцяны валяліся пабітыя бюсты. Без пальцаў з-пад нізу вытыркала рука. Паколаным жолабам напал распалася тулава. Адпалітурованая пад бронзу нечая галава ляжала шчакою ў падлогу, бялеючы краямі адбітае шыі і тлеючы пустатою, што заходзіла ў чэрап. Валяліся кавалкі фігур і нямелі руінамі. На іх закамянеў антыкварны пыл.

Спадарожнік хутчэй прайшоў у майстэрню. Пустыня жудасці пужала яго. Яна нагадвала чалавечыя трупы, над якімі яшчэ насілася дыханне смерці.

У майстэрні адпачываў спакой. На сценах віселі барэльефы, рэпрадукцыі антычных скульптур. З львінае шыі горда глядзела галава Леонардо да-Вінчы. Статуі розных велічынь і пастаў камянелі ў сваёй нерухомасці. На варштатах стаялі забытыя работы і недакончаныя іхныя рукі выглядалі абрубкамі. На падлозе, абсыпаючы гіпсавы попел, валялася пабітая маска дзіцяці. Прайшла жанчына, зачыняючы за сабой дзверы. Галёнкі яе калаціліся і пад ступнёю, ад дзіцячае маскі, храбуснуў чарапок.

У кутку, ападаючы складкамі, спакойна высілася белая постаць. Скульптар распрануўся ўзру-

шана. Забыўшыся, ён надзеў балахон, так, як-бы збіраючыся стаць за работу. Адале агледзеўся і таропка скінуў яго.

Ён падышоў да постаці і схапіў за край прасцірадла. Рука яго трэслася. Адале ён рэзкім махам рвануў яго, і прасцірадла апала.

Спадарожнік убачыў перад сабою жанчыну. Ён ніколі не бачыў яшчэ такое харошае постаці. Жанчына збіралася купацца і на сонцы распраналася. У постаці бунтавалася маладосць—буйная, урачыстая, як радасць. Яна закінула рукі за голаў, ад гэтага цела наструнілася і было тугім і напятым, як песня. Высока ўзнёсшыся, кіпелі грудзі, і ў пене сыскоў набракала смуга мацярынства, стаіўшы ў сабе, як музыку, вечна жаночую, вечна зазыўную прагу. Не, спадарожнік ніколі не бачыў такое багатае чалавечае спеласці.

— Найда! — ахрыплым голасам прагаварыў скульптар.

Ён стаяў трохі адкінуўшыся плячыма назад і таксама глядзеў, нібы бачыў яе ўпершыню. Але, ён наглядзіцца на яе сёння ўдоваль. Затое, што не смеў датыкацца дасюль. Затое, што баяўся яе, як свае смерці. Ды яна-ж такі і смерць яго. Гэта-ж ён выляпіў яе, калі пачуў першыя прыкметы трывожнае старасці. Ён выляпіў вобраз маладосці, як сімвал свае радасці. Ён хацеў каб пасля, гледзячы на яе, цешыцца, а яна пачала яшчэ горш забіваць яго. Кожны раз перад ёю ён яшчэ больш востра адчуваў сваю старасць

і паволі пачынаў пужацца яе. Гэта-ж у яго цяпер такая вялікая сіла тварыць. Такая вялікая практыка і багатая мысль. І ўсё гэта рыне таму, што знасілася цела. А перад ім от стаіць маладосць— шырокая, буйная—і яму не пачуць яе. Гледзячы на яе, ён яшчэ больш адчуваў няўхільнасць свае пагібелі, і аднойчы задушыў прасцірадлам. Ён яе ўзненавідзеў таму, што любіў, як лятунак. І от сёння гэтае-ж пачуццё пазнаў у спадарожніку. Ён таксама ненавідзеў тае, што прабегла ў бягах, бо любіў і разам з тым ведаў, што яна не ягоная ўласнасць. Яна можа ў любую хвіліну ад яго адыйсці і астацца чужым хараством. Гэта пэўна, што так. Дык няхай от хоць тут паглядзіць на яе спакайней. Ён і сам нагледзіцца на яе сёння ўдоваль.

— Найда! — зноў выхрыпеў скульптар.—У ёй уся мая радасць. Я нарадзіў яе, як вобраз свае маладосці, я аддаў ёй самога сябе. Я вылепіў і пацалаваў яе ў губы, і яны былі цёплымі. Я цалаваў у іх сваю цеплыню.

— Яна не мае сабе падабенства!—азваўся спадарожнік.

— Я вылепіў ваш век, маладая асоба,—рэзка падняў руку скульптар.—Я шукаў гэтага дзіўнага цела праз усё сваё жыццё. Я нарадзіў яго, як лятунак, а ваш век нясе яго як неадлучную частку свае бытнасці. У гэтым вялікая розніца майго і вашага часу, малады чалавек.

— Гэта толькі ў мастацтве,—працадзіў спадарожнік.—Мастацтва заўсёды было ідэалістычным.

— Для хворых. Як вы, і як я,—дакончыў скульптар.

Ён толькі цяпер выпусціў з рук прасцірадла. Яно апала на дол і стаілася. Паўзучы па падлозе, да яго, падкрадаліся зайчыкі сонца.

V

Пасля яны абодва маўчалі. Скульптар так і стаяў, забыўшыся. Спадарожнік няўважліва аглядаў іншыя работы. Па майстэрні сяды-тады чутны былі ягоныя павольныя крокі. Каля групы, што нагадвала сабою тыраназабойцаў, ён суняўся і павадзіў па ёй пальцам. На фігурах асталіся палоскі ад сцёртага пылу. Тыраназабойцы стаялі застыўшы, і аднойчы паднятыя іхныя кулакі закамянелі.

Спадарожнік адвярнуўся, на губах пакідаючы скепсіс. У майстэрні адпачываў спакой. Збоку стаяла мальберта з недакончаным эскізам. Спадарожнік пайшоў да яе, але па дарозе суняўся. Знячэўку ён зірнуў у акно і, раптам успыхнуўшы кінуўся да яго, барабанячы ў шыбу.

— Аля!—крыкнуў ён на вуліцу, з грукатам адчыняючы раму.

Чутно было, як абазваўся жаночы голас. Адале голас набліжаўся і стаў каля акна. Спадарожнік усім корпусам перагнуўся за падваконніцу. Ён з некім там гаварыў, і ягоны голас ажыўляўся запальчыва. Адале жанчына замоўкла і тады спадарожнік адышоў ад акна, і на ягоным твары

свяцілася раптоўная радасць. Неўзабаве адчыніліся дзверы і ў майстэрню шумна ўскочыла дзяўчына. Яна ўварвалася, як вясновы дураслівы вецер—адразу парушыўшы спакой і напоўніўшы яго гаворкаю, рухамі—ахапкам здаровае свежасці і звонкага смеху. Скульптараў пакой адразу загарэўся новым жыццём. Было падобна, што гэта ў яго ўлілася сама вясна—шырокая, неўгамонная, як урачыстасць. І скульптар пазнаў, што ён бачыў дзяўчыну ў бягах. Гэта-ж тая самая Найда. Гэта-ж яна, ягоная маладосць, прышла да яго жывая. І якая шырокая яе непасрэднасць.

— У вас тут цэлы музей, прафесар,—звярнулася яна да скульптара, гледзячы на майстэрню.

І, зноў-жа разліваючы па пакоі гарэзнасць, пачала аглядаць скульптуры. Здавалася, яна хацела ўвабраць у сябе адразу ўсю галерэю. Шустрая, яна таропка перабягала ад бюста да бюста, сунімаючыся толькі на хвіліну і быстра пранікаючы ў кожную дэталь. І па тым, як трапна яна рабіла заўвагі, скульптар узрушана бачыў, што ў гэтым яна разглядае яго, пазнае ягоную душу.

— А вось гэта ў скульптара ты,—паказаў спадарожнік на Найду.—Глядзі, да чаго ты харошая.

Дзяўчына падышла да фігуры, на якую паказаў спадарожнік. Скульптар таксама стаў поруч і ягоныя маршчыны зноў загарэліся. Ён прагавіта сачыў за дзяўчынаю. Ён чакаў як зараз шумна разбырзнецца гэтая стоеная радасць чужога захаплення.

— Я не хачу быць такою, — урэшце сказала дзяўчына, спакойна, яшчэ раз аглядаючы постаць.

Скульптар сумеўся.

— Прабачце, вы хоч...

— Прафесар (яна яго звала прафесарам), у вас занадта багата Напалеонаў. Вы расставілі кругом сябе старадаўнасць. Нават Найда ваша чужая, з антычнасці. Прыгожае цела, і толькі. Гэтак трактавалі жанчыну ад самага пачатку нараджэння мастацтва. А дзе-ж у ёй наша эпоха? Дзе душа новага часу? Вы жывяце аддзельна ад веку, прафесар. Вы хочаце жыць над класамі і гэтым астаецеся ззаду. Вы не бачыце сапраўднага чалавека, каторы непараўнальна багачшы за вашу мару. І ваша Найда нежывая, прафесар. Чужая. Я не хачу быць такою.

Скульптар, здавалася, чуў яшчэ гэты просты, суровы голас, але дзяўчына ўжо гаварыла пра іншае. Яна зноў аглядала майстэрню і паказвала спадарожніку на рэпрадукцыі карцін школы Давіда. Адале клікала спадарожніка пайсці разам на цікавую лекцыю прафесара Граля. Яны туды сабраліся пайсці цэлым гуртам. Спадарожнік адмаўляўся. Ён зноў апрануўся ў панурасць і зрабіўся сутулым. Гэта зноў пачынала прабівацца нянавісць. Дзяўчына мела сваю самастойную, інакшую бытнасць. Яна кіпела нейкім далёкім, яму непатрэбным жыццём. От так, на хвілінку толькі адчулася поруч, каб зноў адыйсці і астацца чужою.

— Прафесар! — аклікнула яна скульптара. — Я хачу паглядзець яшчэ вашае новае Найды. Тае, каторую вы вылепіце з буры і з росквіту нашае радасці. У каторай гарэцьме душа нашае сілы і прагнасці. Лепіце такую, прафесар.

Яна пацінула моцна скульптараву руку і вышла, такая-ж самая шустрая, звонкая, пакінуўшы за сабою шырокі пах маладосці—гарэзнае, буйнае, як патокі вяснавога шуму. Скульптар вышаў за ёю і, ужо адыходзячы, яна яму махала рукою, крычучы, што яшчэ прыдзе паглядзець новае Найды. Відно было, як яна яшчэ раз паклікала спадарожніка, але той злосна адмахнуўся плячом. Адале ён зноў доўга і захлібіста закашляў. Ён тады скорчыўся і заспяшаўся, каб дастаць хусцінку. На прыгорбленай спіне відны былі крохкія вузлы пазванкоў. Скульптар паглядзеў на яго доўгім дакорлівым зрокам.

— Вы самі атруцілі сваю маладосць.

— Пакіньце,—сярдзіта зірнуў спадарожнік.

— Плюгавец! Я бачу вашу заўчасную старасць.

Спадарожнік:—Крумкач!

Скульптар:—Даганяйце жыццё, у каторым бунтуецца радасць. Шануйце разумны сэнс свае бытнасці, малады чалавек.

— Ідзеце да д'ябла!—абарваў спадарожнік і таропка пайшоў, востра падымаючы плечы.

Дзень стаяў ціхі. Высока шклянела галубовае неба. Сонца пакошвалася на вечар, вышчэрбвалася аб рубцы камяніц і па сценах абцякала ў

рашчэрбіны вуліц. На доле раставала спякота і людзі хадзілі ў ей, топчучы дзень пад нагамі. На рагу паказаўся і знік, тонка празвінеўшы, трамвай. Дзяўчына аддалялася, і яшчэ ўсё відно было, як сяды-тады віхаецца яе галубая сукенка. Скульптар доўга глядзеў ёй услед і маршчыны ля воч, што былі сабраліся ад цёплае ўсмешкі, так і забыліся сплысці. Яму здавалася, што яна яшчэ стаіць перад ім, смяецца бляскам сажмураных зрэнак, агаляючы на смуглявым абліччы да слепкасці белыя зубы, а тады цісне руку і порстка ідзе, дробна перабіраючы мяккімі балеткамі на загарэлых, цвёрдых нагах.

Скульптар вярнуўся радасны, буйны. Майстэрня здалася яму шырокаю, поўнаю сонца і наплывам дзіўных, тонкіх пахошчаў. І ў гэтым новым, шырокім святле фігура Найды здалася не сваёю, далёкаю; яна нічога не мела агульнага з жывою Найдаю, дыханне якое яшчэ пачувалася ў кожнай драбніцы. І ён ужо бачыў, як гэты новы вобраз ён выляпіць—рэальны, невычэрпна багаты, у каторым гарэцьме душа самага шчаслівага, самага разумнага ў жыцці пакалення.

І недзе прапала, разбілася ўдрызг нядаўная мулкасць трывогі за старасць. Скульптар адчуў цяпер новы сэнс яе—каб радзіць і натхняць маладосць. Гэта-ж вялікая радасць! У гэтым ёсць свая непаўторная сіла і сваё хараство. І яна ўсё-такі прыгожая, гэтая чалавечая прагнасць да таго глыбока быць у жыцці, каб нават не ведаць, што недзе пачынаецца небыт.

Менск, лістапад—1932; сакавік—1933.

ЗМЕСТ

I

Стар.

Гордасць 5
Каця Лапянкова 12

II

Па дарозе 31
На выселках 41
Законы 56
Зноў па дарозе 68
Дбайнасць 88
Сустрэчы 102

III

Яшчэ пра гордасць 121
На выстаўцы 133
Бацькі і дзеці 137
Смерць 142
Слепата 144
Старасць 146

Рэдактар П. ГАЛАВАЧ
Тэхрэдактар АБРАМАВА

Карэктар Е. ЖЫЛІНСКАЯ
Вокладка, супервокладка і
шмуц-тытул КАРЖАНЕЎСКАГА

Здана ў друкарню 25|IV—34 г. Падпісана да друку 8|V—35 г.
Папера 72×105 1|32. Друк. арк. 6 5|8. Знакаў у друкаваным аркушы 48.000
Тыраж 3185 экз. Уп. Галоўлітбела №Б 18[illegible]1. Заказ № 1744

Друкарня «ПАЛЕСДРУК», Гомель, Совецкая, 1.

Перевірено 1948 р.

Дзяржаўная
бібліятэка
БССР
імя У. І. Леніна

Бел. аддзел
1994 г.

5 к.
п.

ке

ссии

Цана 2 р. 25 к.
Пераплёт 25 кап.

На белорусском языке
Я. Скриган
ВСТРЕЧИ
Государственное
Издательство Белоруссии
Минск—1935

60